Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

Навукова-творчы калектыў
«Беларуская школа – XXI стагоддзе»

# Сусветная гісторыя
# Гісторыя Беларусі
# Геаграфія

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя*

Выпуск трэці

Мінск
2016

УДК 37.01
ББК 74.26
С90

© Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
«Таварыства беларускай школы», 2016.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Сусветная гісторыя
## (Гісторыя Еўропы. Эпоха Сярэднявечча, V–XV стст.)

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Алег Трусаў,*
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт

# УСТУП

Праграма «Сусветная гісторыя (гісторыя Еўропы. Эпоха Сярэднявечча (V–XV стст.)» з'яўляецца часткай вывучэння курса гісторыі ў гуманітарным ліцэі з беларускай мовай навучання». Праграма падрыхтаваная кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Алегам Трусавым у межах планавай працы Навукова-творчага калектыву «Беларуская школа – XXI стагоддзе» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай школы». У вучэбным курсе сусветнай гісторыі прадугледжана сістэматызаванае вывучэнне гісторыі Еўропы ў эпоху Сярэднявечча. Тут больш падрабязна, чым у школьных праграмах для 6 і 7 класа агульнаадукацыйнай школы, разглядаецца гісторыя Еўропы, прычым не толькі Заходняй, але і Усходняй, і Паўночнай. Праграма мае тры раздзелы, прысвечаныя, адпаведна, Ранняму, Высокаму і Позняму Сярэднявеччу. У першым раздзеле асаблівая ўвага надаецца распаўсюджванню хрысціянства па ўсёй еўрапейскай тэрыторыі, з'яўленне ісламу і іўдаізму, а таксама існаванне паганства на поўначы і ўсходзе Еўропы. Асобная тэма – качэўнікі на Поўдні Еўропы: авары, хазары, булгары, а таксама рассяленне славян у V–IX стст., гісторыя балтаў і фіна-ўгорскіх плямёнаў. Таксама разгледжана стварэнне шляху «з варагаў у грэкі» і роля беларускіх земляў у гэтым працэсе.

Другі раздзел прысвечаны далейшаму пашырэнню хрысціянства і канчатковы падзел на каталіцызм і праваслаўную царкву. Асобная тэма – крыжовыя паходы і знаёмства з арабскай цывілізацыяй. Разгледжаны дзяржавы хазараў, Волжская Булгарыя, качавыя плямёны паўднёвай Еўропы, печанегі і палаўцы (куманы) і прыход мадзьяраў у цэнтр Еўропы. Згадва-

юцца ўсходнеславянскія дзяржаўныя ўтварэнні XII–XIII стст., якія склаліся пасля распаду Кіеўскай Русі. Асобная тэма – узнікненне ў Еўропе такіх дзяржаў, як Тэўтонскі ордэн і ВКЛ, заваяванне часткі Еўропы мангола-татарамі і стварэнне імі Залатой Арды.

Трэці раздзел прысвечаны новым гістарычным выклікам, сярод якіх – стагадовая вайна Францыі і Англіі, з'яўленне і пашырэнне ў Еўропе Турэцкай (Асманскай Імперыі), заваяванне асманамі Візантыі і паўднёва-славянскіх дзяржаў, распад Залатой Арды, утварэнне незалежнага Вялікага княства Маскоўскага і Іспанскага каралеўства. Таксама разгледжаны такія ўсходнеславянскія ўтварэнні, як Вялікія княствы Смаленскае, Цвярское, Разанскае, Ноўгарадская і Пскоўская рэспублікі.

У выніку засваення курса «Сусветная гісторыя. Гісторыя Еўропы Сярэднявечча» навучэнцы павінны *ведаць*:
- сувязь прычын і наступстваў гістарычных падзей і працэсаў тэхнічнага прагрэсу;
- сутнасць як рэвалюцыйнага, так і эвалюцыйнага шляху развіцця тэхнічнага прагрэсу і яго ўплыў на экалогію Еўропы;
- асаблівасці развіцця гісторыі і архітэктуры розных еўрапейскіх дзяржаў, звязаныя з кліматычнымі ўмовамі і рэлігійнымі асаблівасцямі;
- ролю гісторыі духоўнай і матэрыяльнай культуры ў агульным гістарычным працэсе развіцця еўрапейскай цывілізацыі;
- асноўныя этапы стварэння беларускага этнасу і яго сувязі з цывілізацыямі сярэднявечнай Еўропы.

Навучэнцы павінны *ўмець*:
- лакалізоўваць падзеі гісторыі ў часавых прамежках і прасторы;

– суадносіць працэсы, з’явы і падзеі сусветнай гісторыі з набытымі ведамі па гісторыі Беларусі і аргументавана тлумачыць характар гэтага суаднясення;
– сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты і на падставе гэтага рабіць аргументаваныя высновы;
– даваць разгорнутую характарыстыку дзейнасці палітычных, дзяржаўных дзеячаў, а таксама дзеячаў культуры адпаведных эпох;
– аргументавана выказваць свой пункт погляду на тыя ці іншыя гістарычныя працэсы або падзеі;
– эфектыўна шукаць неабходную гістарычную інфармацыю ў разнастайных крыніцах;
– рыхтаваць рэфераты, даклады, прэзентацыі па тэматыцы, прапанаванай выкладчыкам або выбранай самастойна ў межах праграмы курса.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ ДА ЎСЯГО ВУЧЭБНАГА КУРСА

1. Всемирная история: в 3-х ч. / О. А. Яновский, О. В. Бригадина, П. А. Шупляк. – Мн.: ООО «Юнипресс», 2002. – Ч. 1: С древнейших времён до конца XVIII в. – 601 с.
2. Гісторыя сярэдніх вякоў. Заходняя Еўропа і Візантыя: Вучэбны дапам. У 2-х ч. / В. А. Фядосік, І. А. Еўтухоў, А. А. Прохараў, А. Дз. Смірнова; (Пад рэд. В. А. Фядосіка, І. А. Еўтухова). Частка 1. – Мн.: БДУ. 2002. – 353 с. Частка 2. – Мн.: БДУ. 2003. – 269 с.
3. *Дубянецкі, Э.* Сусветная культура: ад старажытнасці да нашых дзён. – Мн.: БелЭн, 2001. – 240 с., іл.
4. История Европы / Альдебер, Ж., Бендер, Й., Груша, И. и др. Пер. с фр., науч. ред. и предисл. В. С. Кошелева. – Мн.: Выш. школа – Москва: Просвещение, 1996. – 384 с., ил.
5. История средних веков / под ред. Ф. Н. Колесницкого. – Москва: Просвещение, 1986. – 575 с., ил.

6. История средних веков: в 2 т.: учебник / под ред. С. П. Карпова. – 2-е изд. – Москва: Изд-во МГУ; ИНФРА-М, 2000. – Т. 1: Раннее и Высокое средневековье. – 640 с.
7. *Ле Гофф, Ж.* Рождение Европы / Пер. с фр. Предисл. А. О. Чубарьяна. – С.-Петербург: Александрия, 2008. – 398 с.
8. *Ле Гофф, Ж.* Цивилизация средневекового Запада. / Пер. с фр. Общ. ред. Ю. Л. Бессмертного. Послесл. А. Я. Гуревича. – Москва Прогресс, 1992. – 376 с.
9. *Нефедов, С. А.* История средних веков. – Москва: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1996. – 363 с.
10. *Смирнова, Е. Д. и др.* Средневековый мир в терминах, именах и названиях: словарь-справочник. – Мн.: Беларусь, 1999. – 383 с.
11. Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: Вучэбны дапам. для вучняў 10-га кл. / У. С. Кошалёў, В. І. Ханкевіч, Г. В. Даўгяла і інш. – Мн.: Нар. асвета, 1994. – 350 с.
12. Сусветная гісторыя: са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Падручнік для 10-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання / У. С. Кошалеў, Г. І. Даўгяла, А. В. Перзашкевіч і інш. Пад рэд. У. С. Кошалева. 2-е выд. – Мн.: Нар. асвета, 2002. – 398 с., іл.
13. Historia. Encyklopedia szkolna WsiP / Praca zbiorowa. – Warszawa: Wydawnictwa Szkolne i Pedagogiczne, 2004. – 1112 s., il.
14. Manteuffel, T. Historia powszechna. Średniowiecze. – Warszawa: Wydawnictwo PWN, 2012. – 514 s.
15. Śladami przeszłości: Podręcznik do historii dla gimnazjum. / Pod red. St. Roszaka. Cz. 1. – Warszawa: Nowa Era, 2010. – 150 s.
16. Witkowski, Cz. Słownik pojęć historycznych. – Katowice: VIDEOGRAF II, 2008. – 283 s.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ
# ВУЧЭБНАГА КУРСА

## Раздзел І.
## ЕЎРОПА Ў РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ
## (V–IX СТСТ.)

### Тэма І. Народы Заходняй і Паўночнай Еўропы. Роля каталіцкай царквы

Матэрыяльная і духоўная культура народаў Заходняй Еўропы. Варварскія каралеўствы. Пахавальня Тэадорыха. Мастацтва эпохі Карла Вялікага. Сабор у Ахене. «Звярыны» стыль у мастацтве. Першыя скрыпторыі. Росквіт рукапіснай кнігі. Уплыў каталіцкай царквы.

Матэрыяльная і духоўная культура народаў Скандынавіі. Нарманы, варагі і вікінгі, іх матэрыяльная культура. Узбраенне, флот і ювелірнае мастацтва. Адкрыццё вікінгамі Новага Свету. Стварэнне шляху «з варагаў у грэкі». Плямёны балтаў і фіна-ўграў. Габрэі і іх рассяленне ў Еўропе. Складванне феадальных адносін.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Абат*** – кіраўнік каталіцкага кляштара (манастыра).

***Архіепіскап*** – галоўны епіскап, які ўзначальваў царкоўную акругу.

***Асабістая залежнасць*** – страта чалавекам асабістай свабоды і пераход у падпарадкаванне іншаму чалавеку.

***Базіліка*** (ад грэч. Basilike – царскі дом) – тып антычнага, потым сярэднявечнага будынка, прамавугольнага ў плане, падзеленага ўздоўж шэрагамі калонаў на некалькі (звычайна – 3, радзей – 5) частак (так званых караблёў або нефаў). Сярэдні неф, завершаны апсідай, вышэйшы і шырэйшы за бакавыя.

***Догмат*** – асноўнае палажэнне рэлігійнага веравучэння, якое лічыцца вечным і нязменным.

***Дынастыя*** – каралі, прадстаўнікі аднаго і таго ж роду, якія змяняюць адзін аднаго на прастоле паводле права спадчыны.

***Евангелле (Дабравесце)*** – свяшчэнная кніга, у якой апісваецца зямное жыццё Ісуса Хрыста і выказаны асноўныя палажэнні хрысціянства.

***Епіскап*** – галава царкоўнай акругі.

***Ерэтык*** – чалавек, які не пагаджаецца з вучэннем царквы.

***Замак*** – умацаванне, пабудаванае на непрыступных скалах, узгорках ці астравах, месца жыхарства феадалаў.

***Конунг*** – ваенны правадыр у скандынаўскіх народаў.

***Кароль*** – уладар каралеўства, каралеўскі тытул быў другім па значнасці пасля імператарскага.

***Натуральная гаспадарка*** – гаспадарка, у якой выраблялася амаль усё, патрэбнае для жыцця, і спажывалася амаль усё, што выраблялася.

***Папа рымскі*** – галава каталіцкай царквы.

***Рабін*** – духоўны кіраўнік вернікаў у габрэйскай рэлігійнай грамадзе.

***Сінагога*** – габрэйскі малітоўны дом.

***Скрыпторый*** – месца, дзе перапісваліся рознага зместу кнігі.

***Талмуд*** – збор рэлігійных, бытавых, прававых прадпісанняў іудзейства, заснаваны на адпаведным тлумачэнні кніг Старога Запавету.

***Феадал*** – уладальнік феода.

***Феадальная залежнасць*** – залежнасць, пры якой сяляне і іх дзеці прымацаваны да надзелу і павінны выконваць паншчыну і выплачваць аброк.

***Феод*** – надзел зямлі, які даваўся за выкананне службы, у асноўным ваеннай.

***Шэрыф*** – каралеўскі намеснік у Англіі.

***Эпас*** – літаратурны твор, у якім мастацкімі сродкамі адлюстроўваюцца як правіла пераломныя моманты ў гісторыі народаў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***476 г.*** – Звяржэнне Ромула Аўгуста Адаакрам. Фармальны канец Заходняй Рымскай імперыі

***481–511 гг.*** – Праўленне Хлодвіга, правадыра і караля франкаў.

***493–526 гг.*** – Праўленне Тэадорыха Вялікага, остгоцкага караля.

***493–555 гг.*** – Каралеўства остготаў у Італіі.

***VI ст.*** – «Салічная праўда» (Франкская дзяржава).

***Каля 500 г.*** – Прыняцце франкамі хрысціянства пры Хлодвігу.

***Каля 500 г.*** – «Эдыкт Тэадорыха» (Остгоцкае каралеўства).

***568–774 гг.*** – Каралеўства лангабардаў у Італіі.

***585 г.*** – заваяванне вестготамі Свеўскага каралеўства.

***590–604 гг.*** – Пантыфікат папы Грыгорыя I Вялікага.

***597 г.*** – Першая рымска-каталіцкая місія ў Брытаніі.

***675–754 гг.*** – Св. Баніфацый.

***VIII ст.*** – Стварэнне англасаксонскай эпічнай паэмы «Беавульф» (запісана каля 1000 г.).

***715–741 гг.*** – Праўленне Карла Мартэла, франкскага маярдома.

***741–768 гг.*** – Праўленне Піпіна Кароткага, маярдома (з 751 г. – кароль Франкскай дзяржавы).

***751–843 гг.*** – Праўленне дынастыі Каралінгаў у адзінай Франкскай дзяржаве.

***756 г.*** – Утварэнне свецкай дзяржавы рымскіх пап.

***768–814 гг.*** – Праўленне Карла Вялікага.
***774 г.*** – Франкскае заваяванне каралеўства лангабардаў.
***793 г.*** – Першы напад вікінгаў на Брытанскія астравы.
***800 г.*** – Каранаванне Карла Вялікага імператарскай каронай. Аб’яднанне англасаксонскіх дзяржаў у адзінае каралеўства Англію.
***843 г.*** – Падзел імперыі франкаў, пачатак фарміравання каралеўстваў Францыі, Германіі, Італіі
***858–867 гг.*** – Пантыфікат папы Мікалая I.
***865–896 гг.*** – «Вялікая армія» вікінгаў.
***871–899 гг.*** – Праўленне Альфрэда Вялікага, караля Уэсекса.
***872–900 гг.*** – Аб’яднанне нарвежскіх зямель пад уладай Харальда I Прыгожавалосага.
***874 г.*** – Пачатак каланізацыі Ісландыі.
***IX ст.*** – Узнікненне паэзіі скальдаў.
***IX–XIII ст.*** – Стварэнне скандынаўскай «Эды».
***IX ст.*** – З’яўленне першых замкаў у Еўропе.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Калі германскія плямёны пасяліліся на тэрыторыі Заходняй Рымскай імперыі?
2. Якія германскія плямёны стваралі свае дзяржавы (каралеўствы)?
3. Што Вы ведаеце пра дзяржаву франкаў?
4. Дайце вызначэнне «Каралінгскаму адраджэнню».
5. Як хрысціянства распаўсюдзілася ў Заходняй Еўропе?
6. Калі рымскія папы стварылі ўласную дзяржаву?
7. Раскажыце пра структуру хрысціянскай царквы ў Заходняй Еўропе.
8. Калі нарманы сталі пагрозай для хрысціянскай Еўропы? Якія тэрыторыі яны заваявалі?

9. Што Вы ведаеце пра «шлях варагаў у грэкі»?

10. Якія плямёны жылі на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў перыяд ранняга Сярэднявечча? Што Вы ведаеце пра балцкія і фіна-ўгорскія плямёны?

11. Калі на тэрыторыі Еўропы з'явіліся габрэі і як яны рассяляліся на яе тэрыторыі?

12. Як у Еўропе склаліся феадальныя адносіны?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Дубновъ, С.* М. (сост.) Учебникъ Еврейской исторіи для школы и самообразованія. – С.-Петербургъ: Типографія т-ва «Общественная Польза», 1912. – 159 с.
2. *Качановский, В. В.* История культуры Западной Европы. – Мн.: Экоперспектива, 1998. – 190 с.
3. *Мартынов, А. И.* Археология: Учебник. – 4-е изд., испр. и доп. – Москва: Высш. шк., 2000. – 439 с., ил.
4. *Фэйган, Браян М.* Уводзіны ў археалогію. / Пер. з англ. – Мн.: БФС, 1996. –272 с. («Адкрытае грамадства»).
5. *Janicka, I.* Poznać przeszłość. Rządzący i rządzeni. – Warszawa: Nowa Era, 2015. – S. 24 –34.

## Тэма II. Візантыйская цывілізацыя

Стварэнне Візантыйскай дзяржавы. Уплыў на матэрыяльную культуру Італіі. Горад і сельскія паселішчы. Інтэр’ер і мэбля. Візантыйскі ваенны і гандлёвы флот. Сафійскі сабор у Канстанцінопалі. Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру. Візантыйская фрэска, мазаіка і абразы. Касцюм візантыйцаў. Рэчы свецкага і царкоўнага прызначэння. Паліваная кераміка. Вырабы са шкла.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Апсіда, абсіда*** (ад грэч. Hapsidos – скляпенне) – паўкруглая, прамавугольная альбо гранёная частка бажніцы, якая выступае за межы сцяны і мае ўласнае перакрыццё. У апсідзе знаходзяцца алтар, клір, месцы для вышэйшых духоўных і свецкіх асобаў, культавыя рэліквіі ды інш.

***Ікона (абраз)*** – рэльефная або жывапісная выява багоў ці святых, якая служыць прадметам рэлігійнага пакланення.

***Крыжова-купальная сістэма*** – архітэктурная сістэма (кампазіцыя), у якой да падкупальнай прасторы ў цэнтры храма звернутыя цыліндрычныя скляпенні галін крыжа, якія ў цэлым ствараюць крыжападобную структуру.

***Літургія*** – набажэнства, у якім выкладаецца сутнасць асноўных ідэй хрысціянскага светапогляду.

***Мазаіка*** – від жывапісу з выкарыстаннем каляровых камянёў, эмаляў і інш.

***Манархія*** – асабістая ўлада аднаго чалавека (караля, халіфа, султана, шаха) у краіне; звычайна перадаецца ў спадчыну.

***Манастыр (кляштар)*** – комплекс збудаванняў, дзе жыве абшчына манахаў.

***Сабор*** – 1) галоўны храм горада; 2) з’езд вышэйшага духавенства для вырашэння найбольш важных спраў дзейнасці царквы.

***Фрэска*** – каляровы малюнак, карціна, выкананыя на свежай тынкоўцы.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***527–565 гг.*** – Юстыніян І, візантыйскі імператар.

***528–534 гг.*** – Складанне «Збору грамадзянскага права» пры Юсцініяне І.

***532 г.*** – Паўстанне Ніка ў Канстанцінопалі.

***532–537 гг.*** – Будаўніцтва храма св. Сафіі ў Канстанцінопалі.

***534–554 гг.*** – Остгоцка-візантыйская вайна.

***582–602 гг.*** – Праўленне Маўрыкія, візантыйскага імператара.

***602–610 гг.*** – Праўленне Фокі, візантыйскага імператара.

***610–641 гг.*** – Праўленне Іраклія, візантыйскага імпесратара.

***634 г.*** – Пачатак арабскай экспансіі на візантыйскія землі.

***717–741 гг.*** – Праўленне Льва ІІІ Ісаўра, візантыйскага імператара.

***726 г.*** – Узвядзенне іканаборства ў ранг афіцыйнай рэлігійнай палітыкі Візантыі.

***717–802 гг.*** – Праўленне Ісаўрыйскай дынастыі ў Візантыі.

***787 г.*** – Кананічнае асуджэнне іканаборства Сёмым Усяленскім саборам.

***Канец VIII ст. – каля 869 г.*** – Леў Матэматык.

***855 г.*** – Адкрыццё Магнаўрскай вышэйшай школы ў Канстанцінопалі.

***867–1056 гг.*** – Праўленне Македонскай дынастыі ў Візантыі.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Як узнікла Візантыйская імперыя?
2. Чаму Візантыю называюць цэнтрам культуры?
3. Як сфармавалася праваслаўная царква?
4. Што зрабіў для Візантыі імператар Юстыніян?
5. На аснове тэксту і ілюстрацый апішыце храм святой Сафіі.
6. Якім было жыццё жыхароў краіны?
7. Чаму візантыйцы здолелі спыніць наступ арабаў?
8. Што такое «грэчаскі агонь»?
9. Апішыце такую з'яву як іканаборства.
10. Раскажыце пра сістэму адукацыі ў Візантыі.
11. Што зрабіла для краіны Македонская дынастыя?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Кулаковский, Ю. А.* История Византии. В 3-х т. – 3-е изд., исправ. И доп. – С.-Петербург: Алетейя, 1996–2003. – 1310 с. (Византийская библиотека. Исследования).
2. Культура Византии. Вторая половина VII–XII в. – Москва: Наука, 1989. – 679 с.
3. *Лазука, Б. А.* Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад стараж. часоў па XVI стагоддзе. – Мінск: Беларусь, 2010. – 311 с., іл.
4. *Оустерхаут, Роберт.* Византийские строители. / Пер., ред. и коммент.: Л. А. Беляев, Г. Ю. Ивакин. – Киев – Москва: «КОРВИН ПРЕСС», 2005. – 332 с.
5. *Смирнова, В. В.* Иран. Византия. Арабский Халифат. – Москва: Айрис-пресс, 2004. – 112 с., ил. – (Мировая художественная культура).
6. *Удальцова, З. В.* Византийская культура. / Отв. ред. Е. В. Гутнова. – Москва: Наука, 1998. – 288 с., ил.

## Тэма III. Арабская цывілізацыя

Арабскія плямёны ў VI–VII ст. Уплыў ісламу на матэрыяльную культуру. Арабскія гарады: Мекка, Дамаск і Багдад. Шыіты і суніты. Культавыя і жылыя будынкі. Арабескі. Вынаходствы ў галіне медыцыны (спірт, акуляры). Апрацоўка металу (срэбра і дамаская сталь) і шкла. Уплыў арабскай цывілізацыі на еўрапейскую культуру.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Джыхад*** – свяшчэнная вайна за веру (іслам).
***Каран*** – свяшчэнная кніга мусульман.
***Кааба*** – храм у г. Мекка, галоўная святыня ісламу.
***Мінарэт*** – вежа каля мячэці, з якой спецыяльны служыцель пяць разоў у дзень заклікае вернікаў да малітвы.
***Мячэць*** – мусульманскі храм.
***Рэканкіста*** – адваяванне карэнным насельніцтвам Пірэнейскага паўвострава, зямель, захопленых у пачатку VIII ст. арабамі.
***Сунна*** – збор правілаў паводзінаў і звычаяў старажытных арабаў.
***Хадж*** – паломніцтва ў Мекку.
***Халіф*** – «намеснік прарока», правіцель мусульманскай дзяржавы (халіфата) і духоўны ўладыка мусульман.
***Хіджра*** – перасяленне Мухамеда і яго першых прыхільнікаў з Меккі ў Медыну ў 622 г. Ад гэтай падзеі мусульмане вядуць адлік гадоў сваёй эры.
***Шарыят*** – збор законаў, складзеных на аснове Карану і Сунны.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Пачатак VII ст.*** – Узнікненне ісламу.
***30-я гг. VII ст.*** – Утварэнне Арабскага халіфата.
***711–714 гг.*** – Арабскае заваяванне Пірэнейскага паўвострава.
***718 г.*** – Бітва ў даліне Кавадонга: пачатак Рэканкісты.
***718 г.*** – Утварэнне каралеўства Астурыя.
***732 г.*** – Перамога франкаў над арабамі пры Пуацье.

***866–910 гг.*** – Праўленне Альфонса III, караля Астурыі.
***IX ст.*** – Паўстанне Бабека ў Паўднёвым Азербайджане.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Пералічыце асноўныя гаспадарчыя заняткі арабаў.
2. Якім чынам арабскія плямёны аб’ядналіся ў адзіную дзяржаву?
3. Раскажыце пра біяграфію і ролю Мухамеда ў стварэнні ісламу і арабскай дзяржавы.
4. Раскажыце пра Каран і Сунну.
5. Назавіце адметныя і падобныя рысы хрысціянства і ісламу.
6. У чым заключаецца ідэя джыхаду?
7. Якую ролю адыграла арабская мова і іслам у развіцці культуры халіфату?
8. Якую ролю ў дзяржаве выконваў халіф?
9. Чаму арабы здолелі вельмі хутка заваяваць вялікую тэрыторыю?
10. Раскажыце пра арабскую архітэктуру і мастацтва.
11. Чаму і калі распаўся арабскі халіфат?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Дубнов, С. М.* Краткая история евреев. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – 576 с.
2. *Лэн-Пуль, Ст.* Мусульманские династии. / Пер. с англ. С примеч. и доп. В. В. Бартольда – Москва: ИФ «Вост. Лит.» РАН – ИГ «Муравей», 2004–311 с.
3. *Пирен, А.* Империя Карла Великого и Арабский Халифат. / Пер. с франц. – Москва: Центрполиграф, 2011. – 352 с.
4. *Смирнова, В. В.* Иран. Византия. Арабский Халифат. – Москва: Айрис-пресс, 2004. – 112 с., ил. – (Мировая художественная культура).

## Тэма IV. Славяне і качэўнікі паўднёвай Еўропы

З'яўленне славян на палітычнай карце Еўропы. Кантакты славян з Візантыяй. Сумесныя набегі на Візантыю славян і балгар. З'яўленне ў Еўропе авараў у сярэдзіне VI ст. Стварэнне Балгарскага царства. Рассяленне славян у VII–VIII стст. Матэрыяльная культура ўсходнеславянскіх плямён (крывічы, дрыгавічы, вяцічы, драўляне, радзімічы, паляне). Ганчарства. Кавальства і ювелірная справа. Кантакты з аварамі, хазарамі і варагамі. Адзенне, пахавальны абрад, асноўныя этнічныя прыкметы. Славянскія капішчы, гарадзішчы і селішчы, водны транспарт.

Заходнія славяне ў VIII–IX стст. Палабскія славяне і іх заваяванне немцамі. Узнікненне Польскай дзяржавы. Уплыў хрысціянства на матэрыяльную культуру.

Дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Вялікая Маравія у IX ст. Хазарскі каганат. Узнікненне Кіеўскай Русі. Помнікі гісторыі і культуры Кіеўскай Русі. Язычніцкія (паганскія) храмы і язычніцкая міфалогія.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Авары (обры)*** – саюз качавых мангола- і цюркамоўных плямёнаў.

***Быліна*** – народны эпічны твор (песня) ва ўсходніх славян аб найважнейшых падзеях і асобах іх гісторыі.

***Вешчуны*** – язычніцкія жрацы ва ўсходніх славян.

***Капішча*** – язычніцкае свяцілішча ў славянаў.

***Палюддзе*** – аб'езд князем і яго дружынай падуладных тэрыторый і плямён Кіеўскай Русі дзеля збору даніны.

***Протабалгары*** – цюркскія качавыя плямёны, якія прыйшлі з Волгі на Балканы ў VII ст.

***Хазары*** – напалову качавы народ, які ў VII ст. стварыў сваю дзяржаву Хазарскі каганат.
***Хан*** – кіраўнік першай балгарскай дзяржавы.
***Язычнік (паганец)***– чалавек, які верыць у мноства багоў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***568*** г. – стварэнне Аварскага каганата.
***681 г.*** – Утварэнне Першага Балгарскага царства.
***791–803 гг.*** – Вайна авараў з франкамі.
***VII ст.*** – Стварэнне Хазарскага каганата.
***820–885 гг.*** – Св. Мяфодзій.
***827–869 гг.*** – Св. Кірыл.
***830–906 гг.*** – Вялікамараўская дзяржава.
***864 г.*** – Прыняцце балгарамі хрысціянства.
***Сярэдзіна IX ст.*** – Стварэнне славянскай азбукі Кірылам і Мяфодзіем.
***Сярэдзіна IX ст.*** – Фарміраванне дзяржаўных утварэнняў вакол Ноўгарада і Кіева.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Дзе жылі славяне ў V–VI ст.? Калі быў створаны аварскі каганат?
2. Хто такія авары і хазары?
3. Раскажыце пра кантакты славян і протабалгараў і іх сумесны напад на Візантыю.
4. На якія групы падзяліліся славяне ў VII–VIII стст.?
5. Калі ўтварылася Першае Балгарскае царства?
6. Хто такія Кірыл і Мяфодзій? У чым значэнне іх дзейнасці?
7. Раскажыце пра ўтварэнне і гісторыю Вялікай Маравіі.
8. Раскажыце пра кантакты ўсходніх славян і варагаў.
9. Па якіх рэках праходзіў «шлях з варагаў у грэкі»?

10. Раскажыце пра вераванні славян да прыняцця хрысціянства.

11. Якую ролю адыгралі варагі ў стварэнні Кіеўскай Русі?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Гимбутас, М.* Славяне. Сыны Перуна / Пер. с англ. Ф. С. Капицы. – Москва: Центрполиграф. 2003. – 216 с.
2. *Мартынов, А. И.* Археология: Учебник – 4-е изд. испр. и доп. – Москва: Высш. шк., 2000. – 439 с., іл.
3. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і народа X–XXI стст. / Уклад. М. Семаковіч. – Варшава: Demart, 2005. – 321 с.
4. *Платонов, С. Ф.* Учебник русской истории. – С.-Петербург: Наука, 1994. – 429 с.
5. *Рыбаков, Б. А.* Язычество Древней Руси. – Москва: Наука, 1988. – 783 с.

# Раздзел II.
# ВЫСОКАЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА (X–XIII СТСТ.)

## Тэма V. Сярэднявечны горад. Росквіт гарадскога самакіравання

Заняпад гарадоў Заходняй Еўропы ў V–VII ст. Рэзідэнцыі Каралінгаў VIII–IX стст. Роля каталіцкай царквы ў адраджэнні заходнееўрапейскіх гарадоў. Горадабудаўніцтва ў IX ст. Гарады-«бургі». Феадальная ўрбанізацыя Заходняй Еўропы X–XIII стст. «Камунальны рух». Знешні выгляд і насельніцтва гарадоў. Усходнеславянскі горад. Гарады Візантыі.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бургамістр*** – выбарная асоба, якая ўзначальвала мясцовае самакіраванне ў сярэдневяковых гарадах, дзе дзейнічала магдэбургскае права. У феадальных гарадах Беларусі ўжывалася назва «бурмістр».

***Веча (гарадское)*** – агульны сход жыхароў усходнеславянскага горада, на якім вырашаліся дзяржаўныя і грамадскія справы.

***Гарадская (месцкая) рада*** – орган гарадскога самакіравання.

***Гільдыя*** – аб'яднанне гарадскіх купцоў.

***Горад (град, места)*** – умацаванне паселішча з пастаянным гандлёва-рамесным насельніцтвам, цэнтр рэлігійнага жыцця.

***Замак*** – умацаванне, пабудаванае як у горадзе, так і ў вясковай мясцовасці, месца жыцця феадалаў.

***Камуна*** – у сярэдневяковай Заходняй Еўропе гарадская абшчына, якая дамаглася правоў самакіравання.

***Магістрат*** – орган гарадскога самакіравання ў гарадах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, а таксама на тэрыторыі Беларусі.

***Магдэбургскае (майдэборскае) права*** – феадальнае гарадское права. Склалася ў г. Магдэбургу ў XII–XIII стст.

***Ратуша*** – будынак, дзе знаходзіўся магістрат.

***Цэх*** – аб'яднанне гарадскіх рамеснікаў адной прафесіі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***756 г.*** – Рым – сталіца Папскай вобласці, царкоўна-палітычны цэнтр Заходняй Еўропы.

***805 г.*** – заснаваны г. Магдэбург. З 968 г. – цэнтр Магдэбургскага архіепіскапства.

***862 г.*** – першая згадка ў пісьмовых крыніцах пра г. Полацк.

***996 г.*** – першае ўпамінанне г. Кракава арабскім падарожнікам Ібрагімам ібн-Якубам.

***1067 г.*** – першая згадка ў пісьмовых крыніцах Мінска (Менска).

***1147 г.*** – першае згадванне ў летапісе г. Масквы.

***1201 г.*** – першая згадка г. Рыгі як горада і галоўнага апірышча нямецкай каланізацыі ў Прыбалтыцы.

***1230 г.*** – узнікненне з двух паселішчаў горада Берліна.

***1323 г.*** – першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах пра г. Вільню. Вільня – сталіца ВКЛ.

***1387 г.*** – атрыманне Вільняй Магдэбургскага права.

***1453 г.*** – захоп туркамі-асманамі Канстанцінопаля.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Дайце характарыстыку заходнееўрапейскіх гарадоў V–IX стст.

2. Якую ролю ў развіцці заходнееўрапейскай хрысціянскай цывілізацыі адыграў г. Рым?

3. Калі заходнееўрапейскія гарады атрымалі гарадскія ўмацаванні? З чым гэта звязана?

4. Што такое феадальная ўрбанізацыя? У чым яе прычыны?

5. Раскажыце пра сталіцу Візантыі горад Канстанцінопаль.

6. Калі ўзніклі гарады ў заходніх і ўсходніх славян? Раскажыце пра іх планіроўку і забудову.

7. Раскажыце пра камунальны рух у Еўропе.

8. У чым сутнасць магдэбургскага права?

9. Якое месца ў эпоху Сярэднявечча займаў горад у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай структуры феадальнага грамадства?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.
2. *Шыбека, З. В.* Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет (курс лекцый) . – Вільня: ЕГУ, 2009. – 372 с.
3. *Ястрембицкая, А. Л.* Западная Европа XI–XIII веков. – Москва: Искусство, 1978. – 176 с.
4. *Janicka, I.* Poznać przeszłość. Rządzący i rządzeni. – Warszawa: Nowa Era, 2015. – S. 35 –40.

## Тэма VI. Працяг хрысціянізацыі Еўропы

Царкоўны раскол. Крыжовыя паходы. Роля каталіцкай царквы ў адукацыі і асвеце. Першыя скрыпторыі. Росквіт рукапіснай кнігі. Манастырскія і епіскапскія школы. Вялікая Маравія ў IX–X стст. Дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Царкоўны раскол 1054 г. Прычыны крыжацкіх паходаў. Габрэйскія пагромы. Узбраенне крыжакоў і мусульман. Роля Візантыі ў крыжацкіх паходах. Захоп Канстанцінопаля. Лацінская імперыя. Іерусалімскае каралеўства. Уплыў арабскай культуры на матэрыяльную культуру еўрапейцаў (сельская гаспадарка, архітэктура, медыцына і адукацыя). Манаскія ордэны каталіцкай царквы. XIII ст. – вяршыня палітычнай магутнасці каталіцызму. Рух альбігойцаў (катарызм). Стварэнне інквізіцыі.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Абат*** – кіраўнік каталіцкага кляштара.

***Альбігойцы (катары)*** – ерэтычны рух XII–XIII стст. у Францыі, накіраваны супраць каталіцкай царквы.

***Дзесяціна*** – дзясятая частка ўраджаю альбо іншых прыбыткаў, якія вернікі аддаюць на ўтрыманне царквы.

***Індульгенцыя*** – спецыяльная царкоўная грамата аб дараванні грахоў, якую можна было набыць.

***Інквізіцыя*** – спецыяльны суд каталіцкай царквы над людзьмі, якія выступалі супраць царквы і веры.

***Кляштар*** – каталіцкі манастыр.

***Манастыр*** – комплекс збудаванняў, дзе стала жылі і працавалі манахі.

***Мітрапаліт*** – кіраўнік царкоўнай акругі-мітраполіі, якога прызначаў іерарх.

***Патрыярх*** – галава (памеснай) Праваслаўнай царквы.

***Ордэн манаскі*** – аб’яднанне каталіцкіх манахаў, якія жывуць і дзейнічаюць у адпаведнасці з правіламі, якія запісаны ў статуце свайго аб’яднання.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***966 г.*** – кіраўнік Польшчы Мешка І прыняў хрысціянства.
***988 г.*** – Хрышчэнне князем Уладзімірам жыхароў Кіева.
***1054 г.*** – канчатковы падзел хрысціян Еўропы на католікаў і праваслаўных.
***1096–1099 гг.*** – Першы крыжовы паход.
***1099 г.*** – захоп крыжакамі Іерусаліма.
***1098–1216 гг.*** – праўленне папы Інакенція ІІІ.
***1204 г.*** – захоп крыжакамі Канстанцінопаля.
***1291 г.*** – мусульмане захапілі апошнюю крыжацкую крэпасць у Палесціне.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Раскажыце пра дзейнасць каталіцкай царквы ў галіне адукацыі.
2. Што такое скрыпторый?
3. Якія прычыны царкоўнага расколу?
4. Раскажыце пра прычыны крыжацкіх паходаў.
5. Што Вы ведаеце пра Лацінскую імперыю і Іерусалімскае каралеўства?
6. Які ўплыў аказала арабская культура на культуру краін Заходняй Еўропы?
7. Якія манаскія ордэны былі створаны падчас крыжацкіх паходаў?
8. Якую ролю ў дзейнасці каталіцкай царквы адыграў дамініканскі ордэн?
9. Раскажыце пра дзейнасць інквізіцыі ў Еўропе.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.
2. *Заборов, М. А.* Крестоносцы на Востоке. – Москва: Главная редакция вост. лит. изд. «Наука», 1980. – 320 с., ил.
3. Żabicka, R. Słownik wydarzeń historycznych. – Wrocław: ASTRUM, 2007. – S. 37–65.

## Тэма VII. Краіны Заходняй Еўропы ў X–XIII стст.

Заходнееўрапейскае грамадства ў X–XIII стст. Фарміраванне феадальнай іерархіі. Феадальная залежнасць сялянства. Сацыяльная структура феадальнага грамадства. Францыя ў IX–XIII ст. Асноўныя французскія дамены. Росквіт Германіі ў X–XI ст. Феадальная раздробленасць краіны ў XII–XIII стст. Гарады-дзяржавы Італіі. Нармандскае заваяванне Англіі. Стварэнне Свяшчэннай Рымскай Імперыі. Стварэнне саслоўна-прадстаўнічых манархій.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Аброк*** – плата сялян за карыстанне зямельнымі надзеламі прадуктамі сваёй гаспадаркі або грашыма.

***Алод*** – зямельны надзел, выдзелены феадалам у поўнае распараджэнне сялянскай сям’і.

***Бенефіцый*** – зямельнае падараванне караля сваім дружыннікам, а потым рыцарам за пастаянную вайсковую службу.

***Бюргер*** – свабодны жыхар заходнееўрапейскага горада.

***Васал*** – феадал, які атрымліваў феод ад сеньёра.

***Генеральныя штаты*** – орган саслоўнага прадстаўніцтва ў Францыі.

***Граф*** – кіраўнік графства (адміністрацыйнай адзінкі), прызначаны каралём пры ўмове асобнай прысягі. Пасада графа магла перадавацца ў спадчыну.

***Дамен*** – уладанне буйнога феадала, якое перадавалася ў спадчыну.

***Дафін*** – спадчыннік французскага прастола.

***Дынастыя*** – каралі, альбо князі, прадстаўнікі аднаго і таго ж

роду, якія змяняюць адзін другога на прастоле паводле права спадчыны.

***Картэсы*** – орган саслоўнага прадстаўніцтва ў каралеўствах Пірэнейскага паўвострава.

***Паншчына*** – адпрацоўка сялянамі пэўнай колькасці дзён на панскіх (феадальных) палях за права карыстання сваім зямельным надзелам.

***Парламент*** – орган саслоўнага прадстаўніцтва ў Англіі.

***Саслоўе (стан)*** – асобная вялікая група насельніцтва ў краіне, якая адрознівалася ад іншых наборам правоў.

***Сеньёр*** – феадал, які даваў феод свайму васалу.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***829 г.*** – аб'яднанне англасаксонскіх дзяржаў ў адзінае каралеўства Англію.

***843 г.*** – падзел імперыі франкаў, пачатак фармавання каралеўстваў Францыі, Германіі, Італіі.

***962 г.*** – стварэнне на германскіх і італьянскіх землях Свяшчэннай Рымскай імперыі.

***1066 г.*** – заваяванне Англіі Вільгельмам Нармандскім.

***1265 г.*** – першы парламент у Англіі.

***1302*** г. – першыя генеральныя штаты ў Францыі.

## КАНТРОЛЬНЫЯ
## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Сфармулюйце характэрныя рысы заходнееўрапейскага феадалізму.

2. Чым феадальна залежны селянін адрозніваўся ад раба?

3. Чаму з XI ст. феод перадаваўся ў спадчыну толькі старэйшаму сыну? Як выжывалі малодшыя сыны феадала?

4. Чаму сеньёр не мог без віны забраць феод у васала? Чаму васал прызнаваў уладу толькі свайго сеньёра і мог не выканаць загад караля?

5. Раскажыце пра нармандскае заваяванне Англіі. Чаму Англія была заваявана?

6. Раскажыце пра стварэнне і палітычную структуру Свяшчэннай Рымскай імперыі.

7. Дайце характарыстыку саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

8. Раскажыце пра гарады-дзяржавы Італіі.

9. Чаму ў часы феадальнай раздробленасці каралеўская ўлада захоўвалася, але рэальнай улады не мела?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Барлоу, Ф.* Вильгельм I и нормандское завоевание Англии. / Пер. с англ. под ред. С. В. Иванова. – С.-Петербург: Евразия, 2007. – 320 с.
2. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.
3. *Рапп*, *Ф.* Священная Римская империя германской нации. / Пер. с фр. М. В. Ковальковой. – С.-Петербург: Евразия, 2009. – 427 с.

## Тэма VIII. Краіны Паўночнай і Цэнтральнай Еўропы ў X–XIII стст.

Гісторыя народаў Скандынавіі. Нарманы, варагі і вікінгі, іх матэрыяльная культура. Узбраенне, флот і ювелірнае мастацтва. Стварэнне Паўночнай імперыі на базе Дацкага каралеўства. Дзяржаўныя ўтварэнні ў Заходняй і Паўднёвай Еўропе, створаныя нарманамі. Заходнія славяне ў X–XI стст. Палабскія славяне і заваяванне іх немцамі. Узнікненне Польскай дзяржавы. Вялікамараўская дзяржава. Прыход венграў (мадзьяраў) у Цэнтральную Еўропу. Стварэнне Венгерскага і Чэшскага каралеўстваў.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Варагі*** – славянская назва жыхароў Скандынавіі.

***«Варажскае мора»*** – Балтыйскае мора.

***Вікінгі*** – саманазва скандынаўскіх германскіх плямёнаў данаў і свіёнаў.

***Вінланд*** – «краіна дзікага вінаграду» – усходняе ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі, адкрытае вікінгамі.

***Хутары*** – асобна размешчаныя на значнай адлегласці адна ад адной сялянскія гаспадаркі.

***Шлях «з варагаў у грэкі»*** – тэрмін, якім у «Аповесці мінулых гадоў» названы гандлёвы шлях па рэках ад Балтыйскага да Чорнага мора.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***830–906 гг.*** – Вялікамараўская дзяржава.

***872–900 гг.*** – аб’яднанне нарвежскіх зямель.

***874 г.*** – пачатак каланізацыі Ісландыі.
***972 г.*** – разгром нямецкіх феадалаў польскім князем Мешкам I.
***983 г.*** – агульнае паўстанне палабскіх славянаў.
***980-я гг.*** – адкрыццё Грэнландыі і астравоў Паўночнай Амерыкі нарвежцамі і ісландцамі.
***Каля 1000 г.*** – аб’яднанне Швецыі.
***1017–1035 гг.*** – праўленне Канута Вялікага, караля Англіі, Даніі і Нарвегіі.
***1025 г.*** – каранаванне кіраўніка Польшчы Баляслава I Храбрага.
***1061–1091 гг.*** – адваяванне Сіцыліі ў арабаў нарманамі.
***1130 г.*** – утварэнне Сіцылійскага каралеўства.
***1241–1242 гг.*** – напад манголаў на Польшчу і Венгрыю.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Што Вы ведаеце пра вікінгаў? Чаму і якім чынам яны рабілі свае паходы?
2. Якія землі адкрылі вікінгі?
3. Раскажыце пра шлях «З варагаў у грэкі».
4. Што можна сказаць пра флот вікінгаў і якія краіны яны заваявалі ў Еўропе?
5. Раскажыце пра гісторыю Вялікай Маравіі.
6. Калі ўзніклі Польскае і Чэшскае каралеўства?
7. Як венгры апынуліся ў Цэнтральнай Еўропе?
8. Раскажыце пра Кракаў і Прагу ў XI–XIII стст.
9. Як адбылося заваяванне земляў палабскіх славянаў?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.

2. *Грабеньский, В.* История польского народа. / Пер. с польск. – Мн.: МФЦП, 2006. – 800 с., ил.

3. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і народа X–XXI стст. / Уклад. М. Семаковіч. – Варшава: Demart, 2005. – 321 с.

4. Żabicka, R. Słownik wydarzeń historycznych. – Wrocław: ASTRUM, 2007. – S. 37–65.

## Тэма IX. Візантыя і Паўднёвыя славяне ў X–XII ст.

Уплыў Візантыі на паўднёвых і ўсходніх славян у X–XI стст. Росквіт візантыйскіх гарадоў. Уплыў царквы на грамадскае жыццё Візантыі. Першае Балгарскае царства. Балгарскія землі пад уладай Візантыі. Другое Балгарскае царства. Утварэнне Сербскай дзяржавы. Чацвёрты крыжовы паход і Візантыя. Захоп крыжакамі Канстанцінопаля і аднаўленне Візантыйскай імперыі.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Лацінская імперыя*** – дзяржава, створаная крыжакамі на тэрыторыі Візантыі, пасля захопу імі Канстанцінопаля.

***Мазаіка*** – від жывапісу з выкарыстаннем каляровых камянёў, смальты, эмаляў і інш.

***Па́рыкі*** – балгарскія і візантыйскія залежныя сяляне.

***Смальта*** – каляровыя непразрыстыя шкляныя кубікі ці пласціны для выкладвання мазаік.

***Туркі-сельджукі*** – качавы народ, які ў XI ст. стварыў у Малой Азіі і Туркменістане вялікую дзяржаву.

***Фрэска*** – каляровы малюнак, карціна, выкананыя на свежай тынкоўцы.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1014 г.*** – разгром балгарскай арміі візантыйскім імператарам Васілём II.

***1018 г.*** – заваяванне Візантыяй Першага Балгарскага царства.

***1185–1187 гг.*** – паўстанне балгар супраць Візантыі.

***1187 г.*** – стварэнне Другога Балгарскага царства.

***60-я гады XII ст.*** – стварэнне Сербскай дзяржавы.

***1204 г.*** – захоп Канстанцінопаля крыжакамі.
***1261 г.*** – аднаўленне Візантыйскай імперыі.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. У чым асаблівасці развіцця візантыйскіх гарадоў?
2. Якую ролю адыграда царква ў гісторыі Візантыі?
3. Раскажыце пра культуру Візантыі ў X–XII ст. і яе ўплыў на культуру ўсходніх славян.
4. Якую палітыку праводзіла Першае Балгарскае царства?
5. Чаму Візантыя здолела яго заваяваць?
6. Калі і чаму ўзнікла Другое Балгарскае царства?
7. Раскажыце, як узнікла Сербская дзяржава.
8. Чаму крыжакі здолелі захапіць Канстанцінопаль?
9. Раскажыце пра існаванне Лацінскай імперыі і аднаўленне Візантыі.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.
2. *Кулаковский, Ю. А.* История Византии. В 3-х т. – 3-е изд., исправ. и доп. – С.-Петербург: Алетейя, 1996–2003. – 1310 с. (Византийская библиотека. Исследования).
3. Культура Византии. Вторая половина VII–XII в. – Москва: Наука, 1989. – 679 с.
4. *Оустерхаут, Роберт.* Византийские строители. / Пер., ред. и коммент.: Л. А. Беляев, Г. Ю. Ивакин. – Киев – Москва: «КОРВИН ПРЕСС», 2005. – 332 с.
5. *Смирнова, В. В.* Иран. Византия. Арабский Халифат. – Москва: Айрис-пресс, 2004. – 112 с., ил. – (Мировая художественная культура).

# Тэма X. Кіеўская Русь і ўсходнеславянскія княствы X – пачатку XIII стст.

Помнікі гісторыі і культуры Кіеўскай Русі. Уплывы Візантыі ў X–XI стст. Прыняцце хрысціянства і змены ў побыце. Новы пахавальны абрад. Каменная архітэктура. Ганчарства, кавальства, шкларобства і ювелірная справа. Узнікненне гарадоў. Кантакты з варагамі. Помнікі Гнёздава. Развіццё пісьменнасці і адукацыі. Кіеў у X–XII стст. – буйнейшы цэнтр славянскай культуры. Сутыкненні з печанегамі і полаўцамі. Міфы і рэаліі «Слова пра паход Ігаравы». Буйнейшыя ўсходнеславянскія дзяржавы XII – пач. XIII ст. Полацкае, Смаленскае, Чарнігаўскае, Уладзіміра-Суздальскае, Галіцка-Валынскае, Разанскае княствы. Узнікненне Ноўгарадскай рэспублікі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Агнішчанін*** – княжацкі дружыннік, які кіраваў дваром і слугамі.

***Аркатура, аркатурны пояс (фрыз)*** (ням. Arkatur) – рытмічны шэраг дэкаратыўных несапраўдных арак на фасадах будынкаў альбо на сценах унутры памяшканняў.

***Волакі*** – назва месца найбольшага збліжэння дзвюх суседніх рэк, якія ўпадалі ў розныя водныя сістэмы, па якім караблі перацягвалі (валаклі) з адной рэчкі ў другую або перавозілі грузы.

***Даніна*** – натуральны аброк. На землях усходніх славян вядомы з IX ст. як асноўны падатак насельніцтва на карысць дзяржавы, а таксама як падатак з заваяваных народаў.

***Зямля*** – дзяржаўнае ўтварэнне ўсходніх славян ў XII–XIII стст.

***Какошнік*** – паўкруглая ці кілепадобная архітэктурная дэталь,

якая размяшчаецца (даволі часта ярусамі) каля асновы шатроў і барабанаў купалаў культавых будынкаў. Ужывалася таксама ў аздабленні фасадаў грамадскіх будынкаў у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя.

***Крыжова-купальная сістэма*** – архітэктурная сістэма (кампазіцыя), у якой да падкупальнай прасторы ў цэнтры храма звернутыя цыліндрычныя скляпенні галін крыжа, якія ў цэлым ствараюць крыжападобную структуру.

***Літургія*** – набажэнства, у якім выкладаецца сутнасць асноўных ідэй хрысціянскага светапогляду.

***Летапіс*** – гістарычны твор з апісаннем падзей па гадах.

***Пасаднік*** – вышэйшая дзяржаўная пасада ў Ноўгарадзе.

***Пісала*** – жалезная ці касцяная прылада для пісьма на бяросце.

***Смерд*** – адносна вольны працаўнік-земляроб.

***Смердзій халоп*** – паднявольны чалавек, які выконваў простую работу ў гаспадарцы феадала.

***Снем*** – рада або з’езд усходнеславянскіх князёў.

***Цівун*** – кіраўнік гаспадаркі феадала.

***Чынш*** – грашовая рэнта.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***882 г.*** **–** Наўгародскі князь Алег захапіў Кіеў і стварыў Кіеўскую Русь.

***968–969 гг.*** – кіеўскі князь Святаслаў знішчыў Хазарскі каганат.

***988 г.*** – кіеўскі князь Уладзімір прыняў хрысціянства.

***992 г.*** – утварэнне епархіі ў Полацку.

***1005 г.*** – заснаванне Тураўскай епархіі.

***1019–1054 гг.*** – княжанне Яраслава Мудрага ў Кіеве (пры ім была складзена «Русская Правда»).

***1037 г.*** – будаўніцтва Сафійскага сабора ў Кіеве.

***Сярэдзіна XI ст.*** – будаўніцтва Полацкага і Ноўгарадскага Сафійскіх сабораў.

***1044–1101 гг.*** – княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча (Чарадзея).
***1113–1125 гг.*** – княжанне ў Кіеве Уладзіміра Манамаха.
***1136 г.*** – стварэнне Ноўгарадскай феадальнай рэспублікі.
***1199 г.*** – стварэнне Галіцка-Валынскага княства.
***1253 г.*** – абвяшчэнне Рымскім папам князя Галіцка-Валынскага княства Данілы Раманавіча каралём.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Ці была Кіеўская Русь раннефеадальнай дзяржавай? Дайце разгорнуты адказ.
2. Якую ролю ў развіцці Кіеўскай Русі адыграла прыняцце хрысціянства?
3. У якіх ваенных паходах кіеўскіх князёў удзельнічалі крывічы, дрыгавічы і радзімічы?
4. Раскажыце пра архітэктуру Кіева і іншых гарадоў Кіеўскай Русі. У якіх гарадах у XI ст. былі пабудаваны Сафійскія саборы?
5. Чаму і калі Кіеўская Русь распалася на асобныя княствы?
6. Калі была створана Ноўгарадская рэсубліка? Што Вы ведаеце пра яе?
7. Якія адносіны былі паміж Полацкім і Смаленскім княствамі?
8. Чым адрознівалася палітычная і эканамічная структура Уладзіміра-Суздальскай Русі і іншых усходнеславянскіх княстваў?
9. Раскажыце пра гісторыю Галіцка-Валынскай зямлі ў XII–XIII стст.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. *Голубеў, В. Ф., Кітурка, І. Ф.* Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – С.-Пецярбург: Неўскі прастор, 2014. – 170 с.
2. *Оргиш, В. П.* Древняя Русь: Образование Киевского государства и введение христианства. / Под ред. Е. М. Бабосова. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 150 с.
3. *Платонов, С. Ф.* Учебник русской истории. – С.-Петербург: Наука, 1994. – 429 с.

# Тэма XI. Качэўнікі Паўднёвай Еўропы X–XII ст. З'яўленне ў Еўропе мангола-татараў і стварэнне Залатой Арды

З'яўленне печанегаў у Еўропе. Стасункі печанегаў з Кіеўскай Руссю і Візантыяй. Крым ў X–XIII ст. Сярэднявечны Херсанес. Захоп Херсанеса кіеўскім князем Уладзімірам. З'яўленне полаўцаў ў паўднёва-усходняй Еўропе. Матэрыяльная і духоўная культура палавецкіх плямёнаў. Узаемаадносіны полаўцаў з усходнеславянскімі княствамі, Візантыяй і Венгрыяй. Разгром полаўцаў мангола-татарамі. Заваяванне мангола-татарамі Разанскага, Уладзіміра-Суздальскага, Чарнігаўскага і іншых усходнеславянскіх княстваў. Разгром Кіева. Стварэнне Залатой Арды.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Амфара*** – таўстасценная гліняная пасудзіна з высокім вузкім горлам і дзвюма ручкамі, прызначаная для транспартавання і захоўвання віна, алею, іншых вадкасцей. На тэрыторыю Беларусі амфары прывозіліся ў асноўным з грэчаскіх калоній у Крыме.

***Арда*** – 1) Дзяржава, саюз плямён у старажытных цюрскіх народаў. 2) Цюрскае войска, якое нападала на славянскія землі.

***Кальчуга*** – від засцерагальнага ўзбраення. Уяўляе сабой сплеценую з металічных кольцаў кашулю.

***Каменная баба*** – скульптурная выява палавецкіх язычніцкіх багоў.

***Курэнь*** – аб'яднанне некалькіх сваяцкіх сем'яў у полаўцаў, балгар і іншых качавых народаў.

***Печанегі*** – саюз качавых плямёнаў, які склаўся ў VIII–IX стст.

***Полаўцы (кыпчакі, куманы)*** – качавы народ цюркскага паходжання.

***Улус*** – 1) Аўтаномная частка мангольскай імперыі, дзяржава. 2) Пасяленне, стойбішча ў народаў Цэнтральнай і Сярэдняй Азіі, Сібіры.

***Хан*** – тытул феадальнага ўладара ў народаў Усходу ў эпоху Сярэднявечча, а таксама асоба, якая мела гэты тытул.

***Чорныя клабукі*** – мірныя цюркі, народ, які жыў на паўднёвых межах Кіеўскай Русі і служыў у войску кіеўскіх князёў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***882 г.*** – печанегі дайшлі да Крыма.

***968 г.*** – аблога Кіева войскам печанегаў.

***972 г.*** – забойства печанегамі кіеўскага князя Святаслава.

***988 г.*** – кіеўскі князь Уладзімір захапіў у Крыме візантыйскі горад Херсанес (Корсунь).

***1010 г.*** – частка печанегаў прыняла іслам, а другая частка – праваслаўе ад Візантыі.

***1036 г.*** – аблога печанегамі Кіева і іх разгром князем Яраславам Мудрым.

***1046–1047 г.*** – уварванне печанегаў у Балгарыю і вайна з Візантыяй.

***1055 г.*** – з’яўленне полаўцаў каля межаў Кіеўскай Русі.

***1185 г.*** – няўдалы паход кіеўскага князя Ігара Святаслававіча на полаўцаў.

***1186 г.*** – з’яўленне полаўцаў у Балгарыі.

***1223 г.*** – бітва на рацэ Калцы.

***1236–1242 гг.*** – еўрапейскі паход хана Батыя.

***1240 г.*** – спусташэнне Кіева войскамі Батыя.

***1266 г.*** – утварэнне Залатой Арды.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Калі печанегі з’явіліся ў Еўропе?

2. Раскажыце пра стасункі печанегаў з Кіеўскай Руссю і Візантыяй.

3. Дайце характарыстыку побыту печанегаў, раскажыце пра іх матэрыяльную і духоўную культуру.

4. Якім чынам полаўцы апынуліся ў Еўропе?

5. У якіх адносінах былі полаўцы і жыхары Кіеўскай Русі? Хто такія чорныя клабукі?

6. Раскажыце, што Вам вядома пра гісторыю Херсанеса. Як гэты горад называлі славяне?

7. Што Вы ведаеце пра горад Тмутаракань?

8. Калі войскі мангола-татараў з’явіліся ў Еўропе і якія еўрапейскія краіны яны заваявалі?

9. Каді была створана Залатая Арда і якія ўсходнеславянскія княствы ўвайшлі ў яе склад?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. Археология Украинской ССР в трёх томах. Том 3. Раннеславянский и древнерусский периоды. / Под ред. Артеменко И. И. – Киев: Наукова Думка, 1986. – 757 с.
2. *Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 398 с.
3. История Киева. (В трёх томах, четырёх книгах). Том первый: Древний и средневековый Киев. – Киев: Наукова Думка, 1982. – 407 с.
4. Історія України: Навч. посіб. / В. І. Гусев, Ю. О. Калінцев, С. В. Кульгицький. За ред. С. В. Кульгицького. – Київ: Вища шк., 2003. – 431 с.
5. *Фортунатов, В. В.* История: Учебное пособие. Стандарт третьего поколения. Для бакалавров. – С.-Петербург: Питер, 2013. – 464 с.

## Тэма XII. Тэўтонскі ордэн і заваяванне народаў Прыбалтыкі. Утварэнне ВКЛ

Балцкія і фіна-ўгорскія плямёны ў IX–XII стст. Калоніі Полацкай дзяржавы на Дзвіне – Герцыке і Кукенойс. Горад Юр'еў у паўднёвай Эстоніі. З'яўленне крыжакоў на землях Латвіі і Эстоніі. Балцкія плямёны ў XII–XIII стст. Славянская каланізацыя і з'яўленне крыжацкай пагрозы. Утварэнне ВКЛ. Летапісная Літва. Узнікненне Вільні як полацкай калоніі. Роля Наваградка ў стварэнні ВКЛ. Змаганне з галіцка-валынскімі князямі. Тэўтонскі і Лівонскі ордэны ў XIII ст.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бергфрыд*** – галоўная вежа замка, апошняе месца абароны насельнікаў замка.

***Данжон*** – абарончая вежа, прыстасаваная да жылля.

***Вітынгі*** – вольныя прускія сяляне, якія знаходзіліся на службе ў ордэнскім замку.

***Комтур*** – ордэнскі чыноўнік высокага рангу. Кіраўнік комтурства, адміністрацыйнай адзінкі крыжацкага ордэна.

***Комтурскі замак***, альбо ***замак канвента*** – галоўны замак комтурства, рэзідэнцыя комтура і канвента.

***Канвент*** – рада, якая складалася з 12 ордэнскіх рыцараў пад кіраўніцтвам комтура.

***Крыжак*** – удзельнік крыжовых паходаў заходнееўрапейскіх рыцараў у XI–XIII стст.

***Латгалы*** – усходнебалцкае племя, якое жыло побач з крывічамі.

***Лівонія*** – зямля ліваў. Пазней – назва тэрыторый Латвіі і Эстоніі, заваяваных крыжакамі.

***Лівы*** – племя фіна-ўгорскага паходжання, якое плаціла даніну Полацку.
***Магістр*** – кіраўнік ордэна, які выбіраўся пажыццёва.
***Ратнікі*** (альбо ***кнехты***) – наёмныя воіны ордэна.
***Прусы*** – група плямён, народ заходнебалцкай моўнай групы.
***Фогт*** – кіраўнік замка.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1009 г.*** – першы ўспамін пра Літву ў пісьмовых крыніцах.
***1201 г.*** – заснаванне г. Рыгі.
***1202 г.*** – стварэнне ордэна мечаносцаў.
***1209 г.*** – крыжакі захапілі г. Герцыке – калонію Полацка.
***1230 г.*** – з’яўленне Тэўтонскага ордэна на мяжы Мазовіі і Прусіі.
***1236 г.*** – рымскі папа абвясціў крыжовы паход супраць балцкіх плямёнаў.
***1235 г.*** – бітва пад Саўле, разгром крыжакоў.
***1237 г.*** – ордэн мечаносцаў стаў васалам Тэўтонскага Ордэна.
***1253 г.*** – каранацыя князя ВКЛ Міндоўга ў Наваградку.
***1255 г.*** – заснаванне г. Кёнігсберга.
***1264 г.*** – забойства Міндоўга – пачатак княжання яго сына Войшалка.
***1270 г.*** – заснаванне замка Марыенбург (будучая сталіца ордэна).
***1295–1315 гг.*** – кіраванне ў ВКЛ князя Віценя.
***1296 г.*** – князь Віцень зацвердзіў дзяржаўны герб ВКЛ «Пагоню».

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Якія плямёны насялялі Прыбалтыку ў XII ст.?
2. Якія гарады-калоніі мела Полацкае княства на р. Дзвіне?
3. Калі пачалося нямецкае заваяванне Прыбалтыкі?

4. Што Вы ведаеце пра ордэн мечаносцаў? Чаму ён быў так названы?

5. Як і чаму на мяжы Мазовіі земляў прусаў з’явіўся Тэўтонскі ордэн?

6. Раскажыце пра структуру і сістэму кіравання Тэўтонскага і Лівонскага ордэна.

7. Дзе знаходзілася летапісная Літва?

8. Раскажыце пра Наваградак і Наваградскую зямлю ў пер. палове XIII ст?

9. Хто такія Міндоўг і Войшалк? Раскажыце іх біяграфію.

10. Калі да ўлады ў ВКЛ прыйшла дынастыя Гедымінавічаў?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Ермаловіч, М. І.* Па слядах аднаго міфа. 2-е выд., дап. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 98 с.
2. Замки и укрепления немецкого ордена в северной части Восточной Пруссии: Справочник. / Авт.-сост. А. П. Бахтин; под ред. В. Ю. Курпакова. – Калининград: Терра Балтика, 2005. – 208 с.
3. *Краўцэвіч, Аляксандр.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. 1248–1377. – Гародня – Уроцлаў, 2015. – 302 с.
4. *Курлович, Гунар; Томашун, Андрис.* История Латвии. Для основной школы. Учебник. 2-е изд., пер. и доп. – Рига, 2002. – 295 с.
5. *Трусаў, А. А.* Невядомая нам краіна. Беларусь у яе этнаграфічных межах. Выданне 2-е, выпр. і дапоўн. – Мн.: Кнігазбор, 2013. – 124 с.
6. *Эйдзінтас, А., Бумблаўскас, А., Кулакаўскас, А., Тамашайціс, М.* Гісторыя Літвы. / Пер. з літ. В. Вячоркі. – Вільня: SANTARA, 2014. – 280 с., іл.

## Тэма XIII. Культура Сярэднявечча. Архітэктура і мастацтва

Раманскі стыль (XI–XII стст.). Будаўнічая тэхніка і планіроўка раманскага храма. Абацтва Клюні і яго ўплыў на раманскую архітэктуру Еўропы. Уплыў раманскай архітэктуры на архітэктуру ўсходніх славян (Галіцкая і Уладзіміра-Суздальская архітэктура). Узнікненне гатычнага стылю. Еўрапейская готыка XII–XIII стст. «Цагляная готыка» Паўночнай Еўропы. Уплыў асноўных рэлігій на ўжыванне ежы і напояў. Спецыфіка хрысціянства, мусульманства, іудаізму. Асноўныя прадукты харчавання сялян, гараджан, рамеснікаў, шляхты і магнатаў. Сервіроўка стала. Уплыў хрысціянства на адзенне еўрапейцаў. Візантыйскае адзенне. Адзенне арабаў. Вопратка духавенства, магнатаў, сялян і рамеснікаў. Уплыў хрысціянства на лад жыцця еўрапейцаў. Забарона спорту і спартыўных спаборніцтваў. Стан санітарыі ў сярэдневяковым еўрапейскім горадзе. Эпідэміі і пандэміі ў Еўропе і Азіі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Амбон*** (ад грэч. ambōn – узвышэнне) – узвышанае месца перад алтаром у бажніцы (царкве ці касцёле), звычайна багата аздобленае, адкуль чытаюць тэксты з Бібліі, казанні, прамаўляюць казані падчас набажэнства.

Паводле падання, амбон сімвалізуе Ноеў каўчэг (карабель). Будаваўся ён з натуральнага ці штучнага каменю, дрэва і металу. Часта мае форму трыбуны з парапетам.

***Базіліка*** (ад грэч. basilikē – царскі дом) – тып антычнага, потым сярэднявечнага будынка, прамавугольнага ў плане, падзеленага ўздоўж шэрагамі калонаў на некалькі (звычайна – 3,

радзей – 5) частак (так званых караблёў або нефаў). Сярэдні неф, завершаны апсідай, вышэйшы і шырэйшы за бакавыя.

***Галерэя*** (франц. galerie, ад італ. galleria) – 1) бакавыя памяшканні з вокнамі, прыбудаваныя да асноўнага аб'ёма храма XI–XII стагоддзяў; 2) доўгае крытае светлае памяшканне, у якім адну вонкавую падоўжную сцяну замяняе каланада; 3) спецыяльныя зальныя памяшканні ў палацах, асветленыя суцэльнымі шэрагамі вялікіх вокнаў; 4) калідор з суцэльнымі ваконнымі праёмамі на адным з падоўжаных бакоў будынка. У Беларусі ў XVI–XVIII стагоддзях існавалі ў манастырах і кляштарах.

***Гзымс (карніз)*** – гарызантальны выступ, які завяршае сцяну будынка, ваконныя і дзвярныя праёмы, падтрымлівае дах і ахоўвае сцяну ад сцёку вады, падзяляе фасад на асобныя ярусы і завяршае цокаль збудавання.

***Контрфорс*** (ад франц. contreforce – процідзейная сіла) – у архітэктуры папярэчная сценка, вертыкальны слуп або выступ ці рабро для ўмацавання апорнай канструкцыі (пераважна сцяны). Рабіліся ўздоўж сценаў і на кутах будынка.

***Нервюра*** (франц. nervure, ад лац. nervus – жыла, сухажылле) – арка з абчасаных клінападобных камянёў або спецыяльных фігурных цаглін, якая ўмацоўвае рэбры крыжовага, сеткавага, зорчатага і іншых формаў скляпення.

***Раманскі стыль*** – стыль сярэднявечнага заходнееўрапейскага мастацтва X–XII стагоддзяў. Збудаванні вызначаліся манументальнасцю, масіўнасцю канструкцый, аздабляліся абстрактна-геаметрычным арнаментам і скульптурай. Спачатку будынкі мелі плоскія драўляныя перакрыцці, пазней – цыліндрычныя і нарэшце – крыжовыя.

***Скляпенне*** – апорная прасторавая канструкцыя для перакрыцця ці накрыцця збудаванняў, якая мае крывалінейны абрыс. Скляпенне бывае розных формаў: цыліндрычнае, крыжовае, люстраное. Разнавіднасць скляпення – купал.

***Фасад*** – вонкавы бок пабудовы. Адрозніваюць фасады: галоўны, бакавыя, дваровы, вулічны, паркавы ды інш.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1163 г.*** – будаўніцтва сабора Божай маці ў Парыжы.
***XIII ст.*** – узнікненне грамадскіх лазняў у Заходняй Еўропе.
***1209 г.*** – заснаванне Кембрыджскага ўніверсітэта.
***Каля 1214 г. – каля 1292 г.*** – Роджэр Бэкан.
***1225–1274 гг.*** – Фама (Тамаш) Аквінскі.
***1248 г.*** – пачатак будаўніцтва Кёльнскага сабора.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Раскажыце пра выгляд і асноўныя дэталі раманскага храма.

2. Што Вы ведаеце пра абацтва Клюні?

3. Які ўплыў раманская архітэктура зрабіла на манументальную архітэктуру ўсходніх славян?

4. У якіх гарадах Еўропы з’явіліся першыя ўніверсітэты? Што Вы пра іх ведаеце?

5. Хто такія Роджэр Бэкан? Фама Аквінскі?

6. Назавіце асноўныя архітэктурныя дэталі гатычнага храма.

7. Дайце характарыстыку «цаглянай» готыкі Еўропы.

8. Раскажыце пра харчаванне еўрапейцаў ў XI–XIII стст.

9. Як апраналіся прадстаўнікі асноўных станаў (саслоўяў) заходнееўрапейскага і візантыйскага грамадства?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Качановский, В. В.* История культуры Западной Европы. – Мн.: Экоперспектива, 1998. – 190 с.

2. *Лазука, Б. А.* Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад стараж. часоў па XVI стагоддзе. – Мінск: Беларусь, 2010. – 311 с., іл.

3. *Трусаў, А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. – Мн.: Харвест, 2015. – 464 с. , іл.

4. *Ястрембицкая, А. Л.* Западная Европа XI–XIII веков. – Москва: Искусство, 1978. – 176 с.

# Раздзел III.
# ПОЗНЯЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА (XIV–XV СТСТ.)

## Тэма XIV. Гарады-дзяржавы Італіі

Перадумовы Рэнесансу ў гарадах-дзяржавах Італіі. Адкрыцці ў галіне архітэктуры і мастацтва. Цікавасць да антычнай культуры. З'яўленне ўрбаністыкі і садова-паркавай архітэктуры. Дзейнасць італьянскіх архітэктараў, скульптараў, мастакоў. З'яўленне бастыённых замкаў і палявой артылерыі. Пераход ад латыні да італьянскай мовы. Уплыў гуманізму на матэрыяльную культуру і выяўленчае мастацтва. Гарады-дзяржавы Італіі: Венецыя, Генуя, Мілан, Фларэнцыя, Піза і Рым. Помнікі архітэктуры, скульптура, марскі флот і гандлёвыя сувязі італьянскіх дзяржаў.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Антропацэнтрызм*** – светапогляд, адпаведны якому канчатковай мэтай і цэнтрам Сусвету з'яўляецца чалавек.

***Вялікая рада*** – найвышэйшы орган улады ў Венецыі.

***Дож*** – кіраўнік Венецыі, якога пажыццёва абіраў на пасаду Вялікі савет.

***«Залатая» кніга*** – спіс самых знакамітых сем'яў Венецыі з прадстаўнікоў якіх абіраўся Вялікі Савет.

***Інтэлігенцыя*** – асобая група людзей, якія займаліся разумовай працай.

«***Італьянскія войны***» – войны паміж Францыяй і Іспаніяй за валоданне Італіяй.

***Мануфактура*** – прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і ручной рамеснай тэхніцы.

***Урбаністыка*** – горадабудаўніцтва, адзін з раздзелаў архітэктуры – навука пра пабудову і планіроўку гарадоў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1407 г.*** – заснаванне банка св. Георгія ў Генуі.

***1420–1436 гг.*** – стварэнне Ф. Брунелескі купала сабора Санта Марыя дэль Ф'ёрэ ў Фларэнцыі.

***1434 г.*** – устанаўленне ўлады сям'і Медычы ў Фларэнцыі.

***1451–1506 гг.*** – Хрыстафор Калумб.

***1452–1519 гг.*** – Джыралама Саванарола.

***1494–1498 гг.*** – рэспубліка ў Фларэнцыі на чале з Саванаролам.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Як і чаму ўзніклі манафактуры?

2. Раскажыце пра палітычную структуру і палітычнае кіраўніцтва Венецыі.

3. Што Вы ведаеце пра горад-дзяржаву – Фларэнцыю?

4. Раскажыце, што Вам вядома пра гісторыю Генуі.

5. Чаму Францыя і Іспанія пачалі ваяваць за Італію?

6. Чаму італьянская культура XVI–XV стст. атрымала назву Адраджэнне?

7. Хто такія гуманісты? Раскажыце пра іх погляды на прыроду і чалавека.

8. Што такое ўрбаністыка? Назавіце вядомых архітэктараў Італіі.

9. Чаму ў канцы XV ст. пачаўся заняпад італьянскіх дзяржаў?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Качановский, В. В.* История культуры Западной Европы. – Мн.: Экоперспектива, 1998. – 190 с.
2. *Краўцэвіч, Аляксандр.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. 1248–1377. – Гародня – Уроцлаў, 2015. – 302 с.
3. *Лазука, Б. А.* Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад стараж. часоў па XVI стагоддзе. – Мінск: Беларусь, 2010. – 311 с., іл.

## Тэма XV. Францыя і Англія

100-гадовая вайна. Прычыны вайны паміж Англіяй і Францыяй. Пачатак вайны і параза ў ёй Францыі. Роля Бургундыі ў вайне. Жанна д'Арк і яе роля ў вайне. З'яўленне агнястрэльнай зброі. Сялянскія паўстанні ў Францыі і Англіі ў XIV ст. Міжусобныя войны ў Англіі ў XV ст. Вайна Францыі з Бургундыяй. Дзейнасць караля Францыі Людовіка XI.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***«Вайна Чырвонай і Белай ружы»*** – міжусобная вайна ў Англіі ў XV ст.
***Валуа*** – дынастыя французскіх каралёў.
***Дафін*** – наследнік французскага прастола.
***Дзева (Латарынгская Дзева)*** – так французы называлі Жанну д'Арк.
***Жакерыя*** – сялянскае паўстанне ў Францыі ў XIV ст.
***Капетынгі*** – дынастыя французскіх каралёў.
***Плантагенеты*** – дынастыя англійскіх каралёў.
***Цюдары*** – дынастыя англійскіх каралёў.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1337 г.*** – Пачатак Стагадовай вайны.
***1346 г.*** – бітва пры Крэсі, захоп англічанам г. Кале.
***1356 г.*** – бітва пры Пуацье.
***1358 г.*** – сялянскае паўстанне Жакерыя.
***1381 г.*** – сялянскае паўстанне Уота Тайлера ў Англіі.
***1412–1431 гг.*** – Жанна д'Арк.
***1415 г.*** – бітва пры Азенкуры (Стагадовая вайна).
***1429 г.*** – зняцце аблогі з Арлеана (Стагадовая вайна).

***1453 г.*** – канец Стагадовай вайны.

***1485 г.*** – да ўлады ў Англіі прыйшоў Генрых VII, заснавальнік дынастыі Цюдараў.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Назавіце прычыны і асноўныя бітвы Стагадовай вайны.
2. Раскажыце пра жыццё і подзвіг Жанны д'Арк.
3. Што Вы ведаеце пра сялянскае паўстанне Жакерыя?
4. Раскажыце пра паўстанне Уота Тайлера.
5. Што Вы ведаеце пра міжусобную вайну XV ст. у Англіі?
6. Раскажыце, што Вам вядома пра герцагства Бургундыю.
7. Калі завяршылася аб'яднанне Францыі?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. *Басовская, Н. И.* Столетняя война: леопард против лилии. – Москва: Астрель, АСТ, 2007. – 446 с.
2. *Гуревич, А. Я.; Харитонович, Д. Э.* История средних веков: Учебник для средней школы. – М.: Интерпракс, 1995. – 336 с., ил.
3. *Фаулер, К.* Эпоха Плантагенетов и Валуа. / Пер. с англ. С. А. Кириленко. – С.-Петербург: Евразия, 2002. – 352 с.

# Тэма XVI. Свяшчэнная Рымская імперыя. Гусіцкія войны

«Залатая була» і яе змест. Сістэма кіравання. Ганзейскі саюз гарадоў. Тэўтонскі і Лівонскі ордэн ў XIV–XV стст. Фармаванне цэнтралізаванай Венгерскай дзяржавы. Выхад з імперыі Швейцарыі. Чэхія на мяжы XIV–XV ст. Ян Гус і яго дзейнасць. Гусіцкі рух. Табарыты і памяркоўныя. Гусіцкія войны. Ян Жыжка.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Ганза*** – гандлёвы саюз паўночных гарадоў Свяшчэннай Рымскай імперыі.

***Гусіты*** – паслядоўнікі Яна Гуса.

***Ерэтык*** – чалавек, які не пагаджаецца з вучэннем царквы.

***Кантон*** – аўтаномная частка Швейцарыі.

***Курфюрст*** – князь у Свяшчэннай Рымскай імперыі, кіраўнік вялікай аўтаномнай часткі краіны, феадал, які мог выбіраць імператара.

***Памяркоўныя*** – частка гусітаў, да якой належалі чэшскія феадалы і бюргеры.

***Рэйхстаг*** – саслоўна-прадстаўнічая ўстанова, спецыяльны орган кіравання пры імператару.

***Табарыты*** – частка гусітаў, да якой належалі сяляне і дробныя гарадскія рамеснікі.

***Царкоўны сабор*** – найвышэйшы орган каталіцкай царквы.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1356 г.*** – зацвярджэнне «Залатой булы».

***1410 г.*** – Грунвальдская бітва.

***1370–1415 гг.*** – Ян Гус.
***1414–1418 гг.*** – Канстанцкі сабор.
***1419 г.*** – паўстанне ў Празе.
***1420 г.*** – першы крыжовы паход супраць гусітаў.
***1434 г.*** – бітва пры Ліпанах.
***1444 г.*** – параза крыжакоў ад туркаў пад Варнай.
***1448 г.*** – перамога туркаў над венграмі на Косавым полі.
***1499 г.*** – Базельскі мір паміж Швейцарыяй і Свяшчэннай Рымскай імперыяй.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Чаму Свяшчэнная Рымская імперыя не стала моцнай краінай?
2. Раскажыце пра палітычную сітуацыю ў краіне. Назавіце яе асноўныя элементы.
3. Што Вы ведаеце пра Ганзейскі гандлёвы саюз?
4. Раскажыце пра лёс Венгрыі ў XIV–XV стст. і яе змаганне з туркамі.
5. Як Швейцарыя набыла незалежнасць?
6. Раскажыце пра Яна Гуса і яго змаганне з каталіцкай царквой.
7. Хто такія гусіты? Чым табарыты адрозніваліся ад памяркоўных?
8. Што Вы ведаеце пра гусіцкія войны?
9. Хто такі Ян Жыжка?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. Замки и укрепления Немецкого ордена в северной части Восточной Пруссии: Справочник. / Авт.-сост. А. П. Бахтин; под ред. В. Ю. Курпакова. – Калининград: Терра Балтика. 2005. – 208 с.

2. *Краўцэвіч, А. К.* Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 46 с., іл.
3. *Курлович, Гунар; Томашун, Андрис.* История Латвии. Для основной школы. Учебник. 2-е изд., пер. и доп. – Рига, 2002. – 295 с.
4. *Janicka, I.* Poznać przeszłość. Rządzący i rządzeni. – Warszawa: Nowa Era, 2015. – S. 38.

## Тэма XVII. Польшча ў XVI–XV стст.

Аб'яднаная дзейнасць Уладзіслава І Лакетка. Змаганне з крыжакамі і сяброўства з Гедымінам. Польшча пад кіраўніцтвам Казіміра Вялікага. Уключэнне ў склад Польшчы часткі Заходняй Украіны. Запрашэнне нямецкіх каланістаў. Заснаванне Кракаўскай акадэміі. Заснаванне новых гарадоў і ўвядзенне магдэбургскага права. Польшча ў часы караля Людовіка. Кошыцкая дамова. Ядзвіга – каралева Польшчы. Крэўская ўнія і шлюб Ядзвігі з Ягайлам. Польшча пад кіраўніцтвам дынастыі Ягелонаў. Вайна з ордэнам. Перамога над Грунвальдам. Гарадзельская ўнія. Пачатак войнаў з Асманскай імперыяй.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Вялікая вайна*** – вайна Польшчы і ВКЛ супраць Тэўтонскага ордэна 1409–1411 гг.

***Ваяводства*** – буйная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Польшчы і ВКЛ.

***Гетман*** – кіраўнік войска ў Польшчы і ВКЛ.

***Касцёл*** – назва каталіцкай царквы ў Польшчы і ВКЛ.

***Кашталян*** – камендант замка.

***Талер*** – срэбная манета, у XII–XVII стст. была срэбным грашовым стандартам у Еўропе.

### НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1300 г.*** – каранацыя ў Гнезна Уладзіслава Лакетка.

***1333–1370 гг.*** – гады праўлення Казіміра І Вялікага.

***1366 г.*** – Казімір Вялікі захапіў Валынь і Падолію.

***1364 г.*** – заснаванне Кракаўскага ўніверсітэта.

***1370 г.*** – спыненне дынастыі Пястаў.

***1370–1382 гг.*** – польская карона перайшла да Людовіка Венгерскага.

***1384 г.*** – каранацыя Ядзвігі ў Кракаве.

***1385 г.*** – Крэўская ўнія.

***1386 г.*** – шлюб Ядзвігі і Ягайлы – вялікага князя ВКЛ, пачатак дынастыі Ягелонаў.

***1410 г.*** – перамога пад Грунвальдам.

***1413 г.*** – Гарадзельская ўнія.

***1444 г.*** – бітва з туркамі пад Варнай, загінуў кароль Польшчы і Венгрыі Уладзіслаў Варненчык.

***1447–1492 гг.*** – кіраванне Казіміра Ягелончыка.

***1460 г.*** – Торуньскі мір. Вяртанне Польшчай Гданьскага памор'я.

***1473 г.*** – узнікненне першай друкарні ў Кракаве.

***1492–1501 гг.*** – праўленне караля Яна Ольбрахта.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Якую ролю ў пачатку аб'яднання Польшчы адыграў Уладзіслаў I Лакетак?
2. Назавіце асноўныя рэформы, зробленыя ў Польшчы Казімірам Вялікім.
3. Раскажыце пра Польшчу ў часы кіравання караля Людовіка.
4. Што Вы ведаеце пра каралеву Ядзвігу?
5. Раскажыце пра сутнасць Крэўскай уніі.
6. Як і калі адбывалася Вялікая вайна з Ордэнам?
7. Раскажыце пра Гарадзельскую ўнію.
8. Раскажыце пра дзейнасць Казіміра Ягелончыка.
9. Якія пагрозы для Польшчы з'явіліся ў канцы XV ст.?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. Всемирная история. Весь школьный курс в таблицах. / Сост. М. Ю. Дуда. – Мн.: Современная школа; Кузьма, 2010. – 2-е изд. – 384 с.
2. *Грабеньский, В.* История польского народа. / Пер. с польск. – Мн.: МФЦП, 2006. – 800 с., ил.
3. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і народа X–XXI стст. / Уклад. М. Семаковіч. – Варшава: Demart, 2005. – 321 с.

## Тэма XVIII. ВКЛ у XIV–XV стст.

Цэнтралізатарская дзейнасць вялікіх князёў. Аб'яднаўчая дзейнасць Гедыміна. Войны з крыжакамі. Перанос сталіцы ў Вільню. Будаўніцтва каменных замкаў. Альгерд і Кейстут. Двоеўладдзе ў краіне. Далучэнне да ВКЛ Валыні, Браншчыны і Смаленшчыны. Бітва на Сініх Водах. Уваход большай часткі Украіны ў ВКЛ. Паходы на Маскву. Крэўская ўнія. Вастраўскае пагадненне. Вялікі князь Вітаўт і яго праўленне. Бітва на Ворскле. Віленска-Радомская ўнія. Вялікая вайна з Ордэнам. Перамога над Грунвальдам. Гарадзельская ўнія. Грамадзянская вайна ў ВКЛ. ВКЛ пад кіраўніцтвам Казіміра Ягелончыка.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Баяры (шляхта)*** – ваенна-службовыя людзі ў ВКЛ.

***Гвалты*** – пільныя, неадкладныя работы, выкліканыя стыхійнымі бедствамі, пажарамі, войнамі, паводкамі і г. д.

***Магнаты (паны)*** – прадстаўнікі радавітай арыстакратыі, якія мелі княжацкія тытулы.

***«Места»*** – назва горада ў ВКЛ.

***«Месцічы», мяшчане*** – жыхары гарадоў і мястэчак.

***Мула (імам)*** – духоўны кіраўнік у татараў у ВКЛ.

***Муэдзін*** – памочнік мулы, чалавек, які заклікае мусульманаў да малітвы (намазу).

***Мястэчка*** – невялікае паселішча гарадскога тыпа.

***Кагал*** – габрэйская грамада.

***Паны-рада*** – Рада ВКЛ, дарадчы орган пры вялікім князю.

***Равін*** – духоўны кіраўнік у габрэйскай абшчыне, якога выбіраў кагал.

***Староствы*** – дзяржаўныя маёнткі ў ВКЛ, якія вялікі князь давёў феадалам у часовае карыстанне за службу.
***Шарваркі*** – работы па рамонце і будаўніцтве дарог і мастоў.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Раскажыце пра дзейнасць князёў Віценя і Гедыміна.
2. Якія замкі яны збудавалі для абароны ВКЛ?
3. Дайце характарыстыку беларускаму гораду ў XIV–XV стст.
4. Калі ў ВКЛ з'явіліся габрэі і татары? Раскажыце пра іх духоўнае і штодзённае жыццё.
5. Дайце вызначэнне архітэктуры ВКЛ. Да якога стылю яна належала?
6. Што вы ведаеце пра Крэўскую ўнію?
7. Раскажыце пра ўнутраную і знешнюю палітыку Вітаўта.
8. Якое значэнне для ВКЛ мела Грунвальдская бітва?
9. З якімі знешнімі пагрозамі сутыкнулася ВКЛ у канцы XV ст.?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ

1. *Голубеў, В. Ф., Кітурка, І. Ф.* Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – С.-Пецярбург: Неўскі прастор, 2014. – 170 с.
2. *Ермаловіч, М. І.* Па слядах аднаго міфа. 2-е выд., дап. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 98 с.
3. *Краўцэвіч, Аляксандр.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага 1248–1377. – Гародня – Уроцлаў, 2015. – 302 с.
4. *Пятраўскас, Р.* Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст.: Склад – структура – улада. / Пер. з літ. мовы Алеся Мікуса. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. – 386 с.

5. *Трусаў, А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. – Мн.: Харвест, 2015. – 464 с., іл.
6. *Трусаў, А. А.* Невядомая нам краіна. Беларусь у яе этнаграфічных межах. Выданне 2-е, выпраўленае і дапоўненае. – Мн.: Кнігазбор, 2013. – 124 с.
7. *Эйдзінтас, А., Бумблаўскас, А., Кулакаўскас, А., Тамашайціс, М.* Гісторыя Літвы. / Пер. з літ. В. Вячоркі. – Вільня: SANTARA, 2014. – 280 с., іл.

# Тэма XIX. Залатая Арда. Вялікае княства Маскоўскае – улус Залатой Арды

Росквіт Залатой Арды ў першай палове XIV ст. Пераход кіраўнікоў дзяржавы і значнай часткі насельніцтва ў іслам. Будаўніцтва горада Сарая (Сарай аль-Джадзін) як цэнтра караваннага гандлю. Палітычны крызіс у другой палове XIV ст. Праўленне хана Тахтамыша. Вайна з Тамерланам. Распад Залатой Арды. Крым у XIV–XV ст. Узнікненне Масквы. Палітыка маскоўскага князя Івана І (Каліты). Войны з ВКЛ і Цвярскімі князямі. Становішча і роля праваслаўнай царквы. Кулікоўская бітва. Вызваленне ад улады Залатой Арды. Палітыка князя Івана ІІІ. Прыняцце Судзебніка і ўзнікненне Расіі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Баскак*** – ханскі намеснік, кіраўнік карнага атрада для збору даніны.

***Беклярбек*** – намеснік кіраўніка (хана) Залатой Арды.

***Вотчына*** – зямельная ўласнасць, якую меў феадал пры ўмове абавязковай службы вялікаму князю. Яна заставалася спадчыннай маёмасцю феадала, яе можна было дзяліць сярод спадчыннікаў і прадаваць.

***«Вялікая Арда»*** – цэнтральная (аўтаномная) частка Залатой Арды ў другой палове XV ст.

***«Выхад»*** – права вялікага князя збіраць з мясцовага насельніцтва даніну для Залатой Арды.

***«Памесце»*** – зямельная ўласнасць, якая часова давалася феадалу за дзяржаўную службу. Пасля смерці ўласніка гэтую ўласнасць забірала дзяржава.

***Памешчык (дваранін)*** – феадал, які атрымліваў «памесце», пакуль знаходзіўся на дзяржаўнай службе.

«***Чорныя землі***» – землі, якія належалі толькі дзяржаве.

***Чарнасоценныя сяляне*** – сяляне, якія працавалі на чорных землях і плацілі падаткі толькі дзяржаве.

***Ярлык*** – грамата, якую атрымлівалі вялікія князі ад хана Залатой Арды на права трымаць уладу.

***«Яса Чынгісхана»*** – татара-мангольскі закон, які абараняў праваслаўную царкву і вызваляў манастыры і святароў ад усіх данін і падаткаў пры ўмове маліцца за хана і яго сям'ю.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1313–1341 гг.*** – праўленне хана Узбека.

***1320-я гады*** – абвяшчэнне ісламу дзяржаўнай рэлігіяй Залатой Арды.

***1325–1340 гг.*** – праўленне маскоўскага князя Івана І Каліты.

***1342–1357 гг.*** – праўленне хана Джанібека.

***1359–1380 гг.*** – «Вялікая замятня» – аслабленне Залатой Арды.

***1380 г.*** – Кулікоўская бітва.

***1380–1395 гг.*** – праўленне хана Тахтамыша.

***1382 г.*** – захоп Тахтамышам Масквы; аднаўленне выплаты даніны маскоўскім князем.

***1391–1396 гг.*** – паходы Тамерлана, разгром Залатой Арды.

***1420-я гады*** – пачатак распаду Залатой Арды.

***1425–1453 гг.*** – міжусобная вайна ў Маскоўскім княстве.

***1438 г.*** – стварэнне Казанскага ханства.

***1441 г.*** – стварэнне Крымскага ханства.

***1462–1505 гг.*** – праўленне Івана ІІІ Васільевіча.

***1480 г.*** – атрыманне незалежнасці Вялікага княства Маскоўскага.

***1497 г.*** – з'явіўся агульнарасійскі Судзебнік, узнікла новая дзяржава – Расія.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Калі была заснаваная дзяржава з назваю «Залатая Арда»?

2. Якім быў асноўны занятак большасці насельніцтва Залатой Арды?

3. Што вы можаце сказаць пра дзяржаўна-палітычны лад Залатой Арды? Чаму правамерна весці гаворку пра Вялікае княства Маскоўскае як улус Залатой Арды?

4. У чым палягала сутнасць эканамічнай і палітычнай залежнасці земляў Усходняй і Паўднёвай Русі ад Залатой Арды? Што такое «ардынскі выхад» («ардынская даніна»)?

5. Якія прывілеі ад татарскіх ханаў атрымлівала руская праваслаўная царква?

6. Як і калі адбывалася культурнае збліжэнне мангола-татараў і насельніцтва Усходняй і Паўднёвай Русі?

7. Якім чынам землям Усходняй і Паўднёвай Русі ўдалося выйсці з-пад мангола-татарскага валадарства?

8. Да якога часу адносіцца ўзнікненне паняццяў «Руская дзяржава»? «Расія»?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. Археология Украинской ССР в трёх томах. Том 3: Раннеславянский и древнерусский периоды. / Под ред. Артеменко И. И. / Киев: Наукова Думка, 1986. – 757 с.
2. История Киева. (В трёх томах, четырёх книгах). Том первый: Древний и средневековый Киев. – Киев: Наукова Думка, 1982. – 407 с.
3. Історія України: Навч. посіб. / В. І. Гусев, Ю. О. Калінцев, С. В. Кульгицький. За ред. С. В. Кульгицького. – Київ: Вища шк., 2003. – 431 с.
4. *Платонов, С. Ф.* Учебник русской истории. – С.-Петербург: Наука, 1994. – 429 с.
5. *Фортунатов, В. В.* История: Учебное пособие. Стандарт третьего поколения. Для бакалавров. – С.-Петербург: Питер, 2013. – 464 с.

## Тэма XX. Усходнеславянскія дзяржавы XIV–XV стст.: Наўгародская і Пскоўская рэспублікі Вялікія княствы Смаленскае, Цвярское і Разанскае

Ноўгарадскія славяне і іх кантакты з фіна-ўгорскімі плямёнамі. Сістэма кіравання. Калоніі Ноўгарада, землі і пяціны. Выхад да Белага мора і заснаванне Салавецкага манастыра. Наўгародскі флот і гандлёвыя сувязі. Наўгародская архітэктурная школа і школа іканапісу. Наўгародска-маскоўскія войны. Пскоўскія крывічы і іх матэрыяльная культура. Пскоў у складзе Наўгародскай дзяржавы. Пскоўскі Кром і Даўмонтаў горад. Гарадскія ўмацаванні Пскова. Набыццё незалежнасці ў XIV ст. Пскоўская архітэктурная школа. Пячорскі манастыр і горадкрэпасць Ізборск. Сельская гаспадарка і рамёствы. Волжскія крывічы. Узнікненне Вялікага княства Цвярскога ў XIII ст. Канкурэнцыя з Вялікім княствам Маскоўскім. Архітэктура і летапісанне. Вандроўка Афанасія Нікіціна ў Індыю. Узбраенне і фінансы. Заваяванне Цверы і Пскова Маскоўскай дзяржавай. Разанскае княства ў XIV–XV стст.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Берасцяная грамата*** – пісьмовы помнік XII–XIV стст., надпіс на бяросце.

***Болатаўская дамова (1348)*** – Пскоў атрымаў поўную незалежнасць ад Ноўгарада.

***Вечавы звон*** – сімвал незалежнасці Ноўгарадскай і Пскоўскай дзяржаў.

***«Вывад»*** – прымусовае перасяленне багатых жыхароў Ноўгарада і Пскова ў іншыя гарады Маскоўскай краіны.

***Гаспóда*** – найвышэйшая рада пскоўскіх баяр.

***«Касцёр»*** – мураваная вежа пскоўскіх умацаванняў.

***Кром*** – пскоўскі крэмль.

***Насад (учан)*** – вялікі карабель, на якім, акрамя тавараў, перавозілі войскі.

***«Персі»*** – мураваныя сцены пскоўскіх умацаванняў.

***Прыгарады*** – умацаваныя пункты (гарады), якія ахоўвалі межы і падыходы да Ноўгарада.

***Пяціна*** – адміністрацыйная адзінка ў Ноўгарадскай дзяржаве.

***Уладыка*** – першаіерарх праваслаўнай царквы ў Ноўгарадзе і Пскове.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***327 г.*** – народнае паўстанне ў Цвяры супраць татараў.

***1371 г.*** – вайна Маскоўскага і Разанскага княстваў.

***Пачатак XV ст.*** – Цвер выпускае ўласныя манеты.

***1424 г.*** – чаканка пскоўскай манеты.

***1456 г.*** – перамога Маскоўскага княства над Ноўгарадам.

***1466–1472 гг.*** – вандроўка Афанасія Нікіціна ў Індыю.

***1471 г.*** – бітва на р. Шэлоні.

***1478 г.*** – канчатковы захоп Масквой Ноўгарада.

***1479 г.*** – захоп Масквою Вяткі – ноўгарадскай калоніі.

***1485 г.*** – далучэнне Цвярскога княства да Маскоўскага.

***1510 г.*** – канчатковае далучэнне Пскова да Маскоўскай дзяржавы.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Раскажыце пра палітычную ўладу ў Ноўгарадскай і Пскоўскай дзяржавах.
2. Назавіце асноўныя гарады і адміністрацыйныя часткі Ноўгарадскай дзяржавы.
3. Пералічыце асноўныя дасягненні ў галіне культуры Ноўгарадскай рэспублікі.

4. Раскажыце пра планіроўку Пскова і Пскоўскую дзяржаву.
5. Што вы ведаеце пра архітэктуру Ноўгарада і Пскова?
6. Як узнікла і развівалася Вялікае княства Цвярское?
7. Раскажыце пра вандроўку Афанасія Нікіціна ў Індыю.
8. Раскажыце пра гісторыю Вялікага княства Смаленскага.
9. Што Вы ведаеце пра Вялікае княства Разанскае і яго стасункі з Масквою?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Белецкий, В. Д.* Довмонтов город. Архитектура и монументальная живописьXIV века. – Ленинград: Искусство, 1986. – 130 с.
2. Великое княжество Рязанское: историко-археологические исследования и материалы. / Отв. ред. А. В. Чернецов. – Москва: Памятники исторической мысли, 2005. – 589 с.
3. *Лабутина, И. К.* Историческая топография Пскова в XIV–XV вв. – Москва: Наука, 1885. – 248 с.
4. Новгородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода / Под ред. Колгина Б. А., Янина В. Л. – Москва: Наука, 1982. – 336 с.
5. Псков. Очерки истории: сборник. – Ленинград: Лениздат, 1971. – 368 с.
6. *Платонов, С. Ф.* Учебник русской истории. – С.-Петербург: Наука, 1994. – 429 с.
7. Тверь, тверская земля и сопредельные территории в эпоху Средневековья. Выпуск 1. Тверь: Старый город, 1996. – 277 с.
8. *Трусаў, А. А.* Невядомая нам краіна. Беларусь у яе этнаграфічных межах. Выданне 2-е, выпраўленае і дапоўненае. – Мн.: Кнігазбор, 2013. – 124 с., іл.
9. *Цемушаў, В. М.* На ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIV – першая палова XVI ст.). / Навук. рэд. В. Ф. Голубеў. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. – 464 с., іл.

# Тэма XXI. Дацкае каралеўства. Кальмарская ўнія. Швецыя, Нарвегія і Фінляндыя ў XIV–XV стст.

Данія ў пачатку XIV ст. Праўленне каралёў Вальдэмара III і Вальдэмара IV. Рэформы Вальдэмара IV. Вайна з Ганзай і яе вынікі. Нарвежска-шведская ўнія. Далучэнне Нарвегіі да Даніі. Швецыя ў XIV ст. Адносіны з Фінляндыяй і Ноўгарадам. Вайна з Даніяй. Падпісанне Кальмарскай уніі і яе наступствы для Даніі і Швецыі. Стварэнне шведскага парламента. Заснаванне ўніверсітэта ў Упсале.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Біглеры*** – аб'яднанне (партыя) нарвежскіх сялян, гараджан і дробнай шляхты, якія змагаліся за незалежнасць краіны.

***Одальнае права*** – перавага сваякоў на куплю зямлі, што належала сялянам.

***Рыксдаг*** – шведскі парламент.

***Рыксрад*** – дзяржаўная рада Швецыі, што складалася з буйных феадалаў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1310 г.*** – распад Швецыі на дзве часткі.

***1326–1330 гг.*** – праўленне караля Даніі Вальдэмара III.

***1340–1375 гг.*** – праўленне караля Даніі Вальдэмара IV.

***1359 г.*** – скліканы першы шведскі парламент.

***1380–1814 гг.*** – дацка-нарвежская ўнія.

***17 чэрвеня 1397 г.*** – падпісана Кальмарская ўнія.

***1477 г.*** – адкрыццё ўніверсітэта ў Упсале (першага ў Скандынавіі).

## КАНТРОЛЬНЫЯ
## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Раскажыце пра палітычную гісторыю Даніі ў XIV ст.

2. Што Вы ведаеце пра Ганзейскі гандлёвы саюз?

3. Калі адбылося аб'яднанне Даніі і Нарвегіі?

4. Калі быў скліканы першы шведскі парламент і як ён называўся?

5. Калі Швецыя захапіла Фінляндыю?

6. Якія адносіны ў Швецыі былі з Ноўгарадам?

7. Раскажыце пра сутнасць Кальмарскай уніі.

8. Калі і дзе быў адкрыты першы ўніверсітэт у Скандынавіі?

9. Раскажыце, што Вы ведаеце пра сталіцу Даніі – Капенгаген.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Вейбуль, Йорген.* Краткая история Швеции. / Пер. со шведск. – Стокгольм, 1994. – 215 с.
2. История Дании. / Под ред. Стена Буска и Хеннинга Поульсена. Пер. с датск. – Москва: Весь Мир, 2008 (*Электронный ресурс:* http://www.e-reading.club/bookreader.php/1026174/Rasmssen_Seren_-_Istoriya_Danii.html).
3. История Норвегии. От викингов до наших дней. / Даниельсен Р., Дюрвик С., Грентли Т., Хелле К., Ховланн Э. Пер. с англ. – Москва: Весь мир, 2003.
4. *Мейнандер, Хенрик*. История Финляндии. / Пер. с финск. – Москва: Весь Мир, 2008. – 240 с.

## Тэма XXII. Захоп туркамі Візантыі і паўднёва-славянскіх дзяржаў

Узнікненне асобных турэцкіх княстваў у Малой Азіі і іх набегі на Візантыю. Стварэнне дзяржавы Асманаў. Вайна Балгарыі і Сербіі на Балканах. Дзейнасць Стэфана Душана. Першы крыжовы паход супраць турак. Выхад дзяржавы Асманаў да Мармуровага мора. Першы штурм Канстанцінопаля. З'яўленне турак на Балканах. Захоп Балгарыі і Сербіі. Бітва на Косавым полі. Дзейнасць султана Мурада I. Перанос сталіцы Турцыі ў Андрыянопаль. Пошук дапамогі візантыйцамі ў Еўропе. Другі крыжовы паход супраць турак. Бітва пад Нікапалем. Напад на Асманскую дзяржаву войскаў Цімура. Разгром турэцкай арміі. Падпісанне Фларэнтыйскай уніі. Чарговы крыжовы паход супраць Асманаў. Параза крыжакоў пад Варнай і венграў на Косавым полі. Гандлёвыя сувязі Візантыі з дзяржавамі Італіі. Генуэзская калонія – Галата. Грамадзянская вайна ў Візантыі. Аблога і штурм Канстанцінопаля. Ліквідацыя Візантыі і захоп Крыма.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бейлік*** – невялікае турэцкае княства.
***Газават (джыхад)*** – свяшчэнная вайна з няверным за іслам.
***Дэнарый*** – сярэднявечная залатая візантыйская манета.
***Дукат*** – сярэднявечная залатая італьянская манета.
***Зілоты*** – радыкальная антыарыстакратычная групоўка ў гарадах Візантыі.
***Крымскае ханства*** – стэпавая татарская дзяржава, з 1475 – васал Асманскай імперыі.
***Парыкі*** – візантыйскія сяляне – трымальнікі чужой (панскай

ці дзяржаўнай) зямлі, за якую выконвалі розныя павіннасці.

***Сарацыны*** – адно з сярэднявечных назоваў мусульманскіх войнаў, што ваявалі з крыжакамі.

***Ферара – Фларэнтыйскі сабор*** – месца, дзе вышэйшае каталіцкае духавенства і візантыйская дэлегацыя заключалі царкоўную ўнію.

***Цімар*** – у Асманскай імперыі – права воінаў збіраць падаткі з земляробаў на пэўнай тэрыторыі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1341–1355 гг.*** – Грамадзянская вайна ў Візантыі.
***1389 г.*** – разгром туркамі сербаў на Косавым полі.
***1396 г.*** – нікапальскі крыжовы паход.
***1402 г.*** – разгром Цімурам асманскага войска каля Анкары.
***1438–1445 гг.*** – Ферара-Фларэнтыйскі сабор.
***1439 г.*** – Фларэнтыйская царкоўная ўнія.
***1444 г.*** – туркі разбілі крыжацкае войска пад Варнай.
***1448 г.*** – перамога туркаў над венграмі на Косавым полі.
***29 мая 1453 г.*** – узяцце туркамі Канстанцінопаля.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Калі ўзнікла Асманская дзяржава і чаму яна атрымала такую назву?
2. Што ўяўляла сабой Балгарыя ў XIV ст.?
3. Чаму Сербія стала ў першай пал. XIV ст. самай моцнай дзяржавай на Балканах?
4. Раскажыце пра бітву туркаў з сербамі на Косавым полі.
5. Што ўяўляла сабою Візантыя ў XIV ст.?
6. Раскажыце пра адносіны Візантыі з італьянскімі дзяржавамі.
7. З якой мэтай адбываўся Ферара-Фларэнтыйскі сабор?

8. Якія мэты хацелі дасягнуць кіраўнікі Візантыі, падпісаўшы Фларэнтыйскую унію і чаму яна не была рэалізавана?

9. Раскажыце пра штурм Канстанцінопаля туркамі і яго вынікі.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. Всемирная история. Весь школьный курс в таблицах. / Сост. М. Ю. Дуда. – Мн.: Современная школа; Кузьма, 2010. – 2-е изд. – 384 с.
2. *Грабеньский, В.* История польского народа. / Пер. с польск. – Мн.: МФЦП, 2006. – 800 с., ил.
3. История южных и западных славян. / Матвеев Г. Ф., Ненашева З. С. – Москва: Изд-во Московского университета, 2008. – Т. 1. – 688 с.
4. *Кулаковский, Ю. А.* История Византии. В 3-х т. – 3-е изд., исправ. и доп. Т. 3. – С.-Петербург: Алетейя, 2003. – 352 с. (Византийская библиотека. Исследования).

## Тэма XXIII. Каталіцкая царква ў XIV–XV стст.

Умяшальніцтва папскага прастола ў міжнародныя і ўнутраныя справы заходнееўрапейскіх дзяржаў. Канфлікт папы Баніфацыя VIII з каралямі Англіі і Францыі. Захоп французамі рымскага папы ў палон. Авіньёнскі палон папаў. Паўстанне Кола дзі Рыенца ў Рыме. Разгром ордэна тампліераў. «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве. Сабор у Пізе і Канстанцкі сабор. Саборны рух. Фларэнційская ўнія. Дзейнасць Джона Уікліфа і Джыралама Саванаролы.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Була*** – пасланне, зварот рымскага папы, змацаваныя круглай пячаткай.

***Дамініканцы*** – сябры манаскага каталіцкага ордэна, заснаванага ў XIII ст. манахам Дамінікам для змагання з ерэтыкамі. Дамініканцы кіравалі інквізіцыяй.

***Канклаў*** – сход кардыналаў, на якім выбіраюць новага папу.

***Канкардат*** – дамова паміж кіраўніцтвам нейкай дзяржавы і рымскім папам аб прынцыпах дзейнасці каталіцкай царквы на тэрыторыі гэтай дзяржавы.

***Легат*** – пасланец рымскага папы з асобым даручэннем у нейкую краіну.

***Нунцый*** – пастаянны дыпламатычны прадстаўнік рымскага папы пры ўрадзе якой-небудзь дзяржавы.

***Цэлібат*** – адмова каталіцкага святара ўступаць у шлюб. Існуе з XI ст.

***Чысцец*** – догмат каталіцкай цэрквы, уведзены ў 1439 г. Месца, дзе душа нябожчыка знаходзіцца перад тым, каб трапіць у рай, і праходзіць ачышчэнне.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1300 г.*** – першы юбілейны год каталіцкай царквы.
***1309–1377 гг.*** – Авіньёнскае паланенне пап.
***1312 г.*** – ліквідацыя ордэна тампліераў.
***1320–1384 гг.*** – Джон Уікліф.
***1347 г.*** – паўстанне ў Рыме на чале з Кола дзі Рыенца.
***1378–1417 гг.*** – «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве.
***1414–1417 гг.*** – Канстанцскі сабор.
***1438–1445 гг.*** – Ферара-Фларэнтыйскі сабор.
***1439 г.*** – Фларэнтыйская царкоўная ўнія.
***1452–1498 гг.*** – Джыралама Саванарола.

## КАНТРОЛЬНЫЯ
## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Якую ролю адыгрывала ў Еўропе каталіцкая царква ў XIII ст.?
2. Раскажыце пра стасункі рымскага папы Баніфацыя VIII з каралямі Англіі.
3. Чым скончылася спрэчка Баніфацыя VIII з каралём Францыі?
4. Раскажыце пра Авіньёнскі палон папаў.
5. Хто такія тампліеры і чаму гэты ордэн забаранілі?
6. Калі Рым стаў рэспублікай?
7. Як адбываўся «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве?
8. Раскажыце пра Саборны рух сярод каталіцкага духавенства.
9. Як прымалася Фларэнтыйская унія? Якія рашэнні былі прыняты на Канстанцскім саборы?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. Всемирная история. Справочное издание для учащихся 11 класса и абитуриентов для подготовки к экзаменам – Мн.: ТАА «Лекция», 2000. – 128 с.
2. Всемирная история. Весь школьный курс в таблицах. / Сост. М. Ю. Дуда. – Мн.: Современная школа; Кузьма, 2010. – 2-е изд. – 384 с.
3. Kronika chrześcijaństwa. / Praca zbiorowa; Beier, B. – Warszawa: Świat Książki, 1998. – 464 s.
4. Historia Kościoła katolickiego 2. Średniowiecze. / Marian Banaszak. – Warszawa: Wyd-wo UK im. kard. S. Wyszyńskiego, 2009. – 382 s.

## Тэма XXIV. Стварэнне Іспанскай імперыі і Партугальскае каралеўства. Пачатак вялікіх геаграфічных адкрыццяў

Палітычная сітуацыя на Пірэнейскім паўвостраве ў пачатку XIV ст. Каралеўства Кастылія. Міжусобныя войны. Абмежаванне ўлады караля Кастыліі. Эканоміка Кастыліі. Фіскальная сістэма каралеўства Арагон у XIV ст. Арагонская экспансія ў Італіі, захон неапалітанскага каралеўства. Адносіны з Каталоніяй.

Стварэнне Іспаніі (Кастыльска-Арагонскае каралеўства). Заваяванне Гранадскага эмірата. Партугалія ў XIV ст. Знешняя экспансія Партугаліі ў XV ст. Захоп калоній у Афрыцы і адкрыццё марскога шляху ў Індыю. Адкрыццё ўзбярэжжа Бразіліі. Экспедыцыі Хрыстафора Калумба.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Алькабала*** – падатак на здзелкі, звязаныя з адчужэннем нерухомасці.

***Гранд*** – магнат, багаты феадал.

***Ідальга*** – іспанскі шляхціц, які служыў у караля, ці багатага феадала.

***Інквізіцыйны трыбунал*** – іспанская інквізіцыя, якая вяла пераслед габрэяў, мусульманаў і ерэтыкоў.

***Маўр*** – мусульманін, жыхар Гранадскага эмірата.

***Марыск*** – мусульманін, які перайшоў у хрысціянства.

***Каравела*** – марскі карабель, які ў XV ст. меў дзве або тры мачты і даўжыню ад 20 да 25 м.

***Картэсы*** – орган саслоўнага прадстаўніцтва ў каралеўствах Пірэнейскага паўвострава.

***Факторыя*** – гандлёвы пасёлак еўрапейскіх купцоў ў каланіяльных краінах.

***Эльдарада*** – міфічная краіна, багатая на золата і каштоўныя камяні, якую шукалі на тэрыторыі Лацінскай Амерыкі іспанскія заваёўнікі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1385–1433 гг.*** – праўленне Жуана I, партугальскага караля.

***1415 г.*** – захоп партугальцамі Сеуты.

***1451–1506 гг.*** – Хрыстафор Калумб.

***1469 г.*** – шлюб Фердынанда Арагонскага і Ізабелы Кастыльскай. Утварэнне Іспаніі.

***1479 г.*** – Кастыльска-Арагонская унія.

***1480 г.*** – стварэнне інквізіцыйнага трыбунала ў Іспаніі на чале з Тарквемадай.

***1488 г.*** – адкрыццё партугальцамі мыса Добрай Надзеі.

***1492 г.*** – падзенне Гранадскага эмірата. Завяршэнне Рэканкісты.

***1492–1203 гг.*** – чатыры экспедыцыі Калумба, адкрыццё Амерыкі.

***1498 г.*** – адкрыццё марскога шляху з Еўропы ў Індыю Васка да Гамай.

***1500 г.*** – адкрыццё партугальцамі Бразіліі.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Якія дзяржавы існавалі на Пірэнейскім паўвостраве ў XIV–XV стст.?

2. Раскажыце пра Кастыльскае каралеўства ў XIV – першай палове XV ст.

3. Што Вы ведаеце пра каралеўства Арагон? Калі Арагон распачаў войны ў Італіі?

4. Калі ўзнікла Іспанія?

5. Раскажыце пра дзейнасць інквізіцыі ў Іспаніі.

6. Калі была скончана Рэканкіста?

7. Чаму Партугалія пачала экспансію ў Афрыку?

8. Калі партугальцы праклалі марскі шлях у Індыю?

9. Раскажыце пра Хрыстафора Калумба і яго экспедыцыі ў Новы Свет.

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Альтамира-и-Кревеа, Р.* История Испании. / Сокр. пер. с исп. Е. А. Вадковской и О. М. Гармсен. Под ред. С. Д. Сказкина и Я. М. Света. – Москва: Изд-во иностр. лит., 1951. – Т. 1. – 520 с.
2. *Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 398 с.
3. Всемирная история. Весь школьный курс в таблицах. / Сост. М. Ю. Дуда. – Мн.: Современная школа; Кузьма, 2010. – 2-е изд. – 384 с.

## Тэма XXV. Архітэктура і мастацтва Заходняй Еўропы. Развіццё навукі і тэхнікі ў XIV–XV стст.

Феномен італьянскага Адраджэння і яго этапы. Гуманізм і яго асноўныя этапы. Вялікія гуманісты Італіі (Ф. Петрарка, Л. Вала, Л. Бруні). Дзейнасць італьянскіх універсітэтаў. Фларэнцыя – сталіца італьянскага мастацтва. Дзейнасць Філіпа Брунелескі і Данатэлы. Уплыў міланскай архітэктуры на маскоўскае дойлідства. Росквіт кніжнай справы ў краінах Заходняй Еўропы, вынаходніцтва кнігадрукавання. Першыя друкарні. Стварэнне нацыянальных літаратур. Позняя еўрапейская готыка. Фрэскі і вітражы. Развіццё агняпальнай зброі. З'яўленне гадзіннікаў.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Банк*** – установа, дзе ажыццяўляюцца грашовыя аперацыі, аперацыі з золатам, замежнай валютай.

***Буржуа*** – прадстаўнік класа буржуазіі.

***Буржуазія*** – пануючы клас капіталістычнага грамадства, які валодае сродкамі вытворчасці і выкарыстоўвае наёмную працу.

***Інтэлігенцыя*** – асобная група людзей, якія займаюцца разумовай працай.

***Лафет*** – станок, на якім умацоўваецца ствол гарматы.

***Рэнесанс (адраджэнне)*** – 1) Эпоха Адраджэння (XIV–XVI стст.), час росквіту навук і мастацтваў, які змяніў у Еўропе Сярэднявечча. 2) Архітэктурны стыль эпохі Адраджэння.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1304–1374 гг.*** – Франчэска Петрарка.

***1313–1375 гг.*** – Джавані Бакача.

***1374–1444 гг.*** – Леанарда Бруні.

***1377–1446 гг.*** – Філіпа Брунелескі.

***XV ст.*** – з’яўленне вулічнага асвятлення (Фларэнцыя), фаянсавага посуду ў Еўропе.

***1404–1472 гг.*** – Леон Батыста Альберці.

***1407–1457 гг.*** – Ларэнца Вала.

***Каля 1445 г.*** – з’яўленне друкарскага станка, пачатак кнігадрукавання.

***1452–1519 гг.*** – Леанарда да Вінчы.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА ТЭМЫ

1. Назавіце асноўныя этапы італьянскага Адраджэння.
2. Дайце вызначэнне тэрміна «рэнесанс».
3. Пералічыце імёны найбольш вядомых італьянскіх гуманістаў.
4. Якіх італьянскіх мастакоў, скульптараў і архітэктараў Вы ведаеце?
5. Калі ў Еўропе стала з’яўляцца буржуазія? Чым яна адрозніваецца ад феадалаў?
6. Якія змены ў архітэктуры адбыліся ў XIV–XV стст.?
7. Як змянілася ваенная справа ў Еўропе ў XV ст.?
8. Назавіце асноўныя прыкметы Паўночнага Рэнесанса.
9. Хто і калі вынайшаў друкарскі станок?

## ЛІТАРАТУРА ПА ТЭМЕ


1. *Баршчэўскі, Л.* Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму: Папулярныя нарысы. – Мн.: Сэр-Віт, 2003. – 512 с., іл.
2. *Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 398 с.
3. *Качановский, В. В.* История культуры Западной Европы. – Мн.: Экоперспектива, 1998. – 190 с.
4. *Лазука, Б. А.* Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад стараж. часоў па XVI стагоддзе. – Мінск: Беларусь, 2010. – 311 с., іл.
5. *Трусаў, А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. – Мн.: Харвест, 2015. – 464 с., іл.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Гісторыя Беларусі 1945–2016 гг.
## (ад заканчэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы)

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Валянцін Голубеў,*
доктар гістарычных навук,
прафесар

# УСТУП

Праграма курса «Гісторыя Беларусі 1945–2016 гг. (ад заканчэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы)» уяўляе сабой трэцюю частку эксперыментальнай аўтарскай праграмы вывучэння курса «Гісторыя Беларусі» ў гуманітарным ліцэі з беларускай мовай навучання», падрыхтаванай у межах планавай працы навукова-творчага калектыву «Еўрапейская школа – XXI стагоддзе» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай школы»[1].

У вучэбным курсе «Гісторыя Беларусі 1945–2016 гг. (ад заканчэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы)» прадугледжана грунтоўнае вывучэнне мінулага нашай краіны ў кантэксце ўмацавання беларускай дзяржаўнасці ў пасляваенны перыяд, у час знаходжання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе СССР у 1945–1990 гг., а таксама падзеі, звязаныя з абвяшчэннем Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту і станаўленнем Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы.

Значная ўвага аддадзена вывучэнню гаспадарчага развіцця Беларусі ў XX – першай палове XXI ст., даследаванне працэсу аднаўлення гаспадаркі Беларусі ў пасляваенны перыяд, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў 1945–1953 гг., дзейнасць Беларусі ў ААН.

---

[1] Гл.: Гісторыя Беларусі. Літаратура. Сусветнае мастацтва: Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя. – Мн.: РГА «Таварыства беларускай школы», 2014. С. 5–30; Гісторыя Беларусі. Літаратура. Выяўленчае мастацтва: Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя. – Мн.: «Таварыства беларускай школы», 2015. С. 3–45.

Навучэнцам прапанавана прааналізаваць асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Беларусі ў часы «адлігі» 1953–1964 гг., пасля смерці І. В. Сталіна і падчас знаходжання на чале кіраўніцтва СССР М. С. Хрушчова. Разгледжана роля камуністычнай партыі ў жыцці грамадства. Высняецца гістарычнае значэнне даклада М. С. Хрушчова на XX з'езде КПСС з крытыкай культу асобы Сталіна і звязаных з рэалізацыяй гэтага даклада мерапрыемствах ва ўсіх сферах жыцця. Зроблена ацэнка рашэнняў, прынятых на XXII з'ездзе КПСС, разгледжаны працэс фарміраванне прамысловага комплексу і развіцця розных галін сельскай гаспадаркі БССР.

Разгледжана сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё БССР у 1965–1985 гг. Вызначаны прычыны згортвання лібералізацыі ў дзяржаўным і палітычным жыцці, прычыны пачатку «застою» у эканоміцы і наспявання эканамічнага крызісу. Асветлены змест, парадак ажыццяўлення і вынікі эканамічнай рэформы 1965 г., яе ўплыў на ўзровень жыцця народа. Разгледжана палітыка дзяржавы ў дачыненні да грамадскіх, палітычных і рэлігійных арганізацый.

Пры разглядзе тэмы аб сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным развіцці БССР у 1985–1990 гг. упор зроблены на ацэнку так званага курса на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і на палітыку перабудовы і пачатку дэмакратызацыі грамадства. Даецца ацэнка ўплыву на эканамічнае, сацыяльнае і дэмаграфічнае жыццё Беларусі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Важнейшымі ў плане нацыянальна-патрыятычнага выхавання з'яўляюцца тыя раздзелы, дзе разглядаюцца дзяржавабудаўнічыя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Разглядаецца развіццё нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Беларусі, аналізуецца правядзенне і вынікі першых дэмакратычныя выбараў у Беларусі, ацэньваецца працэс узнікнення і дзейнасці першых палітычных партый

у Беларусі ў другой палове XX ст. Разгледжаны рух за дзяржаўны суверэнітэт Беларусі, падрыхтоўка і прыняцце 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, прыпыненне дзейнасці Кампартыі Беларусі, наданне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 25 жніўня 1991 г. статусу Канстытуцыйнага закона.

У тэме «Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь (1991–1996 гг.)» разгледжаны палітычныя і эканамічныя падзеі першых гадоў незалежнасці, а таксама стварэнне СНД і развіццё міжнародных кантактаў, прыняцце 15 сакавіка 1994 г. Канстытуцыі і выбары першага Прэзідэнта Беларусі, станаўленне палітычнай сістэмы Беларусі.

Пры вывучэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 1996–2016 гг. разгледжана так званая беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця – сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка і ход яе рэалізацыі, пытанні эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з Расіяй, міжнароднага эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва.

Прааналізавана дзейнасць Беларусі на міжнароднай арэне ў 1996–2016 гг., вызначаны асноўныя напрамкі знешняй палітыкі дзяржавы. Разгледжаны працэс фарміравання знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь, узаемаадносіны з Расійскай Федэрацыяй і Еўрапейскім Саюзам, роля Беларусі у міжнародных арганізацыях, СНД, ЕўрАзЭС.

Асобныя тэмы прысвечаны развіццю культуры, навукі, адукацыі і спорту ў Беларусі ў 1996–2016 гг. У прыватнасці, прааналізаваны асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, разгледжана развіццё культуры Беларусі ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту, фарміраванне нацыянальнай сістэмы адукацыі, развіццё навукі, літаратуры, тэатра, кіно, музыкі, выяўленчага мастацтва, фізкультуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь, узаемадзеянне дзяржавы і канфесій.

У асобнай, завяршальнай тэме «Эвалюцыя палітычнай сі-

стэмы Беларусі 1996–2014 гг. Канстытуцыйнае будаўніцтва» разгледжаны пытанні арганізацыі дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў краіне, дзейнасці органаў заканадаўчай і выканаўчай улады, умовы функцыянавання палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі, іх роля і месца ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Эвалюцыя грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. Зроблены агляд усенародных галасаванняў – рэферэндумаў, якія адбыліся ў Беларусі ў 1995–2004 гг., аналіз прэзідэнцкіх выбараў 1994, 2001, 2006, 2010 і 2015 гг., дзейнасці Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне.

У выніку засваення вучэбнага «Гісторыя Беларусі 1945 – 2016 гг. (ад завяршэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы)» курса навучэнцы павінны

– засвоіць асноўныя факталагічныя і тэарэтычныя веды аб найважнейшых падзеях, з'явах, працэсах і заканамернасцях на шляху да пабудовы суверэннай беларускай дзяржавы ў сярэдзіне XX – пачатку XXI ст., аб грамадскіх і палітычных арганізацыях, асобах, якія мелі непасрэднае дачыненне да атрымання Рэспублікай Беларусь рэальнага эканамічнага і палітычнага суверэнітэту;

– валодаць ведамі аб асноўных дасягненнях беларускага народа ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры ў XX – першай палове XXI ст.;

– вызначаць асноўныя этапы і формы станаўлення і афармлення беларускай дзяржаўнасці ў XX – першай палове XXI ст.;

– разумець асаблівасці і складанасці нацыянальна-дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускага народа ў складзе СССР;

– усведамляць, што на працягу XX – пачатку XXI ст. беларусы рэалізавалі вышэйшую, нацыянальную форму дзяржаўнасці, у адрозненне ад ранейшых яе гістарычных форм (у складзе Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі);

– умець характарызаваць і ацэньваць дзейнасць палітычных, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў культуры;

– мець цэласнае ўяўленне пра ролю і месца Беларусі ў сусветна-гістарычным працэсе, усведамляць своеасаблівасць шляху да незалежнасці беларускага народа, тое, што ў другой палове XX – пачатку XXI ст. беларусы змаглі рэалізаваць уласную мадэль цывілізацыйнага развіцця;

– адчуваць адказнасць за далейшы гістарычны лёс беларускага народа і беларускай дзяржавы;

– ацэньваць месца і ролю Беларусі ў геапалітычных працэсах XX – першай паловы XXI ст.

## ЛІТАРАТУРА ДА ЎСІХ ТЭМ

1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа; Экоперспектива, 2011.
2. Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. – пачатак XXI ст. Хрэстаматыя. / Укл. В. М. Фамін і інш. – Мн.: Народная асвета, 2009.
3. *Мірановіч, Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі. / Навук. рэд. А. Краўцэвіч. – С.-Пецярбург: Неўскі прасцяг, 2003.
4. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

## Тэма 1. Беларусь ў перыяд пасляваеннага аднаўлення (1945–1953 гг.)

Тэрытарыяльныя, эканамічныя і людскія страты Беларусі ў выніку Другой сусветнай вайны. Падпісанне Беларуссю Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ААН. Аднаўленне эканомікі па меры вызвалення тэрыторыі Беларусі: з восені 1943 г. ў вызваленай частцы Гомельскай вобласці, са жніўня 1944 г. – на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Чацвёрты пяцігадовы план (1946–1950) аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі. Крыніцы гаспадарчага аднаўлення. Асаблівасці аднаўлення прамысловасці Беларусі. Рээвакуацыя. Рэпарацыі. Прамысловае будаўніцтва. Аграрная палітыка. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Адмена картачак на прадукты харчавання. Пяты пяцігадовы план (1951–1955). Рэпрэсіі. Таталітарызм. Саветызацыя Заходняй Беларусі. Сацыялістычны рэалізм. Прынцып партыйнасці. Пасляваенная хваля палітычных рэпрэсій. М. Улашчык, У. Дубоўка, С. Грахоўскі. Барацьба з «касмапалітызмам». Аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыі, навукі і культуры. Ваенная тэма ў культуры. Партызанскі раман (І. Шамякін). Тэатр (А. Кучар, А. Маўзон). Выяўленчае мастацтва (Я. Зайцаў, В. Волкаў).

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)*** – міжнародная арганізацыя, заснаваная ў 1945 г. для падтрымання і ўмацаван-

ня міжнароднага міру і бяспекі, развіцця супрацоўніцтва паміж дзяржавамі. Цяпер у ААН уваходзяць 192 дзяржавы.

***Касмапалітызм*** – светапогляд, прадстаўнікі якога не лічаць сябе прыналежнымі да якой-небудзь нацыянальнасці ці краіны, а прызнаюць сваёй Айчынай увесь свет, спавядаюць ідэю сусветнага грамадзянства. Па-сутнасці, гэта ідэалогія, якая адмаўляе дзяржаўны і нацыянальны суверэнітэт і прапаведуе адмаўленне ад нацыянальных традыцый, нацыянальнай культуры, патрыятызму.

***Ідэалогія*** – сістэма поглядаў, у якой усведамляюцца і ацэньваюцца адносіны людзей да рэчаіснасці і адзін да аднаго, якая выказвае інтарэсы розных сацыяльных класаў, палітычных і нацыянальных супольнасцяў і да т. п.

***Пасляваеннае аднаўленне*** – перыяд развіцця, звязаны з пераадоленнем наступстваў ваенных разбурэнняў, нанесеных Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны.

***Рэпарацыі*** (лац. reparatio – аднаўленне) – поўная ці частковая кампенсацыя, выплата дзяржавай, якая распачала вайну, грашовай або іншага віду кампенсацыі тым дзяржавам, якія пацярпелі ад агрэсіі.

***Рээвакуацыя*** – вяртанне ў месцы першапачатковага знаходжання людзей, прадпрыемстваў, маёмасці, якія былі вывезены ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі, стыхійнымі бедствамі і інш.

***Саветызацыя*** – уніфікацыя грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў пасляваенны перыяд з астатняй тэрыторыяй БССР.

***Сацыялістычны рэалізм*** – мастацкі метад, які патрабаваў адлюстравання ў літаратуры і мастацтве рэалій жыцця («праўдзівае і гістарычна-канкрэтнае адлюстраванне рэчаіснасці»), якія былі звязаныя з пабудовай сацыялізму ў СССР. Некрытычны метад, які навязваўся творцам ідэолагамі пануючай камуністычнай партыі.

***Прынцып партыйнасці*** – строгае выкананне дзеячамі культуры і мастацтва партыйных загадаў і ўсхваленне камуністычнай ідэі.

***Светапогляд*** – сістэма поглядаў чалавека на свет (прыроду, людзей, грамадства), якія выражаюць яго асабістыя адносіны да навакольнай рэчаіснасці.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***26 чэрвеня 1945 г.*** – заснаванне ААН.

***2 верасня 1945 г.*** – капітуляцыя Японіі. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.

***1946 г.*** – па прапанове БССР Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю «Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў».

***Кастрычнік 1947 г.*** – на Мінскім аўтамабільным заводзе выпушчаны першыя самазвалы МАЗ-205.

***14 снежня 1947 г.*** – апублікавана пастанова Савета Міністраў СССР аб правядзенні ў СССР грашовай рэформы і адмене картачнай сістэмы забеспячэння насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі.

***1947 г.*** – выйшла паэма Якуба Коласа «Рыбакова хата», за якую ён атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР.

***1949 г.*** – эканоміка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню, а ў 1950 г. перавысіла яго.

***4 лістапада 1950 г.*** – на Мінскім трактарным заводзе пачаты серыйны выпуск трактароў КД-35.

***1950 г.*** – завяршылася калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.

***1951 г.*** – у сувязі з уваходжаннем БССР у склад ААН быў зацверджаны Дзяржаўны сцяг БССР у новым выглядзе.

***1951 г.*** – адмена ў школах БССР абавязковага экзамену па беларускай мове.

***19 верасня 1952 г.*** – у г. Мінску пачала функцыянаваць першая тралейбусная лінія.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У чым былі цяжкасці і поспехі аднаўленчага перыяду 1945–1953 гг. у Беларусі?

2. Якія былі асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця Беларусі ў пасляваенны перыяд?

3. Вызначце асноўны змест аграрнай палітыкі, якая праводзілася ў пасляваенны перыяд у Заходняй Беларусі.

4. З дапамогай атласа назавіце найбольш буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія былі пабудаваны ў БССР у 1945–1953 гг.

5. Што азначала неабходнасць для дзеячаў культуры прытрымлівацца прынцыпу партыйнасці ў сваёй творчасці?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ

1. *Адамушка, У. І.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. – Мн., 1994.
2. *Белязо, А. П.* Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945–1950 гг.). – Мн.: Выд-ва БДУ, 1974.
3. *Галубовіч, В. І.* і інш. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік. – Мн.: Экаперспектыва, 1999.
4. *Гиоргиадзе, З. И., Геращенко, Л. Ф.* Белоруссия за десять пятилеток. – Минск: Наука и техника, 1982.
5. *Грузіцкі, Ю. Л.* Грашовая рэформа 1947 г., яе перадумовы і вынікі // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі. Вып. 2. – Мн., 1999.
6. *Касцюк, М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 2000.
7. *Марченко, И. Е.* Промышленность и рабочий класс Советской Белоруссии в годы восстановления и развития народного хозяйства (1943–1950 гг.). – Минск: Академия наук БССР, 1968.
8. *Снапковский, В. Е.* Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.). – Мн.: Навука і тэхніка, 1985.
9. *Снапкоўскі, У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. 1944–1953 гг. – Мн.: Беларуская навука, 1997.

## Тэма 2. Беларусь ў часы палітычнай «адлігі» і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (1953–1964 гг.)

Смерць І. В. Сталіна і пачатак адноснай лібералізацыі савецкага грамадства. М. С. Хрушчоў – першы сакратар ЦК КПСС. Роля камуністычнай партыі ў жыцці дзяржавы. ХХ з'езд КПСС. Крытыка палітыкі масавых рэпрэсій і культу асобы Сталіна. Рэарганізацыя цэнтральнага апарату ўлады. К. Т. Мазураў – першы беларус, прызначаны першым сакратаром ЦК КПБ. Дэсталінізацыя. Рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР). Машынабудаванне, хімічная і нафтахімічная прамысловасць, энергетыка ў Беларусі. Рэформа кіравання эканомікай 1957 г. Саветы народнай гаспадаркі. Рэарганізацыя МТС. Асваенне цалінных зямель. Узмацненне ролі прафсаюзаў. ХХІІ з'езд КПСС. Праграма пабудовы камунізму. Знешняя палітыка. «Халодная вайна». Гонка ўзбраенняў. НАТА. Арганізацыя Варшаўскага дагавора. Канфесійная палітыка. Культура. Дыскусія аб ролі і месцы інтэлігенцыі ў грамадстве, аб праве на асабісты падыход пры асвятленні падзей рэчаіснасці. Тэма вайны ў мастацтве. В. Быкаў, А. Адамовіч, Я. Брыль. Беларускі гістарычны раман. Я. Колас, І. Мележ, У. Караткевіч. Тэатральнае мастацтва, музыка, выяўленчае мастацтва. Абмежаванне нацыянальных асаблівасцяў культуры беларусаў, скарачэнне сферы ўжывання беларускай мовы. Навука. Адукацыя. Умовы жыцця насельніцтва. Міжнароднае становішча Беларусі.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Адліга (хрушчоўская адліга)*** – неафіцыйнае абазначэнне перыяду ў гісторыі СССР пасля смерці І. Сталіна (сярэдзіна

1950-х – пачатак 1960-х гадоў). Характарызаваўся паслабленнем таталітарнай улады, з'яўленнем некаторай свабоды слова, адноснай дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага і жыцця, большай свабодай творчай дзейнасці. Назва звязаная са знаходжаннем на пасадзе Першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова.

***Арганізацыя Варшаўскага дагавора (Варшаўскі дагавор)*** – Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ад 14 мая 1955 года: дакумент, які аформіў стварэнне ваеннага саюза еўрапейскіх сацыялістычных дзяржаў пры вядучай ролі Савецкага Саюза як меры ў адказ на стварэнне НАТА.

Страціў моц з 1 ліпеня 1991 г.

***Валюнтарызм*** – (*ад лац. voluntas – воля*) – палітычны напрамак, пры якім воля кіруючай асобы лічыцца вызначальнай асновай грамадскага развіцця.

***Дэсталінізацыя*** – палітыка ў СССР, накіраваная на пераадоленне наступстваў культу асобы І. Сталіна. Звязана найперш з дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага жыцця і рэабілітацыяй нявінна пацярпелых ад палітычных рэпрэсій.

***Культ асобы*** – узвялічванне ролі аднаго чалавека ў жыцці дзяржавы, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей.

***Лібералізацыя*** (*ад лац. liberalis – вольны*) – паслабленне дзяржаўнага кантролю над рознымі відамі дзейнасці як і ў галіне эканомікі, так і ў сферы грамадскага жыцця.

***Навукова-тэхнічная рэвалюцыя*** – укараненне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць, якаснае пераўтварэнне прадукцыйных сіл на аснове навуковых дасягненняў.

***НАТА, Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавора, (англ. North Atlantic Treaty Organization, NATO)*** – заснавана 4 красавіка 1949 г. для абароны Еўропы ад савецкага ўплыву. Цяпер у НАТА ўваходзяць 28 краін. Галоўная мэта – за-

бяспечыць стрымліванне любой формы агрэсіі ў дачыненні да тэрыторыі любой дзяржавы – члена НАТА ці абарону ад такой агрэсіі.

***Рэабілітацыя*** – аднаўленне ў правах асуджанай асобы з прычыны адсутнасці ў яе дзеяннях складу злачынства.

***Рэпрэсіі*** – меры пакарання, незаконныя судовыя і пазасудовыя праследаванні, што ўжываліся камуністычнымі ўладамі супраць уласных грамадзян.

***Рэформа*** – пераўтварэнне, змена, перабудова асобных аспектаў эканомікі ці грамадскага жыцця пры захаванні асноў існуючага дзяржаўнага ладу.

***Саветы народнай гаспадаркі (саўнаргасы)*** – дзяржаўныя органы тэрытарыяльнага кіравання народнай гаспадаркай СССР, якія існавалі ў 1957–1965 гг.

***«Халодная вайна»*** – тэрмін, якім абазначаецца перыяд ваенна-палітычнай канфрантацыі дзяржаў супрацьлеглых сістэм, калі адкрытых ваенных сутыкненняў не адбываецца, але вядзецца гонка ўзбраенняў, ужываюцца спробы эканамічнага націску, арганізуюцца ваенна-палітычныя блокі і саюзы; ваенна-палітычная канфрантацыя груп дзяржаў пасля Другой сусветнай вайны, у першую чаргу СССР і ЗША

***Цаліна*** – неапрацаваныя, дагэтуль не ўключаныя ў гаспадарчае абарачэнне землі сельскагаспадарчага прызначэння.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***5 сакавіка 1953 г.*** – смерць Сталіна.

***Верасень 1953 г.*** – М. С. Хрушчоў абраны Першым сакратаром КПСС.

***1953–1964 гг.*** – першыя спробы дэсталінізацыі грамадства, палітыка лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР, якая атрымала назву «*адліга*».

***Сакавік 1954 г.*** – пачатак удзелу Беларускай ССР у асваенні цаліны.

***Люты 1956 г.*** – XX з’езд КПСС і пачатак дэсталінізацыі грамадства.

***12 мая 1954 г.*** – уступленне Беларускай ССР у арганізацыю ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКО).

***4 ліпеня 1954 г.*** – адкрыццё ў г. Мінску манумента Перамогі – помніка воінам Чырвонай Арміі і партызанам, якія загінулі ў баях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (архітэктары Г. Заборскі і У. Кароль, скульптары З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў).

***1955 г.*** – стварэнне Арганізацыі Варшаўскага дагавора.

***1955 г.*** – зацвярджэнне Дзяржаўнага гімна БССР (музыка Н. Сакалоўскага, словы – М. Клімковіча).

***14–25 лютага 1956 г.*** – ХХ з'езд КПСС – асуджэнне культу асобы Сталіна, ліквідацыя ГУЛАГ, пачатак рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

***1956–1964 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова.

***1956–1965 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ К. Т. Мазурава – першага беларуса, прызначанага кіраўніком КПБ.

***1956 г.*** – упершыню пачалі прызначацца калгаснікам пенсіі па старасці і інваліднасці.

***1957 г.*** – рэформа кіравання эканомікай – ліквідацыя міністэрстваў і стварэнне саўнаргасаў (Саветаў народнай гаспадаркі, створаных па галіноваму прынцыпу).

***Травень 1957 г.*** – пастанова Савета Міністраў БССР аб удакладненнях і частковых зменах беларускага правапісу.

***5 лістапада 1958 г.*** – выпуск першага аўтамабіля «БелАЗ» (г. Жодзіна).

***Кастрычнік 1961 г.*** – на ХХІІ з'ездзе КПСС была прынята праграма пабудовы камунізму ў СССР да пачатку 1980-х гадоў.

***1964 г.*** – закон «Аб пенсіях і дапамозе членам калгасаў».

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дайце характарыстыку гаспадарчага развіцця Беларусі ў 1953–1964 гг. у галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

2. Што сведчыла аб тым, што Беларусь ператварылася з аграрна-індустрыяльнай краіны ў індустрыяльную?

3. Якія былі прычыны і ў чым палягаў галоўны сэнс праводзення палітыкі рэабілітацыі людзей, нявінна асуджаных у часы сталінскай дыктатуры?

4. Чаму палітыка лібералізацыі грамадскага жыцця, распачатая М. С. Хрушчовым была згорнутая пасля яго адстаўкі?

5. У чым праўда пра вайну ў творах Васіля Быкава не супадала з лініяй афіцыйнай прапаганды?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. *Аксютин, Ю. В., Волобуев, О. В.* XX съезд КПСС: новации и догмы. – Москва, 1991.
2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
3. *Гиоргиадзе, З. И., Геращенко, Л. Ф.* Белоруссия за десять пятилеток. – Мн.: Наука и техника, 1982.
4. *Сасим, А. М.* Советская экономическая система (1953–1964): Попытки реформирования. – Мн., 2001.
5. *Лыч, Л. М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). – Мн., 2009.
6. *Мядзведзеў, Р.* М. С. Хрушчоў. Палітычны партрэт. – Мн.: Беларусь, 1989.
7. *Несцяровіч, М. Б.* Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4.
8. *Разуваева, Н. Н.* Супярэчнасці і цяжкасці сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1961–1985 гг. // Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі. – Мн.: Народная асвета, 1990.
9. *Станишевский, В.* Боль сквозь годы: свидетельства жертв политических репрессий в 1930–1950 годах. – Мн., 2004.

## Тэма 3. Эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё БССР у 1965–1985 г.

Адстаўка М. С. Хрушчова. Пераход ад адноснай лібералізацыі грамадства да кансервацыі папярэдняй мадэлі эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця. Л. І. Брэжнеў – Генеральны сакратар ЦК КПСС. Эканамічная і палітычная сутнасць эпохі «застою». Спыненне палітычнай рэабілітацыі. Канстытуцыя СССР 1977 г. і Канстытуцыя БССР 1978 г. П. М. Машэраў – першы сакратар ЦК КПБ. Эканамічная рэформа А. М. Касыгіна 1965 г.: ліквідацыя саўнаргасаў і замена іх міністэрствамі, павышэнне закупачных цэн на прадукцыю сельскай гаспадаркі, увядзенне гаспадарчага разліку. Ваенна-прамысловы комплекс. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Аграпрамысловыя комплексы. Меліярацыя. Экстэнсіўны шлях развіцця. «Харчовая праграма». Пагаршэнне экалагічнай сітуацыі. Прафсаюзы – «школа камунізму». Правал праграмы пабудовы камунізму. Развіты сацыялізм. Дысідэнцтва. XXIV з’езд КПСС. Новая супольнасці людзей – «савецкі народ». Усеагульная сярэдняя адукацыя. Супярэчнасці ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці грамадства ў эпоху «застою». Зліццё партыйнага апарату з дзяржаўным – наменклатура. Пагаршэнне становішча насельніцтва. Генеральныя сакратары ЦК КПСС Ю. У. Андропаў і К. У. Чарненка. Пачатак глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Аграпрамысловы комплекс*** – сукупнасць галін народнай гаспадаркі, якія забяспечваюць вытворчасць прадуктаў харчавання і прамысловых вырабаў з сельскагаспадарчай сыравіны, а таксама рэалізацыю іх спажыўцам.

***Дысідэнты (іншадумцы)*** – людзі, якія адстойваюць свае погляды, якія радыкальна разыходзяцца з пануючай ідэалогіяй.

***Інтэнсіўны шлях*** – шлях развіцця прамысловасці, звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, перш за ўсё ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павелічэння прадукцыйнасці працы.

***Інтэнсіфікацыя вытворчасці*** – развіццё вытворчасці на аснове выкарыстання больш эфектыўных сродкаў вытворчасці, тэхналагічных працэсаў, перадавых метадаў арганізацыі працы, дасягненняў навукова тэхнічнага прагрэсу.

***Меліярацыя*** (лац. melioratio – паляпшэнне) – комплекс гідратэхнічных і гаспадарча-арганізацыйных мерапрыемстваў, накіраваных на карэннае паляпшэнне зямельных рэсурсаў з мэтай іх найбольш эфектыўнага выкарыстання.

***Савецкі народ*** – «новая гістарычная супольнасць людзей», аб узнікненні якой было заяўлена на XXIV з’едзе КПСС у 1971 г.

***Экстэнсіўны шлях*** – спосаб развіцця эканомікі за кошт пашырэння вытворчасці і прыцягнення дадатковых капіталаў і працоўных рук.

***Эпоха застою*** **–** абазначэнне перыяду «развітога сацыялізму» які доўжыўся з 1964 па 1986 гг. Характарызаваўся кансерватызмам у грамадскім жыцці і сферы эканомікі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1965 г.*** – гаспадарчая рэформа, ініцыятарам якой быў старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін; пачатак пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік.

***8 мая 1965 г.*** – прысваенне Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой».

***1965–1985 гг.*** – перыяд «застою» ў сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці СССР.

***1965–1980 гг.*** – знаходжанне на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава.

***1965–1982 гг.*** – знаходжанне на пасадзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева.

***1967 г.*** – Л. І. Брэжнеў заявіў аб пабудове ў СССР *развітога сацыялізму.*

***5 ліпеня 1969 г.*** – адкрыццё мемарыяльных комплексаў «*Хатынь*» (скульптар С. Селіханаў, архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Левін) і «*Курган Славы*» (скульптары А. Бембель, А. Арцімовіч, архітэктары А. Стаховіч, Л. Міцкевіч, інжынер В. Лапцэвіч).

***1960-я–1980-я гг.*** – шырокія меліярацыйныя работы на Палессі.

***25 верасня 1971 г.*** – адкрыццё мемарыяльнага комплексу «*Брэсцкая крэпасць-герой*» (скульптары А. Кібальнікаў, А. Бембель, У. Бабыль, архітэктары У. Кароль, В. Волчак, Г. Сысоеў, В Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч).

***1971 г.*** – XXIV з’езд КПСС. Л. І. Брэжнеў заявіў аб узнікненні ў Савецкім Саюзе новай гістарычнай супольнасці людзей – «*савецкі народ*».

***1972 г.*** у г. Мінску ўзведзены помнікі Якубу Коласу (скульптар З. Азгур) і Янку Купалу (скульптары А. Анікейчык і Л. Гумілеўскі).

***1972 г.*** – пачатак будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі (БАМ).

***15 чэрвеня 1977 г.*** – пачатак будаўніцтва ў г. Мінску метрапалітэна.

***14 красавіка 1978 г.*** – прыняцце *чацвёртай Канстытуцыі Беларускай ССР*.

***27 снежня 1979 г.*** – увядзенне савецкіх войск у Афганістан. За 10 гадоў вайны савецкія войскі страцілі там 15 тысяч чалавек, у тым ліку каля 800 чалавек з Беларусі.

***1982 г.*** – распрацоўка і прыняцце «*Харчовай праграмы*» СССР,

пачатак фарміравання аграпрамысловых комплексаў (АПК).

***30 чэрвеня 1984 г.*** – адкрыццё першай лініі Мінскага метрапалітэна.

***Красавік 1985 г.*** – на Пленуме ЦК КПСС быў аб'яўлены курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і дэмакратызацыю палітычнага жыцця, які атрымаў назву *перабудовы*.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дайце ацэнку гаспадарчай рэформы 1965 г. у Беларусі паводле наступных палажэнняў: перадумовы, сутнасць, гістарычныя ўрокі.

2. Чым, на вашу думку, было выклікана нарастанне крызісных з'яў у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці БССР у 1970-я гады?

3. Растлумачце сутнасць паняццяў «дэфіцыт» і «застой».

4. Пісьмова складзіце адказы на пытанне: «Якія змены адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці СССР і БССР пасля адстаўкі М. С. Хрушчова?»

5. Дакажыце ці абвергніце наступны тэзіс: «Экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі немінуча вёў да гаспадарчага крызісу».

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
2. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.
3. *Галубовіч, В. І.* Перадумовы, сутнасць і гістарычныя ўрокі гаспадарчай рэформы 1965 г. // З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі. Вып. 2. – Мн., 1999.

4. *Гиоргиадзе, З. И., Геращенко, Л. Ф.* Белоруссия за десять пятилеток. – Мн.: Наука и техника, 1982.
5. Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст. – Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999.
6. *Несцяровіч, М. Б.* Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4.
7. *Разуваева, Н. Н.* Супярэчнасці і цяжкасці сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1961–1985 гг. // Старонкі гісторыі савецкага грамадства: Факты, праблемы, людзі. – Мн.: Народная асвета, 1990.
8. *Сакович, В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития. – Мн.: Белорусская наука, 2008.
9. *Сасим, А. М.* Промышленность Беларуси в годы «развитого социализма» (1965–1984). – Мн., 2001.

## Тэма 4. Беларусь у 1985–1990 г.: пачатак нацыянальнага і дзяржаўнага адраджэння

Красавіцкі 1985 г. Пленум ЦК КПСС. Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Студзеньскі (1987 г.) Пленум ЦК КПСС. Абвяшчэнне палітыкі перабудовы ўсіх сфер жыцця ў Савецкім Саюзе. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця і радыкальная эканамічная рэформа. Палітыка галоснасці, фарміраванне перадумоў шматпартыйнасці. Закон «Аб грамадскіх аб’яднаннях»1990 г. Ліквідацыя манаполіі КПСС на ўладу. Правядзенне альтэрнатыўных выбараў. Спроба перабудовы эканомікі на прынцыпах гаспадарчага разліку і самафінансавання.

Беларусь як «Вандэя перабудовы». Беларускі народны фронт «Адраджэньне». Курапаты. Пачатак станаўлення шматпартыйнай сістэмы ў БССР. Палітычныя партыі Беларусі. Выбары 1990 г. у Вярхоўны Савет БССР. Парламенцкая апазіцыя БНФ. Стан эканомікі і сельскай гаспадаркі. Агульнарэспубліканская комплексная праграма «Інтэнсіфікацыя». Катастрофа на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Крызісныя з’явы: падзенне прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, паліўны, энергетычны, транспартны крызіс, дэфіцыт тавараў першай неабходнасці, інфляцыя, рост унутранага і знешняга доўгу, абясцэньванне грошай і рост натуральнага абмену. Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бартар*** – натуральны тавараабмен, пры якім адна рэч ці тавар мяняецца на іншы без аплаты грашыма, гандлёвая здзелка па схеме «тавар за тавар».

***Галоснасць*** **–** палітыка ў часы перабудовы, магчымасць адкрыта выказваць свае думкі і погляды наконт усіх пытанняў сучаснасці і гістарычнага мінулага; даступнасць для грамадства звестак пра дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання.

***Гаспадарчы разлік*** – метад гаспадарання, пры якім даходы, якія атрымлівае прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, пакрываюць яго выдаткі на вытворчасць гэтай прадукцыі.

***Інфляцыя*** – абясцэненне грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў; падзенне пакупніцкай здольнасці грошай.

***Перабудова*** **–** агульная назва новага курсу савецкага партыйнага кіраўніцтва, сукупнасці палітычных і эканамічных змен, якія адбываліся ў СССР з 1987 па 1991 гг.

***Самафінансаванне*** – метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржаўнага бюджэту, а зарабляе грошы самастойна, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі выпушчанай прадукцыі.

***Суверэнітэт*** – поўная незалежнасць дзяржавы ў пытаннях унутранай і знешняй палітыкі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1985–1991 гг.*** – палітыка перабудовы ў СССР.

***26 красавіка 1986 г.*** – катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.

***1986–1990 гг.*** – першы этап эканамічнай рэформы – перавод прадпрыемстваў на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Чаканых станоўчых вынікаў не даў.

***Чэрвень 1987 г.*** **–** Пленум ЦК КПСС – курс на *перабудову* грамадства і ўсталяванне *дэмакратычнага сацыялізму.*

***3 чэрвеня 1988 г.*** – публікацыя ў газеце «Літаратура і мастацтва» артыкула З. Пазняка і Я. Шмыгалёва «Курапаты – дарога смерці».

***19 кастрычніка 1988 г.*** – стварэнне Рэспубліканскага гісто-

рыка-асветніцкага таварыства памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій «Мартыралог Беларусі». Утварэнне аргкамітэта Беларускага народнага фронту «Адраджэньне» (БНФ).

***30 кастрычніка 1988 г.*** – масавыя мітынгі памяці ахвяр сталінізму ў дзень памяці «Дзяды» калі Усходніх могілак у г. Мінску і каля ўрочышча Курапаты пад г. Мінскам.

***15 лютага 1989 г.*** – канец вайны ў Афганістане. Пачатак вываду савецкіх войск.

***26 сакавіка 1989 г.*** – выбары народных дэпутатаў СССР, якія ўпершыню праходзілі як адносна свабодныя і альтэрнатыўныя.

***24 – 25 чэрвеня 1989 г.*** – устаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту «Адраджэньне» (БНФ) у г. Вільнюсе – першай альтэрнатыўнай камуністычнай ідэалогіі палітычнай сілы ў Беларусі.

***Кастрычнік 1989 г.*** – на Архірэйскім саборы РПЦ у Маскве было прынятае рашэнне аб утварэнні Беларускага экзархата Маскоўскага патрыярхату – утварэнне Беларускага Экзархата Рускай праваслаўнай царквы.

***1989 г.*** – Вярхоўны Савет БССР ухваліў распрацаваную ўрадам рэспублікі доўгатэрміновую Дзяржаўную праграму ліквідацыі ў БССР вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**26 студзеня 1990 г. –** Вярхоўны Савет БССР прыняў закон «Аб мовах у Беларускай ССР», які ўстанавіў, што дзяржаўнай мовай Беларусі з'яўляецца беларуская мова. Разам з тым, закон прадугледжваў права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін, свабоднае развіццё і ўжыванне іншых нацыянальных моў.

***Сакавік 1990 г.*** – Трэці з'езд народных дэпутатаў СССР. Адмена 6-га артыкула Канстытуцыі СССР (аб кіруючай і накіроўнай ролі камуністычнай партыі) і ўвядзенне пасады Прэзідэнта СССР.

***4 сакавіка 1990 г.*** – выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII склі-

кання. Прыхільнікі дэмакратычных пераўтварэнняў утварылі ў Вярхоўным Савеце парламенцкую апазіцыю, якая была прадстаўлена Беларускім народным фронтам «Адраджэньне».

***27 ліпеня 1990 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў «Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Параўнайце лібералізацыю часоў «адлігі» і дэмакратызацыю часоў перабудовы ў грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці БССР. Зрабіце высновы.
2. Дакажыце, што палітыка перабудовы садзейнічала дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.
3. Дакажыце ці абвергніце наступны тэзіс: «Дэфіцыт на тавары народнагша спажывання ў СССР быў у многім выкліканы пераважным развіццём цяжкой прамысловасці і выпуску прадукцыі ваеннага прызначэння (ВПК)».
4. Дайце характарыстыку гаспадарчага развіцця Беларусі ў 1985–1990 гг. у галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі.
5. Якія палітычныя партыі ўзніклі ў Беларусі ў 1985–1990 гг.?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ

1. Апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце XII склікання: Дакументы, факты, каментарыі. / Укл. і камент. А. В. Кур’яновіча. – Смаленск: Інбелкульт, 2015.
2. *Бабосов, Е. М.* Чернобыльская трагедия в ее социальных измерениях. – Мн.: Право и экономика, 1996.
3. Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946–2006 гг.: манаграфія / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2007.
4. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
6. *Лыч, Г. М., Патеева, З. Г.* Чернобыльская катастрофа: социально-экономические проблемы и пути их решения. – Мн., 1991.
7. *Несцяровіч, М. Б.* Эканоміка Беларусі ў кантэксце развіцця савецкай і сусветнай эканомік (1951–1990 гг.) // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2007. № 4.
8. *Новік, Я. К., Жданко, Л. Ю.* Беларусь у перыяд правядзення рэформ: сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця (1985–1995). – Мн., 1995.
9. *Сакович, В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития. – Мн.: Белорусская наука, 2008.

## Тэма 5. Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь (1991–1995 гг.)

Законы Беларускай ССР «Аб грамадскіх аб'яднаннях», аб уласнасці, сялянскай (фермерскай гаспадарцы). Прыняцце Вярхоўным Саветам Беларускай ССР пастановы «Аб пераходзе да рыначных адносін». Красавік 1991 г. – забастоўкі, дэманстрацыі, мітынгі, выкліканыя спадам вытворчасці, павышэннем цэн на прадукты харчавання, высокім узроўнем інфляцыі, пагаршэннем умоў жыцця. Стварэнне Мінскага гарадскога страйкавага камітэту, які, разам з эканамічнымі, вылучыў і палітычныя патрабаванні. 17 сакавіка 1991 г.: рэферэндум па пытанні аб захаванні СССР. Жнівеньскі 1991 г. путч у Маскве і спроба дзяржаўнага перавароту, накіраванага супраць палітыкі перабудовы. Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП). Прыняцце Вярхоўным Саветам Беларускай ССР закона «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Дэпартызацыя, часовае прыпыненне дзейнасці КПБ – КПСС. 25 жніўня 1991 г.: закон «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР». Перавод усіх прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў саюзнага падпарадкавання, што размяшчаліся на тэрыторыі БССР, ва ўласнасць рэспублікі. Прыняцце 19 верасня 1991 г. закона аб назве дзяржавы – Рэспубліка Беларусь. Зацвярджэнне гістарычнай дзяржаўнай сімволікі. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). «Белавежскія пагадненні». Дэнансацыя дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР. 15 сакавіка 1994 г.: прыняцце Вярхоўным Саветам Канстытуцыі РБ. Прэзідэнт – кіраўнік дзяржавы. 23 чэрвеня і 10 ліпеня 1994 г. – два туры

прэзідэнцкіх выбараў. Перамога А. Р. Лукашэнкі. Рэферэндум 14 мая 1995 г., ініцыяваны А. Р. Лукашэнкам, аб наданні рускай мове статусу роўнага з беларускай, усталяванні новага (не нацыянальнага) ўзору дзяржаўнага сцяга і герба, стаўленні да палітыкі прэзідэнта, скіраванай на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Апазіцыя*** *(ад лац. oppositio – супрацьпастаўленне, пярэчанне)* – нязгода, супрацьпастаўленне адных поглядаў, палітыкі іншым; таксама агульная назва партый, арганізацый, грамадскіх рухаў і аб’яднанняў, дзейнасць і погляды якіх супрацьпастаўлены пануючай у грамадстве думцы.

***Дэнансацыя*** – паведамленне адной дзяржавы другой аб скасаванні дзеяння падпісанага паміж імі дагавора.

***Путч*** – дзяржаўны пераварот з удзелам невялікай групы змоўшчыкаў (тайная спроба перавароту, якая не ажыццявілася).

***Ратыфікацыя*** – зацверджанне органамі вярхоўнай дзяржаўнай улады міжнароднага дагавора альбо пагаднення, пасля чаго гэты дакумент набывае юрыдычную (прававую) сілу.

***Рэферэндум*** – усенароднае галасаванне па важнейшых пытаннях эканамічнага і сацыяльна-палітычнага жыцця краіны.

***Унітарная дзяржава*** – форма дзяржаўнага ўтварэння, калі краіна з’яўляецца адзінай, непадзельнай з пункту гледжання нацыянальна-дзяржаўнай арганізацыі, падзяляецца на штучна створаныя адміністрацыйныя адзінкі і не мае ў сваім складзе федэратыўных утварэнняў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Кастрычнік 1990 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб грамадскіх аб’яднаннях».

***Кастрычнік 1990 г.*** – прыняцце Вярхоўным Саветам Бела-

рускай ССР пастановы «Аб пераходзе да рыначных адносін».

***3–4 красавіка 1991 г.*** – забастоўкі ў Мінску.

***17 сакавіка 1991 г.*** – рэферэндум па пытанні захавання СССР.

***19–21 жніўня 1991 г.*** – путч у г. Маскве супраць палітыкі перабудовы.

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання Беларускай ССР, дзяржаўных прадпрыемстваў, установаў, арганізацый і нацыяналізацыі ўласнасці Камуністычнай партыі Беларусі» і пастанову «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ – КПСС на тэрыторыі БССР».

***25 жніўня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР», згодна з якім усе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, што размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, пераводзіліся ва ўласнасць Беларускай ССР.

***19 верасня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў закон «Аб назве Беларускай ССР», у адпаведнасці з якім дзяржава пачала называцца Рэспубліка Беларусь, а ў скарочаным варыянце – Беларусь. Была зацверджана новая дзяржаўная сімволіка: у якасці дзяржаўных сімвалаў прынятыя нацыянальны бела-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».

***8 снежня 1991 г.*** – Віскулёўскія (Белавежскія) пагадненні аб дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР і прыняцці рашэння аб стварэнні Садружнасці Незалежных дзяржаў (СНД).

***10 снежня 1991 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь

ратыфікаваў «Пагадненне аб спыненні існавання СССР і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)». Адначасова была прынята пастанова «Аб дэнансацыі (скасаванні) Дагавора аб утварэнні СССР ад 1922 г.».

***15 сакавіка 1994 г.*** – прыняцце Вярхоўным Саветам Рэспублікі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

***23 чэрвеня 1994 г.*** – першы тур выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***10 ліпеня 1994 г.*** – другі тур выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з удзелам В. Ф. Кебіча і А. Р. Лукашэнкі. Прэзідэнтам краіны абраны А. Р. Лукашэнка.

***30 верасня 1994 г.*** – Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь прынята Праграма неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу, прапанаваная прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам. З аднаго боку, гэтая Праграма была дастаткова радыкальная: яна прадугледжвала лібералізацыю цэнаўтварэння, аслабленне падаткаў, прыватызацыю, а з другога – дэкларараваўся строгі кантроль за прыватнай гаспадарчай дзейнасцю. Эканамічнай стратэгіяй краіны быў абвешчаны «рыначны сацыялізм», а спосабам вырашэння задач – дысцыпліна на ўсіх узроўнях вытворчасці.

***14 мая 1995 г.*** – выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму. У рэферэндуме ўзялі ўдзел 64,8% правамоцных грамадзян Беларусі. Паводле афіцыйных звестак, за прапанову аб наданні рускай мове статусу роўнага з беларускай выказалася 83,3% тых, хто прыняў удзел у галасаванні; за ўсталяванне новага (не нацыянальнага) узору дзяржаўнага сцяга і герба выказалася адпаведна 75,1%; за падтрымку палітыкі прэзідэнта, накіраваную на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй – 83,3%.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як Вы думаеце, ці ўсе пытанні жыцця краіны могуць выносіцца на ўсенароднае галасаванне (рэферэндум)? Абгрунтуйце свой адказ.

2. У чым палягае адрозненне паміж рынкавымі і камандна-адміністрацыйнымі адносінамі адносінамі ў эканоміцы? Якія з іх, на Ваш погляд, больш эфектыўныя?

3. Пісьмова складзіце табліцу: «Асноўныя падзеі на шляху да ўтварэння суверэннай беларускай дзяржавы: 1917–1991 гг.»

4. Назавіце мерапрыемствы, звязаныя з пошукам шляхоў пераходу да рыначных адносін у пачатку 1990-х гг.

5. Як змянілася арганізацыя дзяржаўнага ладу ў Беларусі пасля прыняцця Канстытуцыі 15 сакавіка 1994 г.?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ

1. Беларусь у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах 1946 – 2006 гг.: манаграфія. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2007.
2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
3. *Голубеў, В. Ф.* З гісторыі канстытуцыйнага будаўніцтва ў Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 30, Беласток, 2008. – С. 178–206.
4. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.
5. *Василевич, Г. А.* Референдумы в Беларуси и ее путь к независимости в конце XX столетия. – Мн., 2001.
6. *Новік, Я. К., Жданко, Л. Ю.* Беларусь у перыяд правядзення рэформ: сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця (1985–1995). – Мн., 1995.
7. *Шимов, В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. – Мн., 2003.

## Тэма 6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1994–2016 гг.

Пачатак развіцця самастойнай эканомікі. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. Першыя прэзідэнцкія выбары. Праграма радыкальных эканамічных рэформ, барацьба з карупцыяй, цеснае эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй. Рэалізацыя праграмы – падпісанне 2 красавіка 1996 г. і 2 красавіка 1997 г. у Маскве было падпісана пагадненняў аб стварэнні спачатку Супольнасці, а потым Саюза Беларусі і Расіі. 8 снежня 1999 г. – Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця на 1996–2000 гг. Палітыка будаўніцтва сацыяльна-арыентаванай дзяржавы на дэклараваных прынцыпах канстытуцыйных гарантый асабістых правоў і свабод грамадзян, свабоды прадпрымальніцтва, выбару прафесіі і месца працы, роўнасці ўсіх формаў уласнасці, гарантыі яе недатыкальнасці і выкарыстання ў інтарэсах асобы і грамадства, забеспячэння ўзаемасувязі дабрабыту работніка і вынікаў яго працы, сацыяльнай абароны непрацаздольных і іншых сацыяльна малаабароненых пластоў насельніцтва, сацыяльнага партнёрства (паміж дзяржавай, прафсаюзамі і саюзамі прадпрымальнікаў). «Беларуская мадэль» дзяржавы. – захаванне некаторых сацыяльных гарантыі для народа з выкарыстаннем рынкавых механізмаў для павышэння эфектыўнасці эканамічнай сістэмы, яе ўспрымальнасці да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг. Праграма павышэння эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу да 2005 г. – ліквідацыя збожжавай залежнасці краіны. Захаванне на вёсцы буйнатаварнай вытворчасці (мадэрнізаваных калгасаў), пашырэнне на-

вукаёмістых тэхналогій, выкарыстанне палепшаных сартоў насення і парод жывёлы. 22 чэрвеня 2004 г. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. Эканамічная інтэграцыя з краінамі СНД і з Расіяй. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гг., 2011–2015 гг., 2016–2020 гг.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС)*** – міжнароднае інтэграцыйнае эканамічнае аб'яднанне, створанае на базе Мытнага саюза ЕўрАзЭС, які існаваў да 2014 года.

***Інтэграцыя*** – (integratio – аднаўленне, папаўненне), працэс і вынік узаемасувязі, узаемадзеяння, збліжэння і аб'яднання ў адзінае цэлае якіх-небудзь частак, элементаў – краін, іх эканомік, сацыяльных і палітычных структур, культур, сацыяльных і палітычных груп, партый, рухаў, арганізацый і г. д.

***Планавая эканоміка*** – від эканомікі, які характарызуецца адсутнасцю вольнага механізму фарміравання попыту і прапановы.

***Рынкавыя адносіны*** – сукупнасць эканамічных адносін паміж суб'ектамі рынка адносна перамяшчэння тавараў і грошай, якія заснаваны на ўзаемнай згодзе, эквівалентнасці і канкурэнцыі.

***Рыначная эканоміка*** – эканамічная сістэма, у якой вытворчасць і распаўсюджанне прадуктаў і паслуг выконваецца праз механізм свабоднага рынку, якім кіруе свабодная цэнавая сістэма.

***Сацыяльна арыентаваная мадэль рыначнай эканомікі*** дапускае плюралізм форм уласнасці, большую ступень удзелу дзяржавы ў забеспячэнні эфектыўнасці эканомікі, рэгуляванні прыбыткаў насельніцтва і яго занятасці, задавальненні шэрага найбольш значных сацыяльных запатрабаванняў (адукацыя, ахова здароўя, культура і г. д.).

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***29 сакавіка 1996 г.*** – Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор аб паглыбленні эканамічнай інтэграцыі чатырох краін («Мытны саюз») Рэспублікі Беларусь, Казахстана, Кыргызстана і Расійскай Федэрацыі.

***2 красавіка 1997 г.*** – Дагавор аб стварэнні *Саюза Беларусі і Расіі.* Яго неад'емнай часткай стаў Статут Саюза Беларусі і Расіі, якім прадугледжваецца забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі, іх бяспекі, абароназдольнасці, узаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Еўропы і свету

***25 снежня 1998 г.*** – у г. Маскве адбылося падпісанне прэзідэнтамі Беларусі і Расіі «*Дэкларацыі аб далейшым яднанні двух народаў*».

***8 снежня 1999 г.*** – падпісанне «*Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі*» і Праграмы дзеянняў па рэалізацыі гэтага Дагавора.

***Сакавік 2005 г.*** – прыняцце дзяржаўнай Праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг.

***1 студзеня 2012 г.*** – уступілі ў сілу 17 пагадненняў, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі – стварэнне *Мытнага Саюза* Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Ра1сійскай Федэрацыі.

***29 мая 2014 г.*** – ў Астане прэзідэнтамі Беларусі, Казахстана і Расіі падпісаны Дагавор аб стварэнні ЕАЭС.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У чым палягае галоўнае адрозненне рынкавай эканомікі ад планавай?

2. Пісьмова зафіксуйце этапы эканамічнай і палітычнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.

3. У чым можна бачыць плюсы і мінусы знаходжання Беларусі ў ЕАЭС?

4. У чым выяўляе сябе спецыфіка беларускай мадэлі сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі?

5. Назавіце асаблівасці развіцця аграпрамысловага комплексу Беларусі на сучасным этапе.

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.
2. *Гусаков, В. Г.* Основные принципы программы совершенствования агропромышленного комплекса Республики Беларусь на 2001–2005 гг. // Белорусский экономический журнал. 2001. № 2. С. 50–62.
3. *Демчук, М. И., Юркевич, А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.
4. *Крывічаніна, К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
5. *Никитенко, П. Г.* Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции. – Мн.: Право и экономика, 2000.
6. Основные направления социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996–2000 годы. – Мн., 1996.
7. Основные положения программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2006–2010 гг. // СБ-Беларусь сегодня, 2006, 24 февраля.
8. *Сакович, В. С.* Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.: тенденции развития. – Мн.: Белорусская наука, 2008.
9. *Шимов, В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. – Мн., 2003.

## Тэма 7. Беларусь на міжнароднай арэне ў 1995–2014 гг.

Працэс міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь. Распрацоўка канцэпцыі знешняй палітыкі дзяржавы. Палітыка нейтралітэту. Пераход паўнамоцтваў па вызначэнні знешнепалітычнага курса краіны ад парламента да прэзідэнта. Супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі краінамі СНД. Дэкларавамая шматвектарнасць знешняй палітыкі Беларусі. Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве Беларусі і Расіі 1995 г. 25 мая 1995 г. – адмена мытнага кантролю на расійска-беларускай мяжы. 2 красавіка 1996 г. падпісанне дагавора аб стварэнні супольнасці суверэнных рэспублік Беларусі і Расіі. 2 красавіка 1997 г. стварэнне Саюза Беларусі і Расіі. Мытны саюз Беларусі, Казахстана і Расіі 2010 г. Еўразійскае эканамічнае супольніцтва (ЕўрАзЭС). Беларусь у міжнародных арганізацыях: АБСЕ. «Усходняе партнёрства». «Партнёрства дзеля міру». ААН. Беларусь і СНД. Дагавор аб калектыўнай бяспецы краін-удзельніц СНД. Беларусь у Руху недалучэння. Супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам. Адносіны з Саветам Еўропы, НАТО. Адносіны краінамі былога СССР і «далёкага замежжа». Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). ЗША і КНР у знешняй палітыцы Беларусі. Беларуская дыяспара.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Грамадзянства*** – прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы.

***Дыяспара*** **–** частка народа (этнасу), якая пражывае па-за краінай свайго паходжання, утварае згуртаваныя і ўстойлівыя этнічныя групы ў краіне пражывання.

***Еўразійскі эканамічны саюз*** *(ЕАЭС)* – міжнароднае інтэграцыйнае эканамічнае аб'яднанне, створанае на базе Мытнага саюза ЕўрАзЭС.

***Знешняя палітыка*** **–** сукупнасць адносін з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі структурамі.

***Нейтральная дзяржава*** – дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах і ваенных саюзах.

***Саюз Беларусі і Расіі*** – міждзяржаўнае аб'яднанне Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі з высокай ступенню палітычнай і эканамічнай інтэграцыі, утворанае 2 красавіка 1997 г.

***Эміграцыя*** – выезд грамадзян са сваёй Бацькаўшчыны ў іншыя краіны на пастаяннае або доўгае пражыванне па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных ці іншых прычынах, а таксама ў выпадку сацыяльных (войны, рэвалюцыі) або прыродных катаклізмаў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1995 г.*** – Мытны саюз Беларусі, Казахстана і Расіі.

***2 красавіка 1996 г.*** – Рэспубліка Беларусь падпісала Дагавор паміж Расіяй і Беларуссю аб утварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Дагавор прадэклараваў грамадзянам абедзвюх краін роўныя правы ў атрыманні адукацыі, ахове здароўя, працаўладкаванні, аплаце працы і інш.

***Снежань 1999 г.*** – падпісанне Беларуссю і Расіяй Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

***2000 г.*** – стварэнне з удзелам Беларусі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (ЕўрАзЭС).

***2002 г.*** – Беларусь разам з Арменіяй, Казахстанам, Кыргызстанам, Расіяй і Таджыкістанам падпісала Статут Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ).

***2007 г.*** – падпісанне Дагавора аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні Мытнага саюзу паміж Беларуссю, Расіяй і Казахстанам.

***2009 г.*** – пачатак удзелу Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства».

***2011 г.*** – падпісанне Беларуссю, Расіяй і Казахстанам Дэкларацыі аб еўразійскай эканамічнай інтэграцыі.

***2014 г.*** – стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) – міжнароднага інтэграцыйнага эканамічнага аб'яднання, на аснове Мытнага саюза ЕўрАзЭС.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Чаму ўлады Беларусі пайшлі па шляху цеснай эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй?
2. Што такое палітыка нейтралітэту?
3. Што абазначае тэрмін «шматвектарная палітыка»?
4. Што абазначае тэрмін «бяз'ядзерная дзяржава»?
5. Дайце характарыстыку цяперашняга знешнепалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь.

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. *Демчук, М. И., Юркевич, А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.
2. *Крывічаніна, К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
3. *Снапковский, В. Е.* История внешней политики Беларуси. – Мн.: БДУ, 2013.
4. *Снапкоўскі, У. Е.* Беларуская дыпламатыя ў XX ст. – асэнсаванне знешнепалітычнага вопыту БНР, БССР і Рэспублікі

Беларусь // Беларускі гістарычны сшытак – Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 16, Беласток, 2001. – С. 141–151.

5. *Снапкоўскі, У. Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. Ад канца канца XVIII да пачатку XXI ст. – Мн.: БДУ, 2004.
6. Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 24–25 лістап. 2011 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2012.
7. *Шимов, В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. – Мн., 2003.

# Тэма 8. Ідэалогія, навука і адукацыя Беларусі ў 1991–2016 гг.

Ідэалогія беларускай дзяржавы – сацыяльна значная і тэарэтычна аформленая сістэма ідэй, у якой адлюстроўваюцца глыбінныя інтарэсы адпаведных сацыяльных груп і слаёў і якая прызначана замацаваць або змяніць грамадскія адносіны. Працэс змянення ідэалогіі беларускай дзяржавы. Дэкамунізацыя. Месца нацыянальнага складніка ў афіцыйнай ідэалогіі беларускай дзяржавы. Ідэалы і каштоўнасці беларускага народа. Ідэалагічная палітыка дзяржаўных інстытутаў Асаблівасці беларускага шляху грамадскага развіцця. Прававая аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы. Эканамічная аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы. Палітычная аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы. Станаўленне нацыянальнай сістэмы адукацыі. Закон аб адукацыі. Дзіцячае дашкольнае выхаванне. Агульнаадукацыйная школа. Прафесійна-тэхнічнае навучанне. Вышэйшая школа. Праграма развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Першы з'езд вучоных Беларусі. Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гг. Балонскі працэс. Рэферэндум 1996 г.: правядзенне і наступствы дзяржаўнай моўнай палітыкі. Мова і ідэалогія. Узаемадзеянне дзяржавы і канфесій. Рынак высокіх тэхналогій. Беларусь – касмічная дзяржава. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Энцыклапедыя Вялікага Княства Літоўскага. Гісторыя беларускага мастацтва.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Балонскі працэс*** – працэс збліжэння і гарманізацыі сістэм адукацыі краін Еўропы з мэтай стварэння адзінай адукацыйнай прасторы вышэйшай адукацыі, які быў аформлены ў 1999 г.

***Ідэалогія беларускай дзяржавы*** – дэклараваная сукупнасць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, адпавядаюць мэтам і асаблівасцям развіцця беларускага грамадства.

***Інавацыя*** – комплексны мэтанакіраваны працэс стварэння, распаўсюджвання і спажывання новаўвядзенняў з ператварэннем іх у прадукцыю і вывядзеннем яе на рынак для камерцыйнага выкарыстання.

***Індустрыяльнае грамадства*** – грамадства, для якога характэрныя падзел працы, спецыялізацыя вытворчасці і яе аўтаматызацыя, арыентацыя вытворчасці на рынак, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, урбанізацыя.

***Інфармацыйнае грамадства*** – грамадства, у якім інфармацыя становіцца галоўным эканамічным рэсурсам, а інфармацыйны сектар выходзіць на першае месца па тэмпах развіцця, па колькасці занятых, па долі капіталаўкладанняў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1991 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» (са змяненнямі дзейнічаў да 2011 г.).

***1992 г.*** – Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў закон «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях» (першая рэдакцыя; змены былі ўнесены 27 чэрвеня 2002 г.).

***1999 г.*** – урад Рэспублікі Беларусь прыняў Праграму развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі до 2010 г.

***2007 г.*** – Першы з’езд вучоных Беларусі.

***2007 г.*** – Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гг.

***2011 г.*** – уступіў у сілу «Кодэкс аб адукацыі».

***2012 г.*** – першы запуск беларускага касмічнага апарата.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што такое ідэалогія беларускай дзяржавы?

2. Якія ўзаемадачыненні паміж дзяржавай і канфесіямі ў сучаснай Беларусі?

3. Якія найбуйнейшыя навуковыя цэнтры Беларусі Вы ведаеце?

4. Паспрабуйце скласці найбольш поўны спіс беларускіх універсітэтаў.

5. Якія, на Вашую думку, плюсы і мінусы Балонскага працэсу?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.
2. *Верашчагіна, А. У., Гурко, А. В.* Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. – Мн.: ІСПД, 1999.
3. Вклад ученых Академии наук Беларуси в ликвидацию последствий аварии на Чернобыльской АЭС. 1986–1996 гг. : документы и материалы / сост.: Н. В. Токарев. – Минск: Беларуская навука, 2016.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
5. *Демчук, М. И., Юркевич, А. Т.* Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.
6. *Крывічаніна, К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
7. *Крывашэй, Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991 – 2010 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
8. *Мельник, В. А.* Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие. – Мн.: Вышэйшая школа, 2011.
9. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие / под общ. ред. Г. А. Василевича, Я. С. Яскевич. – Мн., 2004.
10. *Слука, А. Г.* Национальная идея. – Мн.: РИВШ, 2009.

## Тэма 9. Культура Беларусі ў 1991–2016 гг.

Культура ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту. Закон і Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры». Законы «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», «Аб бібліятэчнай справе», «Аб музеях і музейным фондзе». Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Прэмія «За духоўнае адраджэнне». Спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, навукі і педагагічнай дзейнасці. Закон «Аб мовах у Беларускай ССР» і змены, унесеныя рэферэндумам 1995 г. Нацыянальна-культурнае адраджэнне. Сучасная моўная сітуацыя ў Беларусі. Дні беларускага пісьменства. Акцыя «Культурная сталіца Беларусі». Год беларускай культуры. 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Новы этап у развіцці беларускай літаратуры. Мастацкая літаратура. Выяўленчае мастацтва. Скульптура. Архітэктура. Музычнае мастацтва. Тэатральная творчасць. Беларускае кіно. Выяўленчае мастацтва. Гістарычная тэматыка. Архівы. Музеі. Бібліятэкі. Турызм. Традыцыйная культура. Гісторыка-культурная спадчына. Знешняя культурная палітыка. Ушанаванні гістарычных асоб і дзеячаў культуры. Беларусь і ЮНЕСКО. Канфесійная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь. Дасягненні беларускага спорту.

### АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Гісторыка-культурныя каштоўнасці*** – культурныя каштоўнасці, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

***Культура*** – дзейнасць, накіраваная на задавальненне духоўных патрэбнасцей грамадства, станаўленне і развіццё чала-

века, а таксама створаная для гэтых мэт сукупнасць культурных каштоўнасцей.

***Культурныя каштоўнасці*** – створаныя (пераўтвораныя) чалавекам або цесна звязаныя з яго дзейнасцю матэрыяльныя аб’екты і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, якія маюць гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае значэнне.

***Мастацкая творчасць*** – стварэнне твораў мастацкай літаратуры і мастацтва і (або) іх выкананне.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1991 г.*** – закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь».

***Люты 1994 г.*** – Беларусь упершыню накіравала нацыянальную каманду на XVII зімовую Алімпіяду ў Нарвегіі. Па колькасці медалёў Беларусь заняла 15-е месца сярод 67 краін-удзельніц.

***1995 г.*** – рэферэндум, паводле якога ў Беларусі афіцыйны статус дзяржаўных набылі дзве мовы – беларуская і руская.

***1996 г.*** – на XXVI Алімпійскіх гульнях у Атланце (ЗША) Рэспубліка Беларусь упершыню была прадстаўлена самастойнай нацыянальнай камандай.

***1997 г.*** – прэмія «За духоўнае адраджэнне».

***1998 г.*** – спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, навукі і педагагічнай дзейнасці.

***2009 г .*** – закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

***1 верасня 2010 г.*** – уступіў у дзеянне закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», прыняты 23 ліпеня 2008 г.

***2016 г.*** – афіцыйна абвешчаны год культуры.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Чаму, на Вашу думку, на рэферэндум 1995 г. было вынесена пытанне аб дзвюх дзяржаўных мовах у Беларусі?

2. Якія найвышэйшыя дасягенні беларускіх спартсменаў вы ведаеце?

3. Хто з беларускіх спартсменаў мае званне Герой Беларусі?

4. Якія аб'екты культурна-гістарычнай спадчыны Беларусь аднаўляе разам з ЮНЕСКО?

5. Хто з беларускіх пісьменнікаў стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры?

## ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. *Верашчагіна, А. У., Гурко, А. В.* Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя. – Мн.: ІСПД, 1999.
2. *Верашчагіна, А. У., Гурко, А. В.* Гісторыя канфесій у Беларусі : мінулае і сучаснасць: дапаможнік для настаўнікаў. – Мн.: Тэхналогія, 2000.
3. *Зайцава, Л. М. і інш.* Гісторыя кінамастацтва Беларусі. У 4 т. Т. 4. 1986–2003 гг. – Мн.: Беларуская навука, 2004.
4. *Крывашэй, Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991 – 2010 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
5. Культура беларускага замежжа. Ч. 1, 2. – Мн., 1993. Ч. 3. – Мн., 1998.
6. *Мельник, В. А.* Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособие. – Мн.: Вышэйшая школа, 2011.
7. *Мікуліч, Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць. – Мн., 1996.
8. *Шадурский, В. Г.* Культурные связи Беларуси со странами Центральной Западной Европы (1945–1990-е гг.). – Мн., 2000.

## Тэма 10. Эвалюцыя палітычнай сістэмы Беларусі ў 1994 – 2016 гг. Канстытуцыйнае будаўніцтва.

Пяць канстытуцый Беларусі. Беларусь – парламенцкая рэспубліка ў складзе СССР (да канца 1991 г.). Старшыня Вярхоўнага Савета БССР як найвышэйшая службовая асоба рэспублікі. Сакавік 1990 г.: змены ў Канстытуцыі СССР – адмена манаполіі КПСС на палітычную ўладу і ўвядзенне пасады прэзідэнта. 22 чэрвеня 1990 г.: стварэнне Канстытуцыйная камісіі і пачатак падрыхтоўкі праекта новай Канстытуцыі Беларусі. Спрэчкі аб пасадзе прэзідэнта. Пайменнае галасаванне за праект Канстытуцыі. 15 сакавіка 1994 г. – прыняцце Канстытуцыі Беларусі з пасадай прэзідэнта. Канцэпцыя Канстытуцыі: «моцны» прэзідэнт – «моцны» парламент. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. Змены канстытуцыйнага ладу ў Беларусі з дапамогай рэферэндумаў. Прызначэнне першага рэферэндуму. Галадоўка дэпутатаў Апазіцыі. Рэферэндум 14 мая 1995 г. і яго вынікі. Спроба імпічменту, прадпрынятая Вярхоўным Саветам XIII склікання. Рэферэндум 24 лістапада 1996 г. – змяненне формы кіравання і ўвядзенне прэзідэнцкай формы кіравання замест парламенцкай. Сістэма Усебеларускіх народных сходаў. Рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. з пытаннем аб дазволе Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах без абмежаванняў па колькасці. Прэзідэнцкія выбары 2001, 2006, 2010 і 2015 гг., іх афіцыйна абвешчаныя вынікі. Эвалюцыя грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні ў Беларусі. Беларусь на міжнароднай арэне.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Выканаўчая ўлада*** – адна з галін улады, асноўная задача якой непасрэднае кіраванне краінай на падставе заканадаўства, створанага заканадаўчай уладай

***Дзяржаўны бюджэт*** – грашовыя сродкі і выдаткі дзяржавы.

***Імпічмент*** – працэдура судовага абвінавачвання аж да кіраўніка дзяржавы з наступным зняццем з пасады.

***Канстытуцыя*** – асноўны закон краіны.

***Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь (парламент)*** – прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады ў Беларусі, уведзены ў выніку змены Канстытуцыі Беларусі на рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. Складаецца з дзвюх палат – Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

***Парламенцкая апазіцыя*** – група дэпутатаў, погляды якіх не супадаюць, альбо супярэчаць палітыцы і дзеянням парламенцкай большасці ці выканаўчай улады.

***Плюралізм*** – наяўнасць розных поглядаў, думак, меркаванняў па пытаннях аб шляхах развіцця дзяржавы і грамадства.

***Усебеларускі народны сход*** – агульны сход прадстаўнікоў беларускага ўраду, кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадстаўнікоў іншых галінаў гаспадаркі і непрадукцыйных сфер жыцця. Адбываецца кожныя пяць-шэсць гадоў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***15 сакавіка 1994 г.*** – прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

***10 ліпеня 1994 г.*** – другі тур выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***12 красавіка 1995 г.*** – галадоўка дэпутатаў Апазіцыі ў знак пратэсту супраць рэферэндуму па змене сімволікі.

***14 мая 1995 г.*** – першы, арганізаваны А. Р. Лукашэнкам, рэспубліканскі рэферэндум.

***19–20 кастрычніка 1996 г.*** – першы Усебеларускі народны сход.

***24 лістапада 1996 г.*** – другі рэспубліканскі рэферэндум

***28 лістапада 1996 г.*** – увядзенне ў дзеянне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. з дапаўненнямі, прынятымі ў выніку рэферэндуму 24 лістапада 1996 г.

***18 мая 2001 г.*** – Другі Усебеларускі народны сход.

***9 верасня 2001*** г. – другія выбары Прэзідэнта.

***17 кастрычніка 2004 г.*** – рэферэндум аб дазволе Лукашэнку А. Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах без абмежаванняў па колькасці.

***2 – 3 сакавіка 2006 г.*** – Трэці Усебеларускі народны сход.

***19 сакавіка 2006 г.*** – трэція выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***6–7 снежня 2010 г.*** – Чацвёрты Усебеларускі народны сход.

***19 снежня 2010 г.*** – чацвёртыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***11 кастрычніка 2015 г.*** – пятыя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

***22–23 чэрвеня 2016 г.*** – Пяты Усебеларускі народны сход.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце асноўныя дакументы, якія сведчаць, што Рэспубліка Беларусь валодае дзяржаўным суверэнітэтам, палітычнай і эканамічнай самастойнасцю.

2. Як паўплывалі падзеі путчу жніўня 1991 г. на працэсы канстытуцыйнага будаўніцтва ў Беларусі.

3. Пералічыце ўсе Канстытуцыі, якія мела Беларусь з вызначэннем формы дзяржаўнага ўладкавання і палітычнага кіравання.

4. Чаму А. Р. Лукашэнка прапанаваў змяніць на рэферэндуме некаторыя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.?

5. Што, на вашую думку, азначае тэрмін «народаўладдзе»?

# ЛІТАРАТУРА ДА ТЭМЫ


1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. у 2 кн. Кн. 2. / М. У. Смяховіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская навука, 2012.
2. *Василевич, Г. А.* Белорусское государство на рубеже веков. – Мн., 2007.
3. *Василевич, Г. А.* Референдумы в Беларуси и ее путь к независимости в конце XX столетия. – Мн., 2001.
4. *Голубев, В. Ф., Хадыка, А. Ю.* Профсоюзы Беларуси: трансформация и перспективы / В. Ф. Голубев, А. Ю. Хадыка. – Мн.: Фонд имени Фридриха Эберта, 2003.
5. *Голубеў, В. Ф.* З гісторыі канстытуцыйнага будаўніцтва ў Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 30, Беласток, 2008. – С. 178–206.
6. Конституция Республики Беларусь 1994 года: (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2010.
7. *Крывічаніна, К. А.* Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі ЕС і СНД (1991–2000 гг.). – Мн.: Беларуская навука, 2014.
8. *Курьянович, А. В.* Конституция независимой Беларуси: разработка, проекты, принятие. Мн.: Тесей, 2011.
9. *Никитенко, П. Г.* Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции. – Мн.: Право и экономика, 2000.
10. *Романовский, И. Ф.* Современные политические партии Беларуси: генезис, динамика развития, проблемы. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2. – Мн.: БДУ, 2007. – С. 185–188
11. *Роўда, У.* Палітычная сістэма Рэспублікі Беларусь: вучэбны дапаможнік. Вільня: ЕГУ, 2011.

12. *Снапковский, В. Е.* История внешней политики Беларуси. – Мн.: БДУ, 2013.
13. *Шимов, В. Н.* Экономическое развитие Беларуси на рубеже веков: Проблемы, итоги, перспективы. – Мн., 2003.
14. Эвакуацыя апазіцыі: Апошні год дзейнасці Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання ў друку і ўспамінах дэпутатаў. Выд. 4-е. / Укл. і аг. рэд. Я. Анішчанкі. – Москва: Спутник, 2015.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі у пасляваенны перыяд (1943–1953 гг.).
2. Цяжкасці і поспехі пасляваеннага аднаўленчага перыяду (1943–1953 гг.).
3. Гаспадарчая рэформа 1965 г. у БССР і яе вынікі для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.
4. Уплыў дасягненняў НТР на эканамічнае развіццё краіны.
5. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствы для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны (эканамічная і экалагічная праблемы).
6. БССР на міжнароднай арэне.
7. Буйныя новабудоўлі Беларусі ў пасляваенныя пяцігодкі.
8. Эканамічная рэформа А. Касыгіна (1965 г.)
9. Пётр Машэраў як кіраўнік Савецкай Беларусі.
10. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя: сутнасць і яе наступствы.
11. Супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1970–1980-я гг.
12. Змены палітычнай сістэмы у СССР пад час «перабудовы».
13. Камандна-адміністратыўны і рынкавы тып эканомікі.
14. Палітыка «галоснасці» і Беларусь.
15. Нарастанне экалагічных праблем у БССР, у тым ліку звязаных з Чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофай.

16. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – асноўны закон Рэспублікі Беларусь.
17. Рэферэндумы1995 г. і 1996 г. і пабудова прэзідэнцкай формы кіравання ў Беларусі.
18. Дзяржаўны суверэнітэт : ад БНР і БССР да Рэспублікі Беларусь.
19. Беларусь на міжнароднай арэне.
20. Дасягненні беларускіх спартсменаў.
21. Мова – душа народа.
22. Культура ў Рэспубліцы Беларусь.
23. Рэферэндумы ў палітычнай сістэме Беларусі.
24. Канстытуцыя – асноўны закон краіны.
25. Дасягненні беларускай навукі.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Польшча: краіна і людзі
## (Геаграфія Польшчы)

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Павел Церашковіч,*
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт

# УСТУП

Геаграфія – складаная, шматгранная дысцыпліна, якая аб'ядноўвае ў адзінае цэлае разнастайныя веды, спалучае прыродазнаўства, асновы дэмаграфіі, эканомікі, этналогіі, культуралогіі і рэгіёназнаўства. Геаграфія стварае цэласную карціну ўзаемадзеяння чалавека і прыроды ў гістарычнай перспектыве, дазваляе аналізаваць сучаснасць і будаваць планы на будучыню. Кожны народ жыве ў сваёй геаграфічнай прасторы на працягу доўгага часу, прыстасоўваецца да асяроддзя і прыстасоўвае яго для сваіх патрэб, пераўтвараючы ў культурны ландшафт. У геаграфіі асобнай краіны і народа, як у летапісе, зафіксаваны досвед узаемадзеяння з прыродай, удалыя, і не вельмі, прыклады, якія могуць быць засвоены іншымі.

Польшча – адна з найбуйнейшых суседніх краін Беларусі. Разам з тым спецыяльнай літаратуры па яе геаграфіі ў Беларусі няма. У вучэбных дапаможніках ёсць асобныя раздзелы, прысвечаныя Польшчы, але яны даюць толькі самую агульную характарыстыку краіны. Безумоўна, даступна вялікая колькасць выданняў на польскай мове. Аднак яны прызначаны дзеля ўнутранага карыстання. Некаторыя моманты, зразумелыя паляку і без падручніка, у іх адсутнічаюць. А замежніку, без іх ведання, цяжка не толькі стварыць цэласную карціну геаграфічнай прасторы Польшчы, але і адэкватна зразумець дэталі.

Польшча для Беларусі – не толькі ўплывовы сусед: гэта сусед, які дасягнуў значных поспехаў у сацыяльных трансфармацыях пасля распаду мінулага сацыялістычнага ладу. Пры гэтым, шмат па якіх прыродных ды іншых геаграфічных параметрах Польшча вельмі падобная да Беларусі. Таму вывучэнне яе геаграфіі мае глыбокі практычны сэнс, яно дазволіць выка-

рыстаць досвед Польшчы для пабудовы уласнай стратэгіі сацыяльных трансфармацый ў будучыні.

## МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Вучэбны курс «Геаграфія Польшчы» падрыхтаваны для пашырэння геаграфічных ведаў навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэя. Мэта курса – сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб геаграфіі Польшчы, асноўных параметрах прыродных ўмоў суседняй краіны, дэмаграфічным і эканамічным развіцці, рэгіянальным падзеле.

Для паспяховага засваення курса навучэнцы павінны валодаць катэгарыяльным апаратам, засвоеным у працэсе вывучэння агульнай геаграфіі краін і мацерыкоў.

У выніку вывучэння курса «Геаграфія Польшчы» навучэнцы павінны авалодаць наступнымі ведамі, уменнямі і навыкамі:

1. На падставе картаў featured рознага тыпу ўмець характарызаваць палажэнне Польшчы на свеце і ў Еўропе, апісваць адміністрацыйны падзел гэтай краіны, падаваць назвы і паказваць на карце ваяводствы і іх цэнтры.

2. Ведаць прынцыпы тэрытарыяльна-адміністрацыйнага ладу Польшчы, функцыі цэнтральных і мясцовых органаў улады, арыентавацца ў размяшчэнні буйных адміністрацыйных адзінак і гарадоў.

3. Ведаць асноўныя этапы геалагічнай гісторыі Польшчы, тлумачыць узаемасувязь геалагічнай будовы, рэльефу і размяшчэння радовішчаў карысных выкапняў.

4. Паказваць на карце асноўныя тэктанічныя структуры Польшчы; характарызаваць асаблівасці крышталічнага фундамента і платформавага чахла, тлумачыць залежнасць фармавання платформавага чахла ад тэктанічнай будовы, вызначаць забяспечанасць тэрыторыі рознымі відамі прыродных рэсурсаў.

5. Ведаць асаблівасці клімату Польшчы, характарызаваць

размеркаванне кліматычных паказчыкаў і асаблівасці сезонаў года, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж фактарамі ўтварэння кліматычных умоў.

6. Даваць характарыстыку водных рэсурсаў Польшчы, асаблівасці размеркавання і выкарыстання паверхневых і падземных водаў, аналізаваць узаемасувязь характару рачной сеткі і рэльефу, рэжыму ападкаў.

7. Ведаць найважнейшыя параметры глебавага покрыва Польшчы, характарызаваць структуру зямельных рэсурсаў і яе ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі, сучасны склад флоры і фаўны і гаспадарчае значэнне найважнейшых тыпаў расліннасці.

8. Характарызаваць асаблівасці размяшчэння насельніцтва Польшчы, яго натуральнага і механічнага руху. Ацэньваць найважнейшыя праблемы развіцця гарадоў і меншых населеных пунктаў.

9. Разумець і ўмець тлумачыць асноўныя тэндэнцыі дэмаграфічнага развіцця Польшчы, узаемасувязь іх з эканамічнай сітуацыяй ў краіне.

10. Ведаць і характарызаваць становішча беларусаў і беларускай культуры ў Польшчы.

11. Арыентавацца ў тэндэнцыях сучаснага эканамічнага развіцця Польшчы, характарызаваць асноўныя праблемы развіцця і пераўтварэння эканомікі. На падставе розных крыніц інфармацыі апісваць структуру выкарыстання ўзнаўляльных і неўзнаўляльных крыніц энергіі ў краіне і ў яе асобных рэгіёнах. Ведаць і паказваць на карце галоўныя цэнтры прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Фармуляваць найважнейшыя праблемы аховы навакольнага асяроддзя. Ацэньваць асноўныя праблемы функцыянавання рынку працы ў Польшчы і яе найважнейшых рэгіёнах.

12. Характарызаваць развіццё невытворчай сферы Польшчы. Называць і паказваць на карце гарады, у якіх знаходзяц-

ца найважнейшыя ВНУ, установы культуры, турыстычныя аб'екты.

13. Паказваць на карце асноўныя геаграфічныя рэгіёны Польшчы, ведаць іх асаблівасці. Вызначаць галоўныя характарыстыкі рэгіёна Балтыйскага мора і яго гаспадарчае значэнне. Характарызаваць патэнцыял асобных рэгіёнаў Польшчы для развіцця турызму і супрацоўніцтва з Беларуссю.

14. Умець праводзіць параўнальны аналіз асноўных геаграфічных параметраў Польшчы з іншымі краінамі, і, у тым ліку, з Беларуссю.

Структура курса заснавана на тыповых падыходах да цэласнага вывучэння асобных краін у межах самастойнага курса. Яна складаецца з блокаў фізічнай геаграфіі, дэмаграфіі, эканамічнай геаграфіі і рэгіёназнаўства. У якасці арыенціра былі выкарыстаны тыповыя праграмы і навучальныя дапаможнікі для вучняў польскіх гімназій і ліцэяў. Разам з тым, матэрыялы былі адаптаваны да тэрміналагічнай і дыдактычнай традыцыі выкладання геаграфіі ў Беларусі.

На працягу курса вучням будуць прапанаваны наступныя віды самастойных работ: напісанне эсэ, выступленне з прэзентацыяй, выкананне тэстаў, удзел у дыскусіях.

Паказчыкамі засваення матэрыялаў курса будзе дэманстрацыя валодання катэгарыяльным апаратам, здольнасць да арыентацыі ў прасторы (на карце), здольнасць праводзіць параўнальны аналіз і рабіць абгрунтаваныя высновы.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

## 1. Уводзіны

### 1.1. Геаграфічнае становішча, велічыня тэрыторыі, межы і суседзі

Памеры тэрыторыі. Крайнія кропкі. Канфігурацыя тэрыторыі. Межы. Натуральныя і штучныя межы. Асаблівасці мяжы на моры. Суседзі Польшчы. Асаблівасці геаграфічнага становішча Польшчы. Польшча ў геаграфічным вымярэнні Еўропы і свету.

### 1.2. Дзяржаўны лад і адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

Дзяржаўныя сімвалы Польшчы: герб, сцяг, гімн. Сістэма дзяржаўнага кіравання. Функцыі прэзідэнцкай ўлады, Сейма і Сената, Канстытуцыйнага Трыбунала, Вярхоўнага Суда, Рады міністраў і яго старшыні. Адміністратыўны падзел: ваяводства, паветы і гміны. Функцыі мясцовага самакіравання.

## 2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы

### 2.1. Старажытная геалагічная гісторыя Польшчы

Паверхня Польшчы ў дакембрыйскую эпоху. Геалагічныя працэсы ў палеазоі. Трансгрэсія і гораўтварэнне ў мезазоі. Геалагічныя змены ў кайназойскую эпоху.

### 2.2. Эпоха зледзянення і геалагічная гісторыя Польшчы

Тры зледзяненні на прасторы Польшчы: паўднёвае, сярэдняе і паўночнае. Ледавіковыя формы рэльефу. Озы, зандры, камы, канцавыя марэны. Асаблівасці ўздзеяння зледзянення на горную мясцовасць. Цыркавыя азёры. Тыпы рэльефу горных далін.

**2.3. Горныя пароды і карысныя выкапні**

Горныя пароды у Польшчы: магматычныя, асадкавыя, метамарфічныя. Гаручыя карысныя выкапні. Каменны і буры вугаль, нафта і газ. Металічныя карысныя выкапні. Радовішча руд жалеза, медзі, нікелю і цынка. Хімічныя карысныя выкапні. Радовішча серы, каменнай і калійнай солі. Радовішча сыравіны будаўнічых матэрыялаў: граніт, мармур, базальт, крэйда, пясок, гіпс.

**2.4. Рэльеф**

Агульныя рысы рэльефу. Раўніны, нізіны, узвышша, горы. Занальны падзел прасторы. Зона ўзбярэжжа. Паазер’е. Раўніны цэнтральнай Польшчы. Зона паўднёва-усходніх узвышшаў. Прыкарпацкія катлавіны. Зона гор: Карпаты і Судэты.

**2.5. Клімат**

Агульная характарыстыка клімату. Феналагічныя пары году. Атмасферная цыркуляцыя. Тыпы паветраных мас: атлантычнае паветра умераных шырот, умераныя кантынентальныя паветраныя масы, трапічныя паветраныя масы, арктычныя паветраныя масы. Цеплавы рэжым. Ізатэрмы студзеня і ліпеня. Гадавая амплітуда тэмператур. Ападкі. Узровень вільготнасці, гадавы ход ападкаў, рэгіянальныя адрозненні рэжыму ападкаў. Ружа вятроў. Заходні перанос. Лакальныя вятры на ўзбярэжжы і горнай мясцовасці.

**2.6. Паверхневыя і падземныя воды**

Агульная характарыстыка вод Польшчы. Рачная сетка. Найбуйнейшыя рэкі: Вісла і Одра. Жыўленне рэк. Снегавое, дажджавое і грунтавое жыўленне. Басейны сцёку польскіх рэк. Азёры. Тыпы азёр. Паазер’е. Падземныя воды. Мінеральныя і тэрмальныя воды. Праблемы забеспячэння вадой.

**2.7. Глебавае пакрыва**

Класіфікацыя ўрадлівасці глебаў у Польшчы. Тыповыя глебы. Падзолістыя глебы. Буразёмы. Жоўта-карычневыя гле-

бы. Чарназёмы. Нетыповыя глебы. Тарфяна-балотныя глебы. Алювіяльныя глебы. Дзярнова-карбанатныя глебы. Праблемы захавання глебавага покрыва.

**2.8. Раслінны і жывёльны свет**

Асаблівасці расліннага свету Польшчы. Эндэмікі і рэліктавыя расліны. Лясы. Хваёвыя лясы. Шыракалістыя дубова-грабавыя лясы. Поймавыя лясы. Драбналістыя альховыя лясы. Экалагічныя праблемы захавання лясоў. Лугі.

Асаблівасці жывёльнага свету. Жывёльны свет лясоў. Фаўна палёў і лугоў. Жывёльны свет вадаёмаў і ўзбярэжжаў.

## 3. Насельніцтва

**3.1. Дынаміка насельніцтва**

Агульная характарыстыка дэмаграфічнай сітуацыі ў Польшчы. Натуральны рух насельніцтва. Натуральны прырост. Каэфіцыенты нараджальнасці і смяротнасці. Дэмаграфічная гісторыя Польшчы. Дэмаграфічны бум 1950- х гг. Дэмаграфічны крызіс 1990 – 2000 -х гг.

**3.2. Полаўзроставая структура насельніцтва**

Полаўзроставая піраміда. Суадносіны жаночай і мужчынскай частак насельніцтва ў розных узроставых кагортах. Сярэдняя працягласць жыцця. Старэнне насельніцтва. Працаздольнае насельніцтва. Змены ў колькасці працаздольнага насельніцтва.

**3.3. Рассяленне насельніцтва і міграцыі**

Шчыльнасць насельніцтва. Рэгіянальныя асаблівасці шчыльнасці насельніцтва ў Польшчы. Польшчы ў еўрапейскім вымярэнні шчыльнасці насельніцтва.

Урбанізацыя. Тыпы гарадскіх паселішчаў. Агламерацыі. Тэндэнцыі развіцця гарадоў у Польшчы.

Тыпы міграцыі. Кірункі ўнутранай міграцыі. Знешняя міграцыя. Эміграцыя і іміграцыя.

### 3.4. Структура працаўладкавання і беспрацоўе

Змены ў структуры працаўладкавання ў другой палове 20 – пачатку 21 ст. Асаблівасці структуры працаўладкавання Польшчы ў еўрапейскім кантэксце. Рэгіянальныя асаблівасці структуры працаўладкавання. Беспрацоўе.

### 3.5. Склад насельніцтва. Этнаграфічныя групы палякаў. Нацыянальныя меншасці.

Этнічны склад і канфесійны склад насельніцтва Польшчы. Палякі. Этнаграфічныя групы палякаў. Шлянзакі (сілезцы), кашубы, гуралі, курпы, вармякі, мазуры.

Нацыянальныя і этнічныя меншасці. Немцы, чэхі, украінцы, славакі, габрэі, літоўцы, армяне, цыганы, лемкі, бойкі, татары, караімы.

Беларусы ў Польшчы.

## 4. Гаспадарка

### 4.1. Здабыча мінеральных рэсурсаў і паліўна-энергетычны комплекс

Здабыча металічных руд. Месца Польшчы ў сусветнай здабычы медзі, срэбра, цынку і волава.

Здабыча мінеральных рэсурсаў для хімічнай прамысловасці: эксплуатацыя радовішчаў серы і каменнай солі. Здабыча выкапняў для будаўнічай прамысловасці.

Вуглездабыча. Цэнтры здабычы каменнага і бурага вугалю. Выкарыстанне вугалю ў энергетычнай прамысловасці. Асноўныя цэнтры вытворчасці электраэнергіі.

Развіццё альтэрнатыўнай энергетыкі. Гідраэлектрастанцыі, ветравыя і геатэрмальныя магутнасці. Перспектывы развіцця энергетычнай прамысловасці.

### 4.2. Прамысловасць

Структура прамысловасці Польшчы.

Металургічная прамысловасць. Змены ў развіцці чорнай металургіі. Каляровая металургія.

Машынабудаванне. Транспартнае машынабудаванне. Аўтамабільная прамысловасць. Электратэхнічная прамысловасць. Вытворчасць электронікі. Развіццё сферы высокіх тэхналогій.

Хімічная прамысловасць. Дрэваапрацоўка. Лёгкая прамысловасць. Харчовая прамысловасць.

**4.3. Сфера паслуг**

Агульная характарыстыка развіцця сферы паслуг ў Польшчы. Развіццё эканомікі ведаў: вышэйшая адукацыя і навуковыя цэнтры.

Фінансавы рынак. Развіццё сістэмы страхавання. Гандаль.

Ахова здароўя і сістэма сацыяльнага забеспячэння.

Турызм. Галоўныя турыстычныя дэстынацыі. Аб'екты сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Польшчы.

Сфера паслуг у Польшчы ў еўрапейскім вымярэнні.

**4.4. Сельская гаспадарка**

Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Прыродныя і пазапрыродныя фактары развіцця сельская гаспадаркі.

Раслінаводства. Вырошчванне збожжавых, бульбы, цукровых буракоў, садавіны і гародніны.

Жывёлагадоўля. Мяса-малочная жывёлагадоўля. Свінагадоўля. Гадоўля авечак і коней. Птушкагадоўля.

Сельская гаспадарка Польшчы ў еўрапейскім кантэксце.

**4.5. Транспарт і камунікацыі**

Структура транспартнай сеткі Польшчы. Аўтамабільны транспарт. Будаўніцтва шашэйных дарог. Чыгунка. Рачны і марскі транспарт. Буйнейшыя парты Польшчы. Авіяцыйны транспарт. Трубаправодны транспарт. Развіццё камунікацыйнай інфраструктуры.

**4.5. Экалагічныя праблемы і ахова асяроддзя**

Агульная характарыстыка становішча прыроднага асяроддзя. Забруджванне паветра. Кіслотныя дажджы і іх наступствы. Забруджванне вод. Праблема дэфіцыту водных рэсурсаў.

Глебавая эрозія. Канцэпцыя ўстойлівага развіцця і падыход да яе ў Польшчы.

Формы аховы асяроддзя. Сістэма нацыянальных паркаў. Ландшафтныя паркі. Прыродныя заказнікі. Помнікі прыроды. Ахова асобных відаў раслін і жывёл.

**5. Рэгіянальны падзел**

**5.1. Узбярэжжа і Балтыйскае мора**

Унутраны рэгіянальны падзел: Шчэцінскае, Кашалінскае і Гданьскае ўзбярэжжы. Геалагічная будова і рэльеф. Асаблівасці клімату. Флора і фаўна. Паселішчы. Развіццё турызму.

Агульная характарыстыка Балтыйскага мора. Геалагічная гісторыя. Раслінны і жывёльны свет. Экалагічныя праблемы і ахова асяроддзя ў Балтыйскім моры.

**5.2. Паазер'е**

Паморскае і Мазурскае Паазер'і. Асаблівасці геалагічнай будовы. Ледавіковыя формы рэльефу. Буйнейшыя азёры. Сістэма каналаў. Кліматычныя адрозненні. Флора і фаўна. Нацыянальныя паркі ў Паазер'і. Асаблівасці засялення Паазер'я. Гарадскія паселішча. Развіццё турызму.

**5.3. Нізіны**

Мазавецкая, Вялікапольская і Сілезская нізіны. Геалагічныя асаблівасці нізін. Глебавае покрыва. Рачная сетка. Умовы для развіцця сельскай гаспадаркі. Кліматычныя асаблівасці і працягласць вегетацыйнага перыяду. Раслінны і жывёльны свет. Эканамічнае развіццё. Гарадскія агламерацыі. Турыстычныя рэсурсы.

**5.4. Узвышша**

Структура польскіх узвышшаў. Свентакшыскія горы, Люблінскае ўзвышша, Расточча, Кракаўска-Чанстахоўскае і Шлёнскае (Сілезскае) узвышшы. Геалагічная гісторыя ўзвышшаў. Карысныя выкапні. Асаблівасці глебавага покрыва. Клімат узвышшаў. Флора і фаўна.

Эканамічнае развіццё. Старыя прамысловыя раёны. Верхнесілезскі прамысловы раён. Асаблівасці ўрбанізацыі. Экалагічныя праблемы.

Развіццё турызму і турыстычныя рэсурсы.

**5.5. Горы**

Геалагічная гісторыя Судэтаў і Карпат. Асаблівасці геалагічнай будовы польскіх гор. Вышэйшыя кропкі Судэтаў і Карпат. Рачная сетка і азёры. Жывёльны і раслінны свет. Вышынная пояснасць. Нацыянальныя паркі. Развіццё турыстычнай індустрыі.

## ВЫКАРЫСТАНАЯ І РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. *Геаграфія ў тэрмінах і паняццях*: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: М. М. Курловіч і інш. – Мн.: Беларус. Энцыкл., 2003. (Энцыкл. бібліятэчка школьніка).

2. Польска-беларускі тэматычны слоўнік для школьнікаў і студэнтаў = Polsko-białoruski słownik tematyczny dla uczniów i studentów: больш за 17,5 тысяч слоўнікавых артыкулаў. / Укладальнік Л. Баршчэўскі. – Мн.: Зміцер Колас, 2012.

3. Bański, J. Geografia rolnictwa Polski. – Warszawa: PWE, 2007.

4. Baraniecki, L., Skrzypczak, W. Geografia fizyczna (ogólna i Polski). Podręcznik dla liceów ogólnokształcących, liceów profilowanych i techników. Zakres podstawowy i rozszerzony. – Warszawa: Efekt, 2003.

5. Chrabelski, M., Dudaczyk, M. Geografia dla gimnazjum. – Gdynia: Operon, 2010.

6. Figa, M. Repetytorium gimnazjalisty. Geografia. – Krakow: GREG, 2016.

7. Jackowski, A., Liszewski, S., Richling, A. (red. nauk.). Historia geografii polskiej. –Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2008.

8. Knaflewska, J. Księga przyrodniczo-krajoznawcza Polski.

Przyroda, geografia. Ilustrowana encyklopedia tematyczna. – Poznań: Publicat, 2008.

9. Kondracki, J. Geografia regionalna Polski. – Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2000.

10. Kucharska, M. J. Zdasz maturę z geografii. Geografia Polski. – Łódź: Piątek Trzynastego, 2004.

11. Lijewski, T., Mikułowski, B., Wyrzykowski, J. Geografia turystyki Polski. – Warszawa: PWE, 2008.

12. Makos-Makarska, E. Geografia Polski. Zbiór zadań maturalnych. Dla liceum ogólnokształcącego, liceum profilowanego i technikum. – Toruń: SOP Oświatowiec, 2008.

13. Mordawski, J., Wiecki, W. Geografia 3. Geografia Polski. Przewodnik dla nauczyciela liceum ogólnokształcącego, liceum profilowanego i technikum. Zakres podstawowy. – Gdynia: Operon, 2003.

14. Richling, A., Ostaszewska K. (red. nauk.). Geografia fizyczna Polski. Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2005.

15. Rogacki, H. (red. nauk.). Geografia społeczno-gospodarcza Polski. – Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2007.

16. Szlajfer, F. Geografia Polski. Podręcznik dla gimnazjum. – Warszawa: Nowa Era, 2004.

17. Świtalski, E., Preisner, Z. Geografia Polski dla liceów ogólnokształcących, liceów profilowanych i techników. – Toruń: Oficyna Wydaw. Turpress, 2004.

18. Zając, S. Geografia Polski. Podręcznik dla gimnazjum. – Warszawa: Wydaw. Szk. i Pedag., 2000.

# ЗМЕСТ

Аўтарская праграма вывучэння курса
«Сусветная гісторыя (Гісторыя Еўропы. Эпоха Сярэднявечча, V–XV стст.)» ........ 3
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Гісторыя Беларусі 1945–2016 гг.
(ад заканчэння Другой сусветнай вайны да перыяду будаўніцтва незалежнай дзяржавы» ........ 83
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Польшча: краіна і людзі (Геаграфія Польшчы)» ........ 133

**Сусветная** гісторыя; Гісторыя Беларусі; Геаграфія : эксперы-
С90 ментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя / Складальнікі Алег Трусаў, Валянцін Голубеў, Павел Церашковіч. — Мінск : Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Таварыства беларускай школы», 2016. — 148 с.

Зборнік аб’ядноўвае эксперыментальныя навучальныя праграмы курсаў па сусветнай гісторыі, гісторыі Беларусі і геаграфіі Польшчы для гуманітарнага ліцэя, складзеныя іх аўтарамі і выкладчыкамі.

Рэкамендуецца педагогам сярэдніх навучальных устаноў гуманітарнага профілю.

**ББК 74.26**
**УДК 37.01**

Даведачнае выданне

# Сусветная гісторыя
# Гісторыя Беларусі
# Геаграфія

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя*

Для ўнутранага карыстання
ў грамадскай арганізацыі

Падпісана да друку 25.06.2016. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 4,39. Ум. друк. арк. 8,60.
Наклад 99 асобнікаў.

Надрукавана на офісным абсталяванні
Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
«Таварыства беларускай школы»